Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 ЛІСТАПАДА 2007 г.
СУБОТА
№ 214 (26079)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «Прамыя лініі»!

РАЗАМ «РАЗРУЛІМ»
ПРАБЛЕМЫ НА СТАЛІЧНЫХ ВУЛІЦАХ

Для айчынных аўтааматараў ужо пачаўся зімовы перыяд. Дні сталі карацейшымі, ночы цямнейшымі, дарогі слізкімі і непрадказальнымі. Пешаходам зіма таксама падрыхтавала шмат дадатковых праблем. Так што ўдзельнікам дарожнага руху трэба праявіць асаблівую асцярожнасць і абачлівасць. А сталічным кіроўцам транспартных сродкаў і пешаходам небходна быць яшчэ больш пільнымі. Бо мінскі аўтапарк самы вялікі ў краіне, а інтэнсіўнасць руху па магістралях галоўнага горада краіны значна большая, чым у правінцыі. Зрэшты, бяспеку на сталічных вуліцах нельга забяспечыць не вырашыўшы іншых, тыповых для мегаполіса праблем: недахоп парковачных месцаў, стаянак і гаражоў, заторы на дарогах, нізкі ўзровень культуры кіроўцаў і г.д. «Разруліць» ці хоць бы абазначыць некаторыя з памянёных праблем чытачы «Звязды» змогуць **13 лістапада.** У гэты дзень, **з 15 да 16 гадзін,** адбудзецца «Прамая лінія» з начальнікам управлення Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама **Васілём Васільевічам БУЛЬБЯНКОВЫМ.** Кантактныя тэлефоны ў Мінску: **292 38 92, 292 38 21.** Папярэдне пытанні можна задаваць па тэлефоне **287 18 72.**

ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, а таксама некаторых аспектаў народнай медыцыны, адкажуць падчас «Прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

Як лепш справіць вяселле? Якія правілы існуюць у дачыненні да правядзення хрэсьбін? Як не парушыць рэгламентацыю пахавання і памінання? Як правільна арганізаваць улазіны? Як адзначыць свята ў адпаведнасці з народным календаром? На гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце атрымаць адказы, калі патэлефануеце на нашу «Прамую лінію» **21 лістапада з 12.00 да 14.00 па нумарах: 292 38 92, 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03.)**

Прэзідэнт павіншаваў

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Тадэвуша Кандрусевіча з назначэннем на пасаду архіепіскапа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага.

«Прыемна, што духоўным кіраўніком беларускіх католікаў назначаны менавіта Вы — наш суайчыннік, чалавек, які карыстаецца заслужанай павагай і аўтарытэтам сярод прадстаўнікоў розных веравызнанняў, — гаворыцца ў віншаванні. — Спадзяюся, што на гэтай высокай пасадзе Вы зробіце ўсё магчымае для таго, каб Рымска-каталіцкая царква і далей актыўна садзейнічала ўмацаванню стабільнасці, ладу і згоды ў нашым агульным беларускім доме».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Праект знікнення дазвольнай адзнакі

Зусім верагодна, што з 1 студзеня 2008 года беларусам для выезду ў далёкае замежжа не будзе патрэбен дазвольны штамп.

Паводле звестак Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС, Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект прэзідэнцкага ўказа аб адмене памянёнай адзнакі ў пашпартах грамадзян Беларусі. Прозвішчы асобаў, якім часова забаронена пакідаць тэрыторыю нашай краіны, будуць змешчаны ў камп'ютарны банк звестак. Такіх грамадзян, калі яны ўсё ж рызыкнуць выехаць за мяжу, памежнікі будуць спыняць і вяртаць дамоў. Варта нагадаць, што дазвольны штамп пражыў два «замахі на сваё жыццё». Яшчэ ў верасні 2002 года Канстытуцыйны Суд Беларусі прызнаў неадпаведнай Асноўнаму Закону краіны практыку прастаўлення ў агульнаграмадзянскія пашпарты выязной адзнакі. Ужо з 1 студзеня 2005 года мы павінны былі свабодна, без дазвольнага штампа выязджаць ва ўсе краіны свету. Аднак восенню 2005 года Канстытуцыйны Суд па просьбе Савета Міністраў падоўжыў на нявызначаны тэрмін жыццё выязной адзнакі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА

Паляўнічая гаспадарка ў вёсцы Літусава Сенненскага раёна.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

СЁЛЕТНЯЯ ЗІМА БУДЗЕ ХАЛАДНЕЙШАЯ ЗА МІНУЛАГОДНЮЮ

Сёлетняя зіма ў Беларусі, паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, будзе крыху цяплейшая за стандартную, але халаднейшая за мінулагоднюю. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

Сярэдняя тэмпература гэтай зімой будзе знаходзіцца ў межах 2—8 градусаў марозу. Пры гэтым снежань прагназуецца па тэмпературы блізкім да кліматычных нормаў, студзень — на 1 градус халаднейшы, а люты будзе на ўзроўні сярэдніх шматгадовых значэнняў. У самыя халодныя ночы тэмпература паветра дасягне 22—30 градусаў ніжэй за нуль. Маразы будуць чаргавацца з адлігай. Гэтая зіма абяцае быць снежнай, колькасць ападкаў чакаецца на ўзроўні сярэдніх шматгадовых значэнняў — 115 см.

У НЯДЗЕЛЮ І ПАНЯДЗЕЛАК — МОЦНЫЯ СНЕГАПАДЫ

У суботу да нас завітае актыўны атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы, які прыняце мокры снег і дождж, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

Удзень 10 лістапада ападкі па Гомельскай вобласці даволі моцныя. У асобных раёнах туман, на дарогах галалёдзіца. Ад мінус 2 да 4 цяпла. У нядзелю і панядзелак з боку Украіны праз усходнюю частку Беларусі пачне рухацца магутны цыклон, які яшчэ больш пагоршыць надвор'е. Снег і мокры снег, часам вельмі моцны, будзе ў нядзелю на ўсходзе краіны, а ў панядзелак паўсюдна. Моцныя снегапады могуць выклікаць наліпанне снегу на электраправадах і дрэвах, аж да аварыйных сітуацый. У асобных раёнах краіны чакаюцца завірухі, а на дарогах — снежныя заносы. Тэмпература ўначы 11—12 лістапада — ад 4 марозу да 1 градуса цяпла, удзень — мінус 3—плюс 3. Амаль увесь наступны тыдзень у краіне часам будзе ісці снег, месці завіруха. Тэмпература ўначы — 1—6 градусаў марозу, пры праясненні — да мінус 10 градусаў; удзень — ад мінус 4 да плюс 1 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ВУЧОНЫЯ ДАПАМОГУЦЬ ДАЧНІКАМ

Вучоныя дапамогуць дачнікам захаваць ураджай. У Інстытуце заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук пачалі распрацоўку прыбора, які будзе адпужваць птушак, што наносяць шкоду саду і агароду.

Гэта шпак, дрозд-рабіннік, сойка і сарока, якія паядаюць насенне на градках і спелыя плады. Прыбор будзе імітаваць галасы драпежных птушак, натуральных ворагаў «агародных шкоднікаў». Устанавіць яго можна будзе на садовым доміку або на дрэве. Спецыяльная праграма аўтаматычна будзе ўключаць апарат у патрэбны час.

Дзяніс БАРАУЛЯ, «Мінск-Навіны».

БЫЛА БУТЭЛЬКА — СТАЛА ВАЗА

Незвычайны пункт прыёму шклатары адкрыўся ў сталіцы. Тут прымаюць бутэлькі нестандартнай формы і розных аб'ёмаў: са скрыўленым і выцягнутым рыльцам, плоскія і квадратныя, празрыстыя, сінія, чырвоныя...

Напрыклад, за адну фігурную бутэльку з-пад французскага віна тут даюць 500 рублёў. Прынятая шклатара пачынае другое жыццё. Да слова, бутэлькі са скрыўленым рыльцам ператвараюцца ў арыгінальныя вазы з падсветкай або ва ўпрыгажэнне для інтэр'ера.

Пункт прыёму шклатары мае свой электронны адрас: steklotara@tut.by.

Надзея ЛІСАВА, «Мінск-Навіны».

УЗЯЎ МАШЫНУ — РАЗБІЎ ЯШЧЭ ТРЫ

Узяў машыну пакатацца, трапіў у ДТЗ і разбіў тры аўтамабілі.

Выпадак адбыўся на перакрыжаванні праспекта Незалежнасці і вуліцы Каліноўскага. 31-гадовы мужчына, кіруючы аўтамабілем «Фальксваген-Гольф» у нецвярозым стане і без вадзіцельскіх правоў, урэзаўся ў легкавушку, якая спынілася на чырвоны сігнал святлафора. А далей яна сутыкнулася з трэцяй, тая ў сваю чаргу — з чацвёртай машынай. Віноўнік ДТЗ атрымаў пералом носа. Як высветлілася, ён ехаў на аўтамабілі брата, без дазволу ўзяўшы з кішэні свояка ключы ад аўтамабіля.

Алена ПАЛЕВІКОВА, «Мінск-Навіны».

Твае правы

БАНК І ПОШТА — БЕЗ «ЛІШНІХ» ВЫДАТКАЎ

Статыстыка сведчыць, што літаральна кожны год у Беларусі прызначаюцца сотні тысяч пенсій. Між тым некаторыя нюансы іх выплат — тэма для асобнай размовы. У прыватнасці, калі можа спыніцца прадастаўленне пенсіі, ці працягнецца яе атрыманне ў выпадку шматмесячнага лячэння ў бальніцы або перасялення ў дом-інтэрнат, як правільна афарміць пенсійную даверанасць, ці бяруць грошы за дастаўку пенсій, нарэшце, што можа чакаць пенсіянераў, якія вырашылі пераехаць на сталае месца жыхарства з Беларусі за мяжу? З усім гэтым і іншым мы паспрабуем разабрацца з дапамогай начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

ПЯЦЬ ДЗЁН ДЛЯ НОВЫХ ЗВЕСТАК

Як вядома, выплата пенсій робіцца па месцы фактычнага пражывання. І пры гэтым у пераважнай большасці выпадкаў незалежна ад таго, працягвае чалавек працаваць або не, а таксама без уліку памеру «дадатковага» заробку.

Праўда, сам па сабе факт адначасовага атрымання зарплаты ўсё ж адыгрывае пэўную ролю. Заканадаўства вызначае, што пры разліку памеру пенсіі ў непрацуючых пенсіянераў можа прымацца пад увагу індывідуальны каэфіцыент заробку да 4,0. Тады як у пенсіянераў працуючых толькі каэфіцыент да 1,3. І выключэнне з гэтага правіла ёсць усяго адно — работнікі, якія займаюцца непасрэдна вытворчасцю сельгаспрадукцыі ў сельгаспрадпрыемствах.

— Калі пенсіянер з каэфіцыентам заробку больш за 1,3 вырашае ўладкавацца на тую ці іншую вакансію, то яго наймальнік абавязаны на працягу пяці дзён паведаміць аб гэтым у раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, — адзначае Валянціна Каралёва. — І адначасова такое ж паведамленне аб сваім уладкаванні павінен зрабіць сам пенсіянер. Бо ў адваротным выпадку давядзецца сутыкнуцца з сітуацыяй, калі працягне «працаваць» большы каэфіцыент і, насуперак закону, пенсія будзе пераплачвацца. А пераплату рана ці позна давядзецца вяртаць.

Таксама нялішне нагадаць: існуюць варыянты, калі выплата пенсіі спыняецца ўвогуле. Скажам, гэта адбудзецца ў выпадку, калі чалавек выходзіць на пенсію раней за агульнаўсталяваны ўзрост як беспрацоўны, але затым уладкоўваецца на работу. Або ў выпадку, калі чалавек, які выйшаў на пенсію за выслугу гадоў, зноў пачынае працаваць на пасадах, што даюць права на такую пенсію.

У ІНТЭРНАЦЕ ТОЛЬКІ ЧАСТКА

Выпадкі, калі пенсіянер часова або стала аказваецца на дзяржаўным забеспячэнні, рэдкімі назваць нельга. Прычым гэта акалічнасць можа адбівацца на выплатах. Так, выплаты не спыняюцца і працягваюць рабіцца ў поўным аб'ёме ў сітуацыі, калі пенсіянер трапляе нават на працяглае лячэнне ў бальніцу. Аднак зусім іншыя ўмовы вызначаны пры пераездзе ў дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў.

— Асобам, якія пражываюць у інтэрнаце, выплачваецца 10 працэнтаў іх пенсіі, але не менш чым 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце, — кажа Валянціна Каралёва. — А ў выпадках, калі памер пенсіі перавышае суму выдаткаў на ўтрыманне, робіцца выплата розніцы паміж пенсіяй і коштам утрымання. Аднак зноў-такі і тут непасрэдна «на рукі» чалавек павінен атрымліваць не менш чым 10 працэнтаў сваёй пенсіі ці не менш чым 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце.

У нечым больш ільготныя ўмовы прадугледжваюцца для інвалідаў і ўдзельнікаў вайны. Падчас пражывання ў інтэрнаце ім выплачваецца 25 працэнтаў пенсіі, але не менш чым 20 працэнтаў пенсіі па ўзросце.

Нарэшце, асобная размова аб пенсіянерах, якія пражываюць у сацыяльных установах і пры гэтым маюць непаўналетніх дзяцей. У такой сітуацыі на 1 дзіця робіцца адлічэнне 25 працэнтаў, на 2 дзяцей — 33 працэнты, на 3 і больш дзяцей — 50 працэнтаў пенсіі. А далей пачынае дзейнічаць агульнае правіла. Інваліды ці ўдзельнікі вайны атрымліваюць «на рукі» не менш за 25, астатнія пенсіянеры — не менш за 10 працэнтаў уласнай пенсіі. Прычым найменшая сума выплат тут вызначана ў тыя ж 20 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце.

НЕ З'ЯВІЎСЯ — СТРАЦІЎ

Асобная размова аб пенсіях па інваліднасці. Ці выплачваюцца яны ў выпадку, калі чалавек не з'явіўся ў медыка-рэабілітацыйную экспертную камісію для пацвярджэння групы?

— Калі інвалід без уважлівай прычыны не з'явіўся ў патрэбны тэрмін на пераасведчанне ў МРЭК, то выплата пенсіі прыпыняецца, а ў выпадку пацвярджэння інваліднасці пазней — аднаўляецца з дня перапынення, — тлумачыць Валянціна Каралёва. — Аднак трэба мець на ўвазе, што ў такой сітуацыі «перапыненая» пенсія можа выплачвацца не больш чым месяц.

Крыху іншая раскладка, калі прычына няяўкі на пераасведчанне прызнаецца ўважлівай. Тут камісіяй па прызначэнні пенсій можа быць прынятае рашэнне аб выплаце пенсіі з дня перапынення і да дня праходжання МРЭК. Аднак прымаецца такое рашэнне не больш чым за 3 гады і толькі пры ўмове, што за гэты перыяд медыкі прызнаюць чалавека інвалідам.

ПРАЦЭНТАЎ ЗА ДАСТАЎКУ НЕ БЯРУЦЬ

Атрымліваць пенсію можна праз банк, пошту, а ў некаторых рэгіёнах — і праз спецыялізаваныя ўнітарныя прадпрыемствы. Які з гэтых варыянтаў з'яўляецца больш выгадным?

— Ніякіх утрыманняў з пенсіі за яе дастаўку і перасылку ў нас няма, — працягвае Валянціна Каралёва. — Гэтыя выдаткі пошце і прадпрыемствам па дастаўцы пенсій аплачваюцца Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва. А банкам адлічэнняў за выплату фонд не робіць увогуле. Таму з пункту гледжання пенсійнай сістэмы найбольш выгадным з'яўляецца менавіта «банкаўскі» варыянт. Што ж непасрэдна для пенсіянераў, то па сутнасці галоўнае для іх — проста выбраць найбольш зручны спосаб дастаўкі.

ДАВЕРЫЎ — ПРАВІЛЬНА АФОРМІ

Не менш папулярнае пытанне — ці магчыма выплата пенсіі... па даверанасці?

— Варыянт выплаты пенсіі па даверанасці на самай справе магчымы, — заўважае Валянціна Каралёва. — Аднак у дадзеным выпадку даверанасць выдаецца не больш чым на год. І да таго ж даверанасць у абавязковым парадку давядзецца засведчыць у натарыяльнай канторы, па месцы працы ці навучання, у ЖЭСе або ў адміністрацыі лячэбнай установы, куды патрапіў пенсіянер.

УСЁ ВЫЗНАЧАЮЦЬ ДАГАВОРЫ

Нарэшце, нельга не спыніцца на тэме выплат пенсій у выпадку пераезду на сталае месца жыхарства за межы Беларусі. Прычым варта заўважыць адразу, што ў дадзеным выпадку ўсё залежыць выключна ад зместу міждзяржаўных дамоў.

Такім чынам, калі пенсіянер выязджае ў адну з дзяржаў СНД, выплата пенсіі ў Беларусі спыняецца. І аднаўляецца з моманту рэгістрацыі па новым месцы жыхарства ў краіне пераезду.

Крыху адрозніваюцца правілы падчас перасялення ў Расійскую Федэрацыю. Зараз тут дзейнічае прынцып «экспарту пенсій», інакш кажучы, Беларусь і Расія прызначаюць пенсіі за стаж, запрацаваны на сваёй тэрыторыі пасля 13 сакавіка 1992 года. Аднак у агульным правіле зроблена істотнае выключэнне. Паводле беларуска-расійскай дамоўленасці, у выпадку пераезду пенсіянер можа выбіраць пенсію той краіны, грамадзянінам якой ён з'яўляецца.

Той жа прынцып «экспарту пенсій» за постсавецкі стаж вызначаны і з Літвой. Што да астатніх краін, то міждзяржаўных дамоўленасцяў у галіне пенсійнага забеспячэння з імі няма. Таму пры выездзе на сталае месца жыхарства не ў краіны СНД ці ў Літву чалавеку робіцца толькі аднаразовая «авансавая» выплата ў памеры яго 6 пенсій. Аднак падобная норма не датычыцца пенсій па прафесійным знявечанні ці прафзахворванні. Гэтыя пенсіі пераводзяцца з Беларусі і выплачваюцца за ўвесь час знаходжання за мяжой.

Сяргей ГРЫБ.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении торгов 12 декабря 2007 года

Открытое акционерное общество "МАПИД" (Продавец) совместно с УП "Минский городской центр недвижимости" (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 107 по ул. Притыцкого в г. Минске

(при строительстве дома применены энергосберегающие технологии)

№ лота	Наименование объекта				Площадь, кв.м		Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
	№ квартиры	количество комнат	этаж	подъезд	общая	жилая		
1	37	4	1	2	90,6	57,9	199 773 000	19 977 300
2	38	1	1	2	41,9	19,9	92 389 500	9 238 950
3	39	4	1	2	99,9	68,9	220 279 500	22 027 950
4	40	3	2	2	77,8	45,1	171 549 000	17 154 900
5	41	2	2	2	55,1	29,3	121 495 500	12 149 550
6	42	2	2	2	55,1	29,2	121 495 500	12 149 550
7	43	3	2	2	77,4	44,8	170 667 000	17 066 700
8	44	3	3	2	77,6	45	171 108 000	17 110 800
9	45	2	3	2	55,3	29,3	121 936 500	12 193 650
10	46	2	3	2	55,3	29,4	121 936 500	12 193 650
11	47	3	3	2	77,5	44,8	170 887 500	17 088 750
12	48	3	4	2	77,6	45,1	171 108 000	17 110 800
13	49	2	4	2	55,2	29,3	121 716 000	12 171 600
14	50	2	4	2	55,3	29,4	121 936 500	12 193 650
15	51	3	4	2	77,7	45	171 328 500	17 132 850
16	52	3	5	2	77,6	45	171 108 000	17 110 800
17	53	2	5	2	55,2	29,3	121 716 000	12 171 600
18	54	2	5	2	55,1	29,2	121 495 500	12 149 550
19	55	3	5	2	77,8	45	171 549 000	17 154 900
20	56	3	6	2	77,7	45,1	171 328 500	17 132 850
21	57	2	6	2	55,1	29,3	121 495 500	12 149 550
22	58	2	6	2	55	29,2	121 275 000	12 127 500
23	59	3	6	2	77,5	44,8	170 887 500	17 088 750
24	60	3	7	2	77,6	45	171 108 000	17 110 800
25	61	2	7	2	55,1	29,3	121 495 500	12 149 550
26	62	2	7	2	55	29,2	121 275 000	12 127 500
27	63	3	7	2	77,6	44,8	171 108 000	17 110 800
28	64	3	8	2	77,8	45,1	171 549 000	17 154 900
29	65	2	8	2	55,2	29,3	121 716 000	12 171 600
30	66	2	8	2	55,1	29,2	121 495 500	12 149 550
31	67	3	8	2	77,5	44,8	170 887 500	17 088 750
32	69	2	9	2	55,3	29,3	121 936 500	12 193 650
33	70	2	9	2	55,2	29,4	121 716 000	12 171 600
34	71	3	9	2	77,5	44,8	170 887 500	17 088 750

Аукцион состоится 12 декабря 2007 г. в 11.00 в театральном зале Центрального Дома офицеров по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, 3.

К участию в аукционе допускаются физические лица — граждане Республики Беларусь.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений подтверждающих внесение: 1) задатка в сумме 10 % начальной цены; 2) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы.

Если участник аукциона выражает желание участвовать в торгах по нескольким объектам, задаток вносится в размере 10 % от стоимости объекта с наибольшей начальной ценой.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Внесение необходимых для участия в аукционе платежей осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНН 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня подачи заявления на возврат задатка или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с Условиями проведения аукциона и объектом. Оплата за приобретенную на аукционе квартиру производится в течение 25 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 14 календарных дней со дня истечения срока, отведенного для оплаты, при условии внесения победителем полной оплаты за квартиру и оплаты за подготовку и проведение торгов организатору аукциона КУП «Минский городской центр недвижимости».

Победитель аукциона помимо оплаты за квартиры обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату за подготовку и проведение аукциона УП «Минский городской центр недвижимости» сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 11 декабря 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник—четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 11 декабря 2007 г. до 17.00 включительно.

Телефоны для справок: 227 40 22; 227 48 36.
Для осмотра квартир необходимо обращаться по телефонам: 207 19 15; 207 14 77.
Интернет: www.mgcn.by.

Калектыў Рэгіянальнага аддзялення
Банка міжнароднага гандлю і інвестыцый
па Брэсцкай вобласці горача віншуе
з 60-годдзем з дня нараджэння
старшыню банка
Генадзя Станіслававіча АЛЕЙНІКАВА.

Ад шчырага сэрца жадаем моцнага здароўя, плёну ва ўсіх пачынаннях, дабрабыту, вялікага чалавечага шчасця.

Хай багаты вопыт, настойлівасць у дасягненні мэты, творчы падыход да любімай справы і надалей увасабляюцца ў значныя працоўныя поспехі, высокі аўтарытэт і павагу калег.



(Матэрыял пра Г.С. Алейнікава чытайце на 3-й стар.)

Минский областной исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий пансионата «Багута» 1982 года постройки (в районе Кургана Славы): Лот № 1: здание пансионата кирпичное (об. пл. 1951,7 кв.м, 3—4- этажное), расположенное: Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, д. Багута. Начальная цена — 1 450 000 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 2,07 га; Лот № 2: здание пансионата бревенчатое облицованное кирпичом (об. пл. 173,8 кв.м), здание пансионата сборно-щитовое, облицованное кирпичом (об. пл. 159,1 кв.м), расположенные: Минский район, пансионат «Багута». Начальная цена — 52 000 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 1,11 га. Объекты продаются без условий. Задаток 9 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи. Переход права пользования земельным участком будет произведен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 11 декабря 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10 декабря 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07214 >

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.11.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 152,00
1 еўра	3 167,42
1 латвійскі лат	4 513,42
1 літоўскі літ	917,50
1 чэшская крона	118,01
1 польскі злоты	874,49
1 расійскі рубель	88,03
1 украінская грыўня	427,66

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	24,4458
10 UAH	48,2632
1000 BYR	11,3457
EUR	35,9304

Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.11.2007 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

«ГОМЕЛЬСКАЯ ПРАЎДА» — ГАЗЕТА СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

12 лістапада абласной газеце «Гомельская праўда» спаўняецца 90 гадоў. Напярэдадні гэтага юбілею наш уласны карэспандэнт сустрэўся з галоўным рэдактарам выдання Сяргеем БЯСПАЛЫМ.

— Салідны ўзрост газеты, — сказаў ён, — абавязвае наш калектыў быць мудрымі і вытрыманымі, памятаць, што друкаванае слова — гэта адначасова і лякарства, і зброя. Мы ганарымся тым, што менавіта нам лёс даў магчымасць быць летапісцамі сённяшняга жыцця роднага краю.

За ўсю сваю гісторыю газета шэсць разоў мяняла назвы: «Известия Гомельского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов», «Известия революционного комитета города Гомеля и уезда», «Известия Гомельского Совета рабочих, солдатских и красноармейских депутатов», «Путь Советов», «Полесская правда». І вось ужо амаль сем дзесяцігоддзяў нязменнай застаецца адна — «Гомельская праўда». Сёння гэта не проста назва, гэта — вядучае імя, як кажуць зараз, брэнд, якое ведаюць далёка за межамі нашай краіны.

Высокі аўтарытэт газеты напрацоўваўся дзесяцігоддзямі, і сённяшні калектыў яе шчыра ўдзячны ўсім, хто ў свой час прымнажаў яго сваім талентам. У скарбонцы рэдакцыі нямала высокіх узнагарод. Сярод іх — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровая Грамата Вярхоўнага Савета СССР, Ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета БССР і ўрада рэспублікі. Ужо ў найноўшай гісторыі Беларусі газета адзначана падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, Ганаровай Граматай Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. А сёлета ў III Нацыянальным конкурсе друкаваных сродкаў масавай інфармацыі калектыву на Дзень друку была ўручана «Залатая ліцера» ў намінацыі «Лепшая абласная газета краіны».

Сённяшні творчы патэнцыял «Гомельскай праўды» дастаткова высокі. Гэта калектыў прафесіяналаў і аднадумцаў, у якім спалучаюцца вопыт і мудрасць старэйшых журналістаў з талентам і стараннем моладзі. Значыць, у газеты абавязкова будуць новыя перамогі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

А СВЯТА — У НОВЫМ ДОМЕ ДРУКУ

Спаўняецца 90 гадоў найстарэйшай газеце Прыдзвінскага краю — «Віцебскі рабочы». Перад добрым, знакавым юбілеем сустрэўся з кіраўніком творчага калектыву Аленай Аляксееўнай БЕГУНОВАЙ, якая яго ўзначаліла сёлета.

— Самы першы нумар «Віцебскага рабочага» выйшаў 12 лістапада 1917 года. З гэтай нагоды падрыхтавалі юбілейны тэматычны нумар. А непасрэдна святкаванне вырашана перанесці на 5 мая. Акрамя таго, што гэта супадзе з прафесійным святам газетчыкаў, на гэты дзень запланавана адкрыццё Дома друку. Ён размесціцца ў будынку, дзе зараз знаходзяцца рэдакцыі дзвюх абласных газет — «Віцебскі рабочы» і «Народнае слова», — расказвае галоўны рэдактар газеты Алена Бегунова. — А яшчэ нашым суседам стане рэдакцыя папулярнай віцебскай гарадской газеты «Віцьбічы». Пасля рэканструкцыі будынка адкрыецца і канферэнц-зала, дзе можна будзе арганізаваць прэс-канферэнцыі, творчыя сустрэчы, праводзіць пасяджэнні творчых саюзаў і г.д., наогул Дом друку стане сучасным. Ажыццяўленне гэтага маштабнага праекта падтрымліваецца кіраўніцтвам вобласці.

Што датычыцца непасрэдна нашай газеты, мы памянялі дызайн афармлення, фармат, ажыццяўляем некалькі спецыяльных праектаў, у прыватнасці, прысвечаны юбілею Віцебшчыны. Нядаўна набылі сучаснае аргаб-сталяванне на 30 мільёнаў рублёў: камп'ютары, лічбавыя фотаапараты.

Алена Бегунова адзначыла, што газета плануе павялічыць колькасць старонак, сярод планаў — пошук маладых талентаў. — «Усім супрацоўнікам трэба «быць на ты» з камп'ютарамі. Неабходна засвойваць новыя тэхналогіі. Трэба мяняць падыходы да стварэння сучаснай газеты.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Калектыў «Звязды» шчыра віншуе сваіх калег з юбілеямі і зычыць заўсёднага росту тыражоў!

Ліст у нумар

Хварэць нам нельга

«Звязда» шмат каму дапамагае. Можа пашанцуе і нам?

Пішу я гэты ліст па просьбе жыхароў (у асноўным — пенсіянераў) вёсак Адамаўшчына, Пераможац, Сачыўкі, Скарада, Хадасы, Харкі, якія абслугоўвае, калі цяпер так можна казаць, ФАП у нашым Забалацці. Будынак — добры, тыпавы, размешчаны непадалёк ад аўтобуснага прыпынку. Але ж фельчара там няма ўжо восем месяцаў. Працуюць толькі санітарка і качагар...

У Альковічах (туды 5 кіламетраў аўтобусам і 2 пехатой) ёсць амбулаторыя. Лічыцца, што работнікі яе павінны аказваць медыцынскую дапамогу і нам, жыхарам названых вёсак. Але ж доктару там ужо 70 гадоў... А на нашым участку шмат хворых, якім неабходна пастаяннае амбулаторнае лячэнне.

У раённым аддзеле аховы здароўя пра гэта цудоўна ведаюць. Але заяўку на маладога спецыяліста чамусьці не далі. А таму хварэць нам вельмі небяспечна: пакуль нейкі доктар з'явіцца, можна і Богу душу аддаць.

Любоў Міхайлаўна ЧЫГРЫНАВА,
в. Забалацце, Вілейскі раён.

Ведай нашых!

Узнагарода за... дабрыню

У Маскве, у калоннай зале Дома саюзаў, адбыўся міжнародны з'езд валанцёраў дзяцінства.

З'ехаліся яны з усіх рэгіёнаў Расіі, былых саюзных рэспублік, з Японіі, Фінляндыі, Балгарыі, каб абмеркаваць вынікі міласэрнай дзейнасці, вызначыць накірункі працы на перспектыву, адзначыць узнагародамі лепшых.

Вышэйшая з іх — залаты медаль імя Льва Талстога — была ўручана старшыні праўлення Беларускага Дзіцячага фонду, пісьменніку Уладзіміру Ліпскаму.

У свой час такую ж узнагароду атрымалі слынныя грамадзяне свету Маці Тэрэза, Астрыд Ліндгрэн, Агнія Барто, Сяргей Міхалкоў, Леанід Рашаль і іншыя.

Настасся РАДЗІКЕВІЧ.

Кватэрнае пытанне

ПРАВЫ ЗАСТАЮЦЦА. З НАДЗЕЯМІ...

Мой муж доўга працаваў на адным прадпрыемстве. 5 гадоў таму быў прыняты там на кватэрны ўлік. Зараз пайшоў на пенсію па ўзросце. Ці ёсць у яго шанц палепшыць жыллёвыя ўмовы па месцы ранейшай працы, ці захоўваюцца правы на атрыманне дзяржпадтрымкі за пенсіянерамі?

Л. Козырава, г. Мінск.

Згодна з п. 34 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) у выпадках звальнення ў сувязі з выхадам на пенсію за грамадзянамі захоўваецца права знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы (службы) незалежна ад далейшага працаўладкавання, у тым ліку ў іншы дзяржаўны орган, іншую арганізацыю.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі штогод у перыяд з 1 лютага да 1 мая праводзяць удакладненне даных, якія з'яўляюцца падставай для захавання права грамадзян знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у парадку, прадугледжаным для атрымання дакументаў, што з'яўляюцца падставай для пастаноўкі грамадзян на ўлік. Пры гэтым удакладненне ўказаных даных, што датычацца канкрэтнага грамадзяніна, які знаходзіцца на такім уліку, ажыццяўляецца рэгулярна праз 5 гадоў з даты пастаноўкі гэтага грамадзяніна на ўлік у перыяд з 1 лютага да 1 мая.

Грамадзяне, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, абавязаны для ўдакладнення даных, што з'яўляюцца падставай для захавання іх права знаходзіцца на такім уліку, рэгулярна праз 5 гадоў з даты пастаноўкі на ўлік (на працягу двух месяцаў) падаюць звесткі аб даходзе і маёмасці, што прыпадаюць на кожнага члена сям'і. Такія звесткі неабходныя пры разглядзе пытанняў аб прадастаўленні жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання або аказання дзяржпадтрымкі (субсідыі, крэдыты, пазыкі) для паляпшэння жыллёвых умоў. Іншыя дакументы, неабходныя для ўдакладнення ўліковых даных, пры неабходнасці запытваюцца ў адпаведных арганізацый органамі, якія вядуць кватэрны ўлік.

Такім чынам, калі муж аўтара пісьма пасля адыходу на пенсію не страціў падстаў для прызнання яго маючым патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то за ім захоўваецца права знаходзіцца на ўліку па месцы працы. Пытанне аб паляпшэнні яго жыллёвых умоў будзе вырашацца, калі падыдзе чарга.

Віктар САВІЦКІ.

«Гарачая» лінія Ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25:

13 лістапада:

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы **Алена Леанідаўна БОГДАН.**

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы **Анатоль Іванавіч СЯДЫХ.**

20 лістапада:

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы **Аляксандр Іванавіч КАРАНЕВІЧ.**

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы **Яраслаў Леанідавіч ПЕРАЛЫГІН.**

27 лістапада:

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы **Валянціна Вацлаваўна КУРСЕВІЧ.**

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы **Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.**

Восеньскія нататкі

ЛАЎРЭАТЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Не, размова пойдзе не пра лаўрэатаў Нобелеўскай або іншых прэмій, але аб прыхільніках кахання на адлегласці. У аднаго з даследчыкаў творчасці Франчэска Пятраркі, аўтара санетаў на жыццё і смерць мадонны Лаўры, чытаю: «Толькі тое каханне застаецца ў вяках, якое пазбягае ажыццяўлення. Але гэта ў рэшце рэшт не рускія справы. Вось калі б Пятрарка жыў у Расіі, і прозвішча ў яго было Пятроў — ён украў бы Лаўру з сям'і, вымушаны быў бы з ёй ажаніцца, назаўтра разлюбіў бы, усё жыццё біў бы і цярпеў пабоі ў адказ, піў бы з сябрукамі горкую, і што самае важнае, не напісаў бы ў рыфму ні радка. А галоўным яго творам так і застаўся б трактат «Аб пагардзе да свету». Прыкладна такую ж думку ўклаў у працяг трагедыі «Рамэо і Джульета» нейкі гумарыст-дзівак яшчэ ў мае школьныя гады. Гэтую паэму транслявалі ў ранішняй перадачы ўсесаюзнага радыё. З той пары помню радок: «Твоя жена второе новолунье в одних и тех же ходит жемчугах!». Так ушчувала капрызная Джульета свайго мужа, які вечарамі прападаў на будоўлі ладдзі. Зусім сучасная карціна, праўда? Ад сварлівых жонак уцякаюць на паляванне, рыбалку і нават у гараж. Вось што магло б быць, калі б Мантэкі і Капулеці памірыліся, і дзеці іх стварылі сям'ю, — сцвярджаў аўтар.

У гэтым жа стылі вядомы верш Кіплінга «Я цябе разлюблю і забуду...» Вельмі выгадная мужчынская пазіцыя. Стварай сабе ідэал, чэрпай з яго натхненне, папісвай вершы, калі Бог даў талент. Не трэба нікога пакараць, заваёўваць, і, галоўнае, — ніякай адказнасці. Ніякіх затрат: ні матэрыяльных, ні духоўных.

Тым больш, прыкладаў падобнага кшталту ў гісторыі — хоць адбаўляй. Хемінгуэй некалі пісаў Марлен Дзітрых, што кахаў яе заўсёды, але яна вечна была захоплена нейкай нікчэмнасцю, і ён горда адступаў. Праўда, не заўсёды выходзіць па-хемінгуэйску з нязбыльным каханнем. У мяне ёсць падазрэнне, што не здзяйсняў бы сваіх подзвігаў у Амерыцы Тадэвуш Касцюшка, каб аддалі яму мілую сэрцу Людвіку. Звіў бы з ёй утульнае гняздзечка дзе-небудзь у Сяхновічах ды гадаваў нашчадкаў. А калі жыццём не вельмі даражыў, дык што заставалася, як не здзіўляць усіх за акіянам цудамі гераізму. І Лермантаў, відавочна, не лез бы на ражон, не дражніў бы Мартынава, каб не прыехала ў Пяцігорск на воды Варвара Лапухіна са старым раўніўцам-мужам. Варвара Аляксандраўна была музай паэта, яго вялікім няспраўджаным каханнем. Але яму, апальнаму афіцэру, адмовілі ў яе руцэ... Так што не заўсёды, далёка не заўсёды нешчаслівае каханне становіцца крыніцай натхнення. Часцей — прычынай пакут.

Старэйшае пакаленне добра памятае спявачку Ганну Герман з яе незвычайна пяшчотным голасам і сумнымі вачыма. Шмат гадоў яе звязвала светлая дружба з эстонскім лесніком, а затым журналістам і кінематаграфістам Антсам. Іх пачуццё жыло ў асноўным у пісьмах, якія яны дасылалі адно аднаму з розных канцоў свету. Яны сустрэліся немаладымі, калі ў кожнага была свая сям'я. Але Антс у інтэрв'ю праз дзесяцігоддзе пасля яе адыходу назваў гэту сустрэчу невыпадковай, наканаванай лёсам, як у старых фільмах пра дзве палавінкі, — аднойчы яны абавязкова сыходзяцца. Ганна хоць і пісала, што шчаслівая нават рэдкімі будучымі сустрэчамі, але ж праўда жыцця часам праступала нават праз яе далікатныя радкі. «Сёння, калі сушыла валасы, — піша яна, — упершыню ўбачыла некалькі сівых. Раней іх не было. Вось — сапраўдная восень, ці што? І ты, здаецца, галоўны віноўнік. Сівізна прыходзіць ад самотных думак...»

Многа месяцаў яна правяла ў бальніцы. Пісала, што там добра і ціха, што ў адзіноце можа шмат думаць. Адтуль слала аптымістычныя лісты, нешта накшталт: «Я папраўлюся і буду спяваць». Але ж душэўную роспач не схаваеш нават за паказным аптымізмам. Бо калі табе цяжка і балюча, хочацца, каб побач быў чалавек, да якога ўвесь час звяртаешся ў думках. «Мы прыдумаем новую казку і сыграем у ёй галоўныя ролі», — напісала яна «свайму прынцу», але сыграць ужо не паспела.

Не ўсё можа сыграць нават самы таленавіты акцёр. Вось каб сустрэлася якой-небудзь здымачнай групе вельмі сталая пара, якая сустрэлася мне на адной з вуліц Будапешта жнівеньскім днём 1997 года, яны ўсіх Оскараў пабралі б. Такое, відавочна, не сыграў ніхто. Бабулька з дзядулькам, якім, напэўна, даўно мінула восемдзесят, ішлі павольнымі маленькімі крокамі, асцярожненька, нібы баючыся. Адчувалася, што ісці ім нялёгка. Але яны так пяшчотна, так беражліва трымаліся, і падтрымлівалі адно аднаго не толькі рукамі, але і нейкім унутраным сваім святлом, вачамі, постацямі, што не спыніцца, не любавацца імі было немагчыма. Потым заўважыла, што не адна я гляджу на гэту незвычайную пару. Яшчэ два-тры чалавекі запаволілі крок, папрыгажэлі ўсмешкамі. Тыя старыя нібы падарылі нам хоць слабенькую, квёлую надзею, што каханне бывае не толькі пакутлівым, прывідным, але і рэальным, жывым, як у казках — да скону, да апошняга дня.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

На ММЗ — першы запуск дызельнага рухавіка Еўра-4

На Мінскім маторным заводзе ажыццёўлены першы запуск дызельнага рухавіка ўзроўню Еўра-4.

Памочнік прэзідэнта Беларусі Сяргей Ткачоў павіншаваў калектыў прадпрыемства, партнёраў і ўсіх машынабудаўнікоў рэспублікі з гэтай падзеяй і адзначыў, што Беларусь, а таксама Расія, куды паступаюць у значнай колькасці беларускія маторы, атрымаюць новы якасны і канкурэнтаздольны прадукт.

У першым квартале 2008 года Мінскі маторны завод пачне праводзіць эксплуатацыйныя выпрабаванні рухавіка Еўра-4 на МАЗе і маскоўскім ЗІЛе. А з наступнага тыдня на ММЗ пачнуць стэндавыя выпрабаванні матора.

Як адзначыў на прэзентацыі намеснік міністра прамысловасці Беларусі Валянцін Гурыновіч, рэалізацыя гэтага праекта на ММЗ сведчыць аб паўнапраўным удзеле завода ў сусветным маторабудаванні.

БЕЛТА.

Беларусь спрасціла ўмовы атрымання віз для грамадзян Ізраіля

Беларусь у аднабаковым парадку прыняла рашэнне аб скарачэнні спіса дакументаў, неабходных грамадзянам Ізраіля для атрымання беларускай уязной візы.

Як растлумачылі БЕЛТА ў пасольстве нашай краіны ў Тэль-Авіве, грамадзянам Ізраіля, якія маюць намер наведаць Беларусь на тэрмін да 30 дзён, для атрымання візы больш не трэба прад'яўляць запрашэнні і іншыя тлумачальныя дакументы.

«Гэта рашэнне прынята беларускім бокам у якасці жэста добрай волі ў аднабаковым парадку дзякуючы намаганням пасольства Беларусі ў Ізраілі і з улікам зваротаў Усеізраільскага аб'яднання выхадцаў з Беларусі, а таксама індывідуальных зваротаў грамадзян Ізраіля», — адзначылі ў пасольстве.

Тут выказалі надзею на тое, што гэты крок «дапаможа ізраільцянам часцей бываць у нашай краіне, адкрыць для сябе гісторыю добрасуседскіх адносінаў беларусаў і яўрэйскай абшчыны, убачыць рэальную сённяшнюю Беларусь».

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РЭЙТЫНГ БУША Ў ЕЎРОПЕ ДАСЯГНУЎ ДНА

Апошняе сацыялагічнае апытанне ў Еўропе сведчыць пра безнадзейна сапсаваную рэпутацыю амерыканскага прэзідэнта.

Самую высокую ацэнку Буш атрымаў у ЗША, але і там яго падтрымліваюць усяго 36 працэнтаў насельніцтва. Горш за ўсё да амерыканскага прэзідэнта ставяцца французы — 89 працэнтаў апытаных адазваліся аб ім негатыўна. 80 працэнтаў насельніцтва адмоўна ставяцца да Буша ў Іспаніі, 71 працэнт — у Вялікабрытаніі. Пры гэтым 90 працэнтаў французаў, 82 працэнты англічан і італьянцаў, 84 працэнты іспанцаў, 75 працэнтаў немцаў і 67 працэнтаў амерыканцаў выступаюць за вывад амерыканскіх войскаў з Ірака.

Вельмі нізкім рэйтынг цяперашняга гаспадара Белага дома застаецца і ў ЗША. Горшым прэзідэнтам у гісторыі краіны Джорджа Буша лічаць 23 працэнты амерыканцаў. Процілеглай думкі, гэта значыць, што Буш лепш за сваіх папярэднікаў, прытрымліваецца ўсяго адзін працэнт суграмадзян.

БЕНАЗІР БХУТА ПАД ХАТНІМ АРЫШТАМ

Услед за тым, як стала вядома пра тое, што лідар пакістанскай апазіцыі, былы прэм'ер-міністр Беназір Бхута ўзята пад хатні арышт, у Пакістане было спынена вяшчанне тэлеканалаў CNN і BBC. Прыватныя кабельныя каналы былі адключаны некалькімі днямі раней.

Беназір Бхута мела намер узначаліць масавы мітынг сваіх паплечнікаў з Пакістанскай народнай партыі, які быў запланаваны на пятніцу. Раней паведамлялася, што з мэтай сарваць правядзенне мітынгу, улады арыштавалі да 5000 прыхільнікаў Бхута.

Нагадаем, 3 лістапада ў Пакістане было ўведзена надзвычайнае становішча і прыпынена дзейнасць канстытуцыі.

КАНГРЭС ЗША АДМОВІЎСЯ ВЫДАТКАВАЦЬ ГРОШЫ НА ПРА Ў ПОЛЬШЧЫ

Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША адобрыла законапраект аб асігнаваннях на абарону ў 2008 годзе ў памеры 459 млрд долараў, аднак адмовілася выдаткаваць грошы, неабходныя для будаўніцтва базы проціракетнай абароны ў Польшчы. У падтрымку дакумента выказаліся 400 кангрэсменаў, супраць — 15. Прыступіць да будаўніцтва ПРА ў Польшчы адміністрацыя ЗША хацела ўжо ў пачатку 2008 года, каб завяршыць установку проціракет у шахтах у 2013 годзе.

РЭАЛЬНЫ КУРС ДОЛАРА ЎПАЎ ЗА 7 ГАДОЎ НА 25 ПРАЦЭНТАЎ І МОЖА ПАНІЗІЦЦА ЯШЧЭ НА 20

Долар упаў на 25 працэнтаў са свайго максімальнага значэння ў адносінах да кошыка валют асноўных гандлёвых партнёраў ЗША. Папярэдняе супастаўляльнае падзенне амерыканскай валюты адбылося ў 1985—1989 гадах.

ДЖЭНТЛЬМЕНЫ АДДАЮЦЬ ПЕРАВАГУ БЛАНДЗІНКАМ, АЛЕ БЯРУЦЬ ШЛЮБ З ШАТЭНКАМІ

Як паказваюць шматлікія апытанні, праведзеныя ў еўрапейскіх краінах, мужчыны ўсё ж такі аддаюць перавагу бландзінкам. Яны іх адразу выдзяляюць з натоўпу і ўвогуле звязваюць паняцце «сэксуальнасць» менавіта са светлавалосымі чараўніцамі.



За бландзінак у якасці палюбоўніц галасуюць 60 працэнтаў еўрапейскіх мужчын. Аднак лічбы мяняюцца, калі размова заходзіць пра шлюб. Тут лідзіруючую пазіцыю трымаюць шатэнкі, за імі ідуць бландзінкі, брунеткі і на апошнім месцы — рыжыя. Цікава, што амаль 90 працэнтаў еўрапейцаў звязваюць брунетак з паняццямі «ракавая», «разумная», «інтэлектуальная» і «надзейная». 45 працэнтаў мужчын лічаць, што рыжавалосыя жанчыны належаць да катэгорыі «бестый», «капрызных», але 80 працэнтаў мяркуюць, што рыжыя надзелены моцным інтэлектам. Брунеткі і рыжавалосыя дамы выклікаюць у нямецкіх мужчын пачуццё насцярожанасці. Між тым у амерыканцаў ужо які год запар тытул «Міс Амерыка» атрымлівае выключна брунетка.

Простыя рэчы

ЮШКА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У апошні час практычна кожны вядучы тэлеканал аддае даніну не толькі бандыцка-міліцэйскім і любоўна-пяражывальным серыялам ці іх спарышам, перадачам аб тым, як можна палепшыць сваё здароўе, але і праграмам аб прыгатаванні ежы. У кожнай з іх свае адметнасці, свой накірунак. І напачатку гэта было досыць цікава, калькі я мог заўважаць, нават прадстаўнікам старэйшых пакаленняў тэлегледачоў, якія ў сваім жыцці не задумваліся над поварскімі далікатнасцямі. Цяпер жа, зноў заўважаю, што такія перадачы выклікаюць у многіх пэўнае раздражненне. І найперш тым, што тэлегледачам прапануецца прыгатаванне страў з рэдкіх, дарагіх, а часам і проста экзатычных інгрэдыентаў. Перад тэлевізарамі найбольш часу праводзяць людзі сталага ўзросту, пенсіянеры. І ім выслухоўваць з перадачы ў перадачу пра крэветкі, размарыны ды кардамоны надакучвае. Большасць з іх не тое што не бачылі — не чулі пра такое. Ці аліўкавы алей з перадачы ў перадачу. Ды наш масавы тэлеглядач толькі да сланечнікавага алею нядаўна прызвычаіўся. А многія з іх памятаюць і льняны алей, які паспяхова ўжываўся ў ежу.

Ды я адхіліўся ад тэмы. Некалькі разоў у такіх перадачах расказвалася аб прыгатаванні юшкі. Вядома ж, рыба там бралася высокіх гатункаў, не з беларускіх рэк ці азёр, ды і інгрэдыенты астатнія — не нашы. Але ж і наша, самая звычайная юшка, звараная на беразе возера, на вогнішчы, якое адбіваецца ў пачарнелай ўначы вадзе — таксама за сябе можа пастаяць.

Лавіць рыбу, а потым тут жа, на беразе варыць з яе юшку мы пачыналі ад малых гадоў. Займаліся гэтым і юнакамі, і пасля службы ў арміі, ды і, стаўшы сямейнымі, дзяцей займеўшы, радзей, але выбіраліся на возера ці рэчку. Вудамі не лавілі. Прызнаемся, браканьерствавалі пакрысе. Неяк ніякавата было цягнуць на бераг падвалочку. Але ж нам многа не трэба, толькі каб юшкай паласавацца. Мне ж у такія моманты заўсёды прыходзілі на памяць словы любімых пісьменнікаў, якія таксама ў нечым апраўдвалі недазволены спосаб лоўлі. І неяк лягчэй на душы станавілася.

У Якуба Коласа:

...Затым — дзед Юрка быў рыбак.
Ды рыбакі не ўсе аднакі —
Свае ў іх густы і адзнакі.
Дзед меў да сецей нахіленне,
А вудзіць — не: не меў цярпення
І не любіў наогул вуды
І гэтай вудавай маруды,
Бо вуду любяць больш паны...

У Янкі Брыля ў яго аўтабіяграфічнай аповесці «Ніжнія Байдуны»:

«Цяпер ужо і сетачкай на юшку налавіць — таксама браканьерства. І мы не згодныя з гэтым. Тыя «мы», што сёння, у чэрвеньскі выхадны дзень бродзім з таптухай. Дзе ў беразе, дзе на мяльчэйшым, у зелі. Колькі нам трэба — дай бог вядро, ці хоць няпоўнае — на восем чалавек. Ды раз у год ці ў два гады, — так усё часу няма, каб спаткацца, як людзі».

Ну, магчыма, крыху апраўдаўся. А ў гэтай справе мне падабалася ўсё. І сама лоўля рыбы, калі заб'ецца ў сетцы ладны шчупачок ці лешч. І потым тут жа ля вады платаць рыбу (платаць па-нашаму, мясцоваму — чысціць). Ну і, безумоўна, гатаваць юшку. Тут жа, на беразе, на яркім вогнішчы з сухога ламачча. З дому на такі «пікнік» нічога асаблівага не трэба захопліваць — соль ды перац, цыбуля, ну, там лісток лаўровы, зяленіва ці які корань заўжды знойдуцца ў бліжэйшым агародзе. Праўда, калі рыбы малавата, то і бульбіна не перашкодзіць, і крупы якой можна дадаць. Але гэта ўжо цягне больш на рыбны суп.

Шмат давялося паглядзець, як вараць юшку, самому варыць таксама. Трайную юшку гатаваў толькі адзін раз. Магчыма, па кулінарных кнігах яна і называецца і гатуецца не так. Але ў нас яна атрымалася менавіта ў тры заторы. У той летні святочны дзень сабраліся немалой кампаніяй на беразе возера. Ёсць лодка, ёсць сетка. Чаму б не рызыкнуць. Зрабілі дзве тоні, ды такія ўдалыя, што хуценька павярнулі да берага. Паглядзелі на рыбу і вырашылі варыць менавіта трайную. Пакуль на вогнішчы закіпаў паўтаравёдзерны чыгун, я адабраў дробных акунёў і яршоў, не платочы, толькі вытрубашыўшы, завязаў іх у марлю і апусціў у кіпень. Калі рыба выварылася, выняў і адцісніў яе ў чыгун. Тое, што засталося ў марлі, забрала адна з жанчын — курам будзе цудоўны пачастунак. За другім разам у кіпень заклаў шчупачыныя галовы, шэрую рыбу, як мы яе называем — плотку, язёў, падлешчыкаў... Зварыліся — іх таксама з чыгуна, але ўжо на разасланую цырату. Гэта закусь пад першую чарку. Ну, а ў трэці раз паклаліся парэзаныя буйнымі кавалкамі шчупакі, лінькі, лешч, карасі і нават амаль што метровы вугорыч, які ўвогуле рэдка трапляе ў сетку. І дастаць яго з сеткі вельмі цяжка, толькі спрактыкаваны рыбак можа зрабіць гэта. Звычайна, у надзеі на спатканне з ім, мы бралі на рыбалку сцізорык, каб адрэзаць галаву. Што ж да гарэлкі, то сто грамаў на чыгун у самым канцы дабаўляецца, кажуць, каб рыба не развальвалася. Нехта яшчэ і галавешку туды ткне. Мы такое не робім, бо вугольцы ад вогнішча і так трапляюць у варыва, ды і дымком яно будзе патыхаць абавязкова.

Але вось юшка гатовая. Нашы жанчыны, не спадзеючыся на рыбацкую ўдачу, місак і лыжак з сабою не захапілі. Таму выклалі рыбу з чыгуна, а юшку чэрпалі кубкамі. Святочны стол на летнім узгорку быў багаты, хапала і кансерваў, і каўбас, іншага наедку, але яны засталіся амаль не кранутымі — такой смачнай, духмянай і тлустай атрымалася юшка. Але гэта не заканчэнне гісторыі. На наступны дзень заехаў да мяне аднакласнік. Падзяліліся ўражаннямі ад мінулага свята. Я расказаў пра юшку. Аднакласнік загарэўся.

— Дык пад'едзем. Там, у чыгуне ў дзедавай летняй кухні засталося.

Прыехалі на бераг возера. Пайшлі ў летнюю кухню. Адкрыў я вечка чыгуна — ды там не юшка, а халадзец. Сябар узяў лыжку, вагаючыся, адшчыкнуў кавалачак былога варыва, недаверліва пакаштаваў.

— І не разагравай. Там у мяне хлеб ёсць, ды і чарка знойдзецца, — пашыбаваў да машыны.

На мой вопыт, юшка тым смачней, чым больш у ёй відаў рыб. Калі іх з дзесятак, а то і больш — нават пры малой колькасці атрымаецца смачная. Але мудрагеліць тут можна колькі заўгодна. Неяк на Ушаччыне меў магчымасць пачаставацца юшкай, якую робяць так: спачатку ў вядры ці чыгуне вараць курыцу. Вымаюць яе, разразаюць на порцыі, а потым ужо закладаюць рыбу.

Давялося неяк пакаштаваць юшку і са сцярлядак. Мы, маладыя літаратары і мастакі, ездзілі тады па газавых і нафтавых радовішчах Цюменскай вобласці. У Ханты-Мансійску дзеячы з акружкама камсамола вырашылі нас пачаставаць. Вывезлі на бераг Іртыша. Там ужо стаялі прычаленыя да берага два катэры, у скрыньках біла хвастамі роўная, сярэдніх памераў сцерлядзь. Пакуль варылася юшка, гаспадыні бралі са скрынь рыбіны, хутка пластавалі іх, пакідаючы толькі філе, наразалі яго кавалачкамі, пасыпалі соллю ды перцам. І, калі ласка, пад чарку — частуйцеся. Праглынуў толькі кавалачак, неяк есці тое, што толькі хвіліну назад білася ў руках, не захацелася. А вось юшка атрымалася выдатная, нездарма, відаць, сцярляжую называюць яшчэ і царскай. І тады ўспомнілася, ды і цяпер таксама: Віктар Астаф'еў, яго славутая «Цар-рыба». Цудоўны расійскі пісьменнік, сібірак не ў час каротката эрміновых камандзіровак знаёміўся з магутнымі сібірскімі рэкамі, іх багаццем, ведаў, што раней азначала рыба для тутэйшых жыхароў. Дарэчы, неяк было прынята ў былым СССР лічыць буйнейшай ракой-сімвалам Волгу. А яна ж толькі на пятым месцы. Перад ёю па даўжыні, не гаворачы пра шматводдзе, сібірскія Об з Іртышом, Амур, Лена, Енісей.

Дык вось у Астаф'ева. *«Да бурна закіпеўшага катла, па якім гняце лаўровы ліст і ў сярэдзіне круціць белапенную варонку, завіхраючы ў ёй гарошынкі перцу, мелкія вугельчыкі, шэрае ашмецце атгару і камарой, дзяжурны прэ ў кошыку вычышчаную, вымытую, парэзаную рыбу. З кошыка тырчыць бліскучы, раздвоены хвост вялізнай нэльмы, трапечуць і пахрустваюць яшчэ аб пруты крылы сцярлядак, бура свеціцца прыгожы тайменёнак...».* Брыгада енісейскіх рыбакоў ладзіць вячэру на беразе, пасля цяжкага дня на рацэ. А побач круцяцца, дапамагаюць, чым могуць пасялковыя дзеці. Яны цэлы дзень галодныя чакалі гэтага моманту. І першыя атрымліваюць ад дарослых па місцы юшкі, якая — асноўная іх ежа ў гэтым краі.

У беларускай мове слову юшка адпавядае і юха. І яны маюць значэнне не толькі рыбнага варыва. Юшкай называюць і поліўку, грыбную страву, ды і ўвогуле жыжку ва ўсякай страве. Ёсць у народзе ўстойлівае: сёрбай юшку, на дне гушча! А можна свайму ворагу і юху (кроў спусціць). У Якуба Коласа:

Па карку Баба так дала,
Што Пеўню вочы засланіла
І юха з пеўня пацякла.

І ўсё-такі юшка — гэта найперш цёплая ноч, яркае вогнішча над вадой, нешматлікія і не такія ўжо надакучлівыя, як у Сібіры, а нашы свойскія камары. І няспешная, шчырая размова сяброў.

Алесь КАСЦЕНЬ.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже жилого дома об. пл. 64,5 кв.м, расположенного на земельном участке пл. 0,1240 га (водоохранная зона реки Сервечь), по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г.п. Кривичи, ул. Набережная, д. 13. Начальная цена — 16 682 815 бел. рублей. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2007 г. Аукцион состоится 20.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон: (8017) 224 61 34 Сайт в Интернете: www.rlt.by.

У 2008 годзе пачне курсіраваць новы хуткі цягнік Гродна—Санкт-Пецярбург,

паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка пасажырскай службы БЧ Юрый Радзько. Састаў будзе курсіраваць тры разы на тыдзень. Прадугледжваецца таксама ўвесці дызель-цягнік павышанай камфортнасці Гомель—Бранск. У наступным годзе плануецца таксама перавесці ў катэгорыю хуткіх цягнік № 386/385 Гомель—Калінінград. Цягнік № 64/63 Мінск—Іркуцк будзе курсі

АДНОСІНАМ З ФРАНЦЫЯЙ — НОВЫ ІМПУЛЬС

У Мінску паміж Міністэрствамі абароны Беларусі і Францыі падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве. Асноўныя яго накірункі — будаўніцтва і ўмацаванне еўрапейскай бяспекі, будаўніцтва і рэфармаванне Узброеных Сілаў, ваенная навука, ваенная адукацыя, тапаграфія, картаграфія і геадэзія, ваенная юрыспрудэнцыя і сацыяльнае забеспячэнне ваеннаслужачых, ваенная медыцына.

Міністр абароны Беларусі генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў падкрэсліў, што адносіны паміж ваеннымі ведамствамі абедзвюх краін развіваліся і раней, але з падпісаннем Пагаднення аб супрацоўніцтве яны набылі новы імпульс. Нагадаю, што беларускія ваеннаслужачыя навучаліся ў ваеннай акадэміі Францускай Рэспублікі, у гонар 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Мінск наведалі ветэраны гераічнай эскадрыллі «Нармандыя—Нёман», на працягу 14 гадоў беларускія ваенныя музычныя калектывы ўдзельнічалі ў фестывалях і іншых мерапрыемствах у Францыі, а летась у нашай краіне з поспехам выступіў Галоўны ваенны аркестр Сухапутных войскаў Францыі, прыезд якога быў прымеркаваны да перазахавання астанкаў французскіх ваеннаслужачых, удзельнікаў вайны 1812 года, што былі знойдзены ў жніўні 2005 года ў Вілейскім раёне Мінскай вобласці, летам гэтага года стажыроўку ў Францускім цэнтры верыфікацыі прайшлі афіцэры Нацыянальнага агенцтва па кантролі і інспекцыях — Дэпартамента Міністэрства абароны Беларусі. Дадатковы стымул развіццю кантактаў надаў візіт у нашу краіну вясной гэтага года дэлегацыі Генеральнага штаба Узброеных сілаў Францыі.

— Францыя, як і іншыя краіны Еўрапейскага Саюза, вельмі зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Беларуссю, — пераканана Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Французскай Рэспублікі ў Беларусі спадарыня Мірэй Мюсо. — У ваеннай сферы існуе шмат накірункаў, у якіх мы можам дзейнічаць сумесна, бо ў нашых дзяржаў — агульныя інтарэсы, у прыватнасці ўзаемадзеянне ў галіне ваеннай бяспекі. Доказ таму — прысутнасць на семінары ў Парыжы прадстаўнікоў Беларусі.

Мірэй Мюсо адзначыла высокі прафесіяналізм беларускіх ваенных і прапанавала ў рамках супрацоўніцтва арганізаваць сустрэчу ваенных гісторыкаў Беларусі і Францыі.

ПРЫЗЫЎ НАБЛІЖАЕЦЦА

Для праходжання тэрміновай ваеннай службы на пасадах салдат і сяржантаў плануецца прызваць каля 10 тысяч чалавек. Адбор маладога папаўнення пачнецца з 19 лістапада, а завершыцца 28 снежня. Адпраўка ў войскі будзе ажыццяўляцца з 14 па 31 студзеня 2008 года. Рэзервістаў у гэты прызыў не набіраюць.

Ірына ПРЫМАК.

Жыллё маё

КВАТЭРНЫ РЫНАК ГОМЕЛЯ ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ПАКУПНІКОЎ

Толькі за апошнія 10 месяцаў усе віды жылля ў шматкватэрных дамах гэтага абласнога цэнтра падаражэлі прыкладна на 40 працэнтаў. Нават летам, пры вельмі маленькай актыўнасці ўсіх удзельнікаў рынку, кватэры працягвалі дарагець.

Відавочна, што гаспадары мясцовага жылля разлічвалі на істотнае сезоннае павелічэнне цэнаў восенню. Аднак гэтага не адбылося. Між іншым, паводле ацэнкі гомельскіх рыэлтараў, нягледзячы на тое, што зараз у горадзе на продаж прапануецца вельмі шмат кватэр, цэны на іх застаюцца нерэальна завышанымі.

Паводле інфармацыі кіраўніка дзяржаўнага гарадскога агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг Уладзіміра Балтаносава, мясцовая жыллёвая нерухомасць ужо не карыстаецца стабільным попытам. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што патэнцыяльныя пакупнікі пачалі менш карыстацца банкаўскімі крэдытамі, працэнтныя стаўкі па якіх цяпер сталі даволі адчувальнымі. З іншага боку, банкі сёння пры выдачы крэдытаў выстаўляюць больш жорсткія ўмовы па колькасці і «якасці» паручыцеляў. А вось багатых і не зусім асцярожных паручыцеляў у Гомелі засталося вельмі мала.

У выніку атрымліваецца, што на дарагое жыллё ў патэнцыяльных пакупнікоў проста не хапае грошай. Галоўным чынам купляюць сёння кватэры на другасным рынку жылля толькі ў тых выпадках, калі чакаць кліентам ужо немагчыма. Мінімальны кошт самай слабенькай аднапакаёвай стандартнай кватэры складае каля 30 тысяч долараў. Карыстаюцца тут цяпер невялікім попытам і зусім «дробныя» маласямейкі. Такія кватэры з агульнай плошчай ад 20 да 34 квадратных метраў прапануюцца ад 20 да 29 тысяч долараў. Маленькія па плошчы двухпакаёвыя кватэры каштуюць зараз да 35 тысяч долараў. Крыху лепшыя двухпакаёвыя «хрушчоўкі» цягнуць ужо, у залежнасці ад раёна горада, ад 38 да 42 тысяч USD. Адносна новыя прасторныя «двойкі» дасягаюць 45—60 тысяч долараў. Цэны на трохпакаёвыя кватэры ўвогуле ўражваюць, бо вагаюцца ад 40 да 100 тысяч долараў.

Паводле меркавання гомельскіх экспертаў жыллёвай нерухомасці, кошт квадратнага метра жылля агульнай плошчы ўсіх відаў кватэр складае прыкладна каля 900 долараў плюс-мінус 100 пунктаў. Існуюць, праўда, і новабудоўлі, дзе квадратны метр жылля без аддзелкі прапануецца за 700—800 долараў. Галоўным чынам па такім кошце існуюць прасторныя двухпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай жылля 65—80 «квадратаў». На падобнае жыллё попыт у горадзе ўвогуле амаль адсутнічае.

Што будзе з цэнамі на жыллё Гомеля ў бліжэйшыя некалькі месяцаў, не ведае ніхто. Прадаўцы мужна трымаюць найвышэйшую цэнавую планку, а пакупнікі зніклі з рынку і чакаюць хуткіх змен.

Сяргей КУРКАЧ.

З КАГОРТЫ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ. САПРАЎДНЫХ

Сёння старшыні Банка міжнароднага гандлю і інвестыцый Генадзю Станіслававічу Алейнікаву 60 гадоў

1996 год. Г.С. Алейнікаў падчас адкрыцця першага ў Беларусі банкамата Белзнешэканамбанка.

З поўнай мерай адказнасці магу назваць Генадзя Станіслававіча адным з самых багатых, каго я ведаю. Не, багатым не на грошы. А найперш, што больш важна і што асабліва цэніцца, багатым на добрыя справы, на надзейных паплечнікаў і аднадумцаў, на сапраўдных сяброў, на новыя ідэі, прафесійныя задумы, на нястомнасць і настойлівасць у дасягненні пастаўленый мэты. Гэта, на мой погляд, таму, што Г.С. Алейнікаў з кагорты сапраўдных прафесіяналаў, для якіх любімая справа важней за ўсё іншае. Нездарма для яго своеасаблівым дэвізам сталі словы: «Хто хоча працаваць — шукае магчымасці, а хто не жадае — апраўдваецца цяжкасцямі». Яшчэ, бадай, не было такога, каб ён нешта задумаў і не дабіўся свайго. Пра тое сведчыць практычна ўсё ягонае жыццё. Прыклады? Калі ласка.

Г.С. Алейнікаў першым у колішняй Беларусі пераходнага перыяду задумаўся над тым, каб банкі, якія працуюць на беларускую эканоміку, сталі самастойнымі, незалежнымі ад таго далёкага цэнтра, які ўсё кантраляваў і ўсё сам размяркоўваў. Падумаў, памеркаваў, вызначыў, што і як рабіць. І зрабіў. Неўзабаве Белзнешэканамбанк, які раней быў у падпарадкаванні Масквы, стаў самастойным. А хутка і ўся банкаўская сістэма Беларусі пачала эфектыўна працаваць у новых умовах.

Калі гаварыць шчыра, практычна ўся дзейнасць Г.С. Алейнікава ў банкаўскай сферы звязана са словамі «ўпершыню», «першы». Першы ў Беларусі банкамат. Першыя выпушчаныя пластыкавыя карткі. Ягоная настойлівасць вылілася ў тое, што ўпершыню ў банкаўскай практыцы нашай краіны была выкарыстана дылінгавая сістэма REUTERS. Дзякуючы ягонай няўрымслівасці пачала працаваць першая аўтаматызаваная банкаўская сістэма на базе EQUATION.

Ужо аднаго гэтага было б дастаткова, каб назваць Генадзя Алейнікава першапраходцам і прафесіяналам з вялікай літары. А падобных вялікіх і малых спраў, але заўсёды канкрэтных і выніковых, за жыццё, якое практычна цалкам аддадзена любімай банкаўскай справе, у Г.С. Алейнікава было шмат. І тады, калі толькі пачынаў у Мінску сваю банкаўскую кар'еру крэдытным інспектарам Фрунзенскага аддзялення Дзяржбанка СССР. І калі стаў самастойным кіраўніком банкаўскіх структур — Цэнтральнага аддзялення і Мінскай гарадской канторы Дзяржбанка СССР. І на пасадзе старшыні праўлення, а пасля прэзідэнта — старшыні Савета дырэктараў Белзнешэканамбанка. І падчас працы ў складаны для банкаўскай і фінансавай сферы, ды і для ўсёй беларускай эканомікі час старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Не здраджвае свайму прызванню быць першым Г.С. Алейнікаў і сёння. Ён узначальвае створаны ім Банк міжнароднага гандлю і інвестыцый. Калі нараджалася гэтая справа, ініцыятыву Генадзя Станіслававіча падтрымалі не толькі ў органах улады і Нацыянальным банку. Да яе актыўна і дзейсна — сваімі ўнёскамі ў статутны фонд — далучыліся прадстаўнікі фінансавых структур Расіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Кіпра. Руку дапамогі працягнуў і тадышні галоўны расійскі банкір В.У. Герашчанка.

Сёння Банк міжнароднага гандлю і інвестыцый вядомы не толькі ў нашай краіне. Вядомы не адно сваімі справамі, дзелавымі сувязямі з многімі замежнымі партнёрамі, але і тым, што на чале яго стаіць аўтарытэтны кіраўнік, да думкі якога прыслухоўваюцца. Намаганні банка ў справе падтрымкі і развіцця знешнеэканамічнай дзейнасці суб'ектаў гаспадаркі, прыцягнення ў краіну замежных інвестыцый паспрыялі многім прадпрыемствам і прадпрымальнікам Беларусі выйсці на замежныя рынкі, наладзіць уласную імпартазамяняльную і экспартаарыентаваную вытворчасць, што годна стасуецца з выкананнем дзяржаўных праграм у гэтым напрамку. Пра выніковае супрацоўніцтва з банкам маглі б расказаць прадстаўнікі ААТ «Нафтан», РУП «Беларускі металургічны завод», ААТ «Амкадор — Ударнік», ААТ «Трансавіяэкспарт», ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат», ЗП «Белінвестфарм», ТАА «Інтэрсэрвіс», СЗАТ «Мальвіна» і іншыя.

Сёння партнёрамі банка з'яўляюцца многія прызнаныя ў банкаўскай супольнасці інстытуты. З іхняй дапамогай Міжгандальбанк можа вырашаць задачы сваіх кліентаў практычна ў любой краіне. А сам Міжгандальбанк сваёй найпершай задачай лічыць падтрымку рэальнага сектара беларускай эканомікі. І займаецца гэтым настойліва і эфектыўна. Дастаткова назваць толькі адну лічбу, каб пераканацца ў гэтым. За гады дзейнасці банка — са студзеня 1999 года — сукупны ўклад у развіццё беларускай эканомікі склаў на 1 лістапада 1 млрд 265 млн долараў. А што гэта значыць для самой эканомікі Г.С. Алейнікаў добра ведае не толькі як вопытны банкір, але і як заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь.

Хоць і трафарэтна гэта гучыць, але, калі назіраеш за працай, услухоўваешся ў развагі Генадзя Станіслававіча, калі пранікаешся ягоным клопатам, ніколі не падумаеш, што ягоны жыццёвы каляндар адлічыў гэткі знакавы рубеж. Ён, як і заўсёды, у немітуслівым руху, захоплены новымі задумамі і планамі. Разважае і мяркуе так, нібыта толькі што пачынае сваю банкаўскую кар'еру: ніякай стомы. На самай жа справе за ягонымі плячыма практычна трыццаць гадоў, аддадзеных любімаму занятку.

Гэта не для юбілейнай узвышанасці сказана. Праўда, што банкаўская дзейнасць стала не адно жыццёвым выбарам Алейнікава, але і сапраўды любімай і захапляльнай справай. Сам не раз чуў пра гэта ад Генадзя Станіслававіча. У адным з інтэрв'ю ён зазначаў: на тое, што прыносіць задавальненне, ніколі не шкада часу. А ён жа, з яго слоў, усё жыццё займаецца тым, што яму падабаецца. Любімая справа ніколі не дакучае. Ён лічыць яе сапраўды творчай, а гэта дадае энергіі, вострыць розум, шліфуе навыкі. Мо менавіта таму Г. Алейнікаў не адмаўляецца ад напрацаванага вопыту, ад банкаўскіх традыцый, аднак ён ахвотна абапіраецца і на тое новае, што сёння нараджае айчынная і замежная банкаўская практыка.

Яшчэ адной адметнай рысай валодае Г.С. Алейнікаў. Ён любіць і ўмее працаваць з камандай. Таму заўсёды старанна і дбайна падбірае тых, з кім мае намер увасабляць свае задумы ў жыццё. Так і зараз — у Банку міжнароднага гандлю і інвестыцый сабраўся не толькі калектыў прафесіяналаў сваёй справы, але і людзей, з'яднаных адной мэтай, агульнай справай.

Свае адносіны з супрацоўнікамі Г.С. Алейнікаў будуе як з аднадумцамі. Мне імпануе ягонае разуменне таго, якую небяспеку для кіраўніка тоіць спакуса быць ісцінай у апошняй інстанцыі. Ён падкрэслена робіць акцэнт на ўзаемазалежнасці і ўзаемаадказнасці ў дасягненні агульнай мэты, якую, як я пераканаўся, падзяляюць усе супрацоўнікі банка. Інакш яны не лічыліся б адной камандай. А сёння з пэўнасцю можна сказаць, што кіраўніку банка сапраўды ўдалося падабраць каманду аднадумцаў. Адны працуюць тут з моманту стварэння банка, іншыя прыйшлі пазней. Але ўсе яны — спецыялісты высокага класа, якія ўмеюць адгукацца на патрэбы часу і кліентаў. Камандная ж праца здольна прыносіць большы эфект і дае больш значныя вынікі. У гэтай сувязі банк стаў шмат увагі надаваць стылю і метадам працы ў рэгіянальных аддзяленнях і іншых падраздзяленнях, якія створаны ў большасці абласцей, у многіх эканамічна перспектыўных рэгіёнах. Аднак і ў цэнтры, і на месцах супрацоўнікі банка аднолькава зацікаўлена ставяцца да любога кліента — фізічнай асобы ці простага чалавека, прапануюць яму самыя сучасныя банкаўскія прадукты і паслугі. А гэта дазваляе дабівацца сапраўды высокіх вынікаў. Нездарма Міжгандальбанк па сваіх галоўных паказчыках заўсёды ў першай дзесятцы сярод банкаў краіны...

Старшыня банка давярае сваім супрацоўнікам як прафесіянал прафесіяналам. І разлічвае (не беспадстаўна) на ўзаемнасць.

Так было цягам усёй дзейнасці Г.С. Алейнікава. Так ёсць і цяпер.

Нягледзячы на тое, што сёння субота і працоўны люд вольны ад службовых абавязкаў, не сумняваюся, што тэлефон у Г.С. Алейнікава не будзе змаўкаць. Бо не адно блізкія сябры, але і шмат-шмат хто з банкаўскіх работнікаў, фінансістаў нашай краіны і замежжа, прадстаўнікоў сацыяльнай сферы, культуры і спорту, якім банк аказвае пастаянную спонсарскую дапамогу, ведае: сёння ў іхняга калегі, настаўніка, сябра, паплечніка — старшыні Банка міжнароднага гандлю і інвестыцый юбілей. «Пажыццёваму банкіру», як часам жартуюць калегі, сёння шэсцьдзесят.

З юбілеем вас, Генадзь Станіслававіч!

Анатоль БУТЭВІЧ.

P.S. *Як стала вядома, рашэннем Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Г.С. Алейнікаў узнагароджаны нагрудным знакам «Ганаровы работнік банкаўскай сістэмы Беларусі».*

А напярэдадні юбілею Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ўручыў Г.С. Алейнікаву ордэн Беларускай праваслаўнай царквы Свяціцеля Кірылы Тураўскага II ступені.

Прыемнае паведамленне і адпаведны дыплом прыйшлі з Кембрыджа. Рашэннем міжнароднага біяграфічнага цэнтра Г.С. Алейнікаў залічаны да дзвюх тысяч вядомых інтэлектуалаў XXI стагоддзя за выдатны ўклад у развіццё банкаўскай сферы.

Кватэрнае пытанне

АХОЎВАЕЦЦА ДЗЯРЖАВАЙ

Зараз шмат у каго ва ўласнасці знаходзяцца па 2—3 і больш кватэр (або асобных індывідуальных дамоў і кватэр). Якія для гэтага могуць быць законныя падставы і ці не супярэчыць гэта Канстытуцыі?

М. КАСТРОЎ, *г. Віцебск.*

Наяўнасць ва ўласнасці грамадзяніна некалькіх жылых памяшканняў з'яўляецца законнай, калі правы ўласнасці на іх набыты на законных падставах. Такімі падставамі ў адпаведнасці з артыкулам 102 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца:

прыватызацыя займаемага на ўмовах дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду;

афармленне права ўласнасці на жылое памяшканне членам арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў (ЖБК, ЖК, МЖК, КІЗ);

прыняцце жылога памяшкання ў спадчыну;

ажыццяўленне грамадзянска-прававых здзелак (купля-продаж, дарэнне, мена жылых памяшканняў і інш.);

будаўніцтва жылога дома, часткі жылога дома, кватэры;

перадача ім жылога дома, кватэры ва ўласнасць замест знесенага жылога дома ў сувязі з адабраннем зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб;

па іншых падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкулам 101 Жыллёвага кодэкса вызначана, што грамадзяне могуць мець на праве ўласнасці жылыя дамы, кватэры і іншыя жылыя памяшканні без абмежавання іх колькасці і памеру.

Указаныя нормы Жыллёвага кодэкса, як і ўсё жыллёвае заканадаўства, грунтуюцца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (артыкул 2 ЖК). Дзяржава гарантуе кожнаму права ўласнасці і садзейнічае яе набыццю. Уласнасць, набытая законным шляхам, ахоўваецца дзяржавай (артыкул 44 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

У той жа час, ажыццяўленне права ўласнасці не павінна супярэчыць грамадскай карысці і бяспецы, наносіць шкоду навакольнаму асяроддзю, гісторыка-культурным каштоўнасцям, ушчамляць правы і інтарэсы іншых асобаў, якія ахоўваюцца законам.

Віктар САВІЦКІ.

Храмы Беларусі

10 ГАДОЎ ЧАКАННЯ

10 гадоў чакалі гэтага дня знаўцы беларускай духоўнай, гісторыка-культурнай і архітэктурнай спадчыны, праваслаўныя вернікі, прыхаджане Свята-Мікалаеўскай царквы (гісторыя святыні была расказана ў «Звяздзе» 22 жніўня), што ў вёсцы Станькава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. 16 кастрычніка 2007 года пасля малебна, які здзейсніў іерэй Аляксандр Мікіцкі, настаяцель прыхода, ва ўрачыстай абстаноўцы пры вялікай колькасці вернікаў ва ўнутраную сцяну храма была пакладзена першая цагліна. На ёй залатымі літарамі напісана: «Сей кирпич первым был положен в стену храма сего, в память о его воссоздании, в назидание благодарным потомкам, числа 16, месяца октября, года 2007 от Рождества Христова».

З гэтага моманту пачаліся рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. Зараз ідзе кладка цэглы ў паўночным прыдзеле і ўсходняй апсідзе.

Усе работы па адраджэнні царквы знаходзяцца на асобым кантролі самога Мітрапаліта Філарэта. За апошнія паўгода Патрыяршы Экзарх уся Беларусі чатыры разы наведаў храм.

Да канца года прыходам плануецца цалкам адрэстаўраваць паўночны прыдзел і алтарную апсіду і пачаць узводзіць чатыры калоны цэнтральнай малельнай залы, што сімвалізуюць сабой чатырох евангелістаў, Матфея, Марка, Луку і Іаана. У адну з калон будзе закладзена капсула з імёнамі ўсіх ахвярадаўцаў і фундатараў храма, якіх ужо 15 тысяч чалавек, і з гісторыяй узвядзення храма ў XIX ст., яго разбурэння і адраджэння. Імёны ахвярадаўцаў пішуцца на імянных цаглінах, што закладваюцца ў сцены царквы, няспынна згадваюцца ў малітвах на богаслужэннях, на малебнах каля магілы блажэннай матушкі Валянціны Мінскай і па адраджэнні святыні будуць вечна гучаць у сценах храма на многія гады.

Свята-Мікалаеўскі праваслаўны храм
222731 в. Станькава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Р/с 3015000460014
г. Дзяржынск, філ. 606 УНП 600470110
ААТ «ААБ Беларусбанк», код 514.

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ.
Фота аўтара.

Свая справа

РАЎБІЧЫ — ПРЫСТАЛІЧНЫ «КУРШАВЕЛЬ»?

У адносінах да Раўбіч у многіх склалася дакладнае адчуванне, якое звязвае гэтыя мясціны са спартыўным комплексам. І толькі. Магчыма, гэтаму паспрыяў адпаведны «піяр», паколькі даволі часта тут праводзяцца спаборніцтвы самага рознага ўзроўню. Такія падзеі, што называецца, ва ўсіх на вуснах, таму ўласна пра тутэйшыя населеныя пункты амаль не ўзгадваюць, лічачы іх «краінай прэстыжных дач». Між тым, шалёны попыт на гэтую тэрыторыю пачаўся адносна нядаўна — некалькі гадоў таму тут распачалося масавае «катэджнае» будаўніцтва.

А чым яшчэ цікавыя Раўбічы? Шчыра кажучы, ніколі над гэтым і не задумваўся, вартымі асаблівай увагі для гасцей. Як аказалася, дарэмна, паколькі ў кожным на першы погляд «звычайным» месцы заўсёды можна знайсці сваю «фішку». Так і з Раўбічамі, лічыць Эдуард Ганчароў. Гэты чалавек уладкаваўся тут ужо больш чым восем гадоў таму. А дагэтуль Ганчароў ўдосталь навандраваўся па свеце. Па нацыянальнасці ён рускі, нарадзіўся і доўгі час жыў з бацькамі ў Ташкенце. З 1986-га — у Гомелі, дзе быў чатыры гады. Пасля эміграваў: спачатку ў Ізраіль, а затым пераехаў у Будапешт. У Венгрыі Эдуард знаходзіўся даволі доўга, аднак напрыканцы 1990-х вырашыў вярнуцца ў Беларусь. Чаму менавіта сюды? «Гомельскія» ўспаміны аказаліся надзвычай цёплымі, добразычлівымі, гэта і аказала ўплыў на выбар. «У ідэале трэба заўсёды імкнуцца да таго, каб жыць дома, там, дзе ты камфортна сябе адчуваеш», — заўважае Ганчароў.

Пра адметнасць гэтых мясцін Эдуард ГАНЧАРОЎ здольны расказваць гадзінамі.

Аднак дакладна вызначыць «кропку» аказалася не так проста — давялося «перабраць» шмат самых розных месцаў, сярод якіх былі і Блакітныя азёры, і іншыя выдатныя краі. Адноўчы ён трапіў на тутэйшую дамбу, агледзеўся навокал і неяк нечакана хутка вырашыў: тое, што патрэбна. Так скончыліся пошукі. Ганчароў тлумачыць, што такім чынам проста імкнуўся вырашыць жыллёвае пытанне. Паколькі не лічыў сябе гарадскім жыхаром («для пробы» аказалася дастаткова некалькі месяцаў здымаць кватэру ў Мінску), то шукаў варыянты для ўласнага дома. І знайшоў даволі ўдалае рашэнне: за 500 долараў набыў участак і пачаў будавацца.

— За восем гадоў на маіх вачах адбыліся значныя змяненні ва ўсведамленні і раптам Раўбічы ператварыліся ў нейкі самы сапраўдны брэнд, — заўважае Ганчароў. — Пачалі казаць пра тое, што гэта наша «Рублёўка», тутэйшы «Куршавель».

Між тым і геаграфічна вызначыць адпаведныя мясціны недасведчанаму чалавеку даволі складана, паколькі тут размешчаны некалькі населеных пунктаў, якія смела можна адносіць да «папулярнага» месца. Гэта ўласна сама вёска Раўбічы, а таксама Аколіца, Губічы, Крысцінава. Усе іх мы па чарзе і аб'ехалі, разглядаючы адметнасці сучаснай катэджнай забудовы. Відовішча, паверце, вартае таго, каб распрацаваць спецыяльны экскурсійны маршрут. Калі будзе вопытны «гід», які ў курсе ўсіх мясцовых навін, то попыт гарантаваны. Дамоў тут не вельмі многа (дзесьці каля трох сотняў), паколькі рэльеф даволі складаны — ёсць узгоркі і лясы. Прычым, што цікава, сустракаюцца даволі глухія мясціны: як узгадваў Ганчароў, аднойчы дзяўчына, якая падарожнічала на веласіпедзе, завітала ў такую «тайгу» і ўсё здзіўлялася, што літаральна на ўскрайку мегаполіса можна адшукаць запаветныя куткі. На шчасце, яны захаваліся дасюль. Эдуард расказваў, што ў мясцінах, аб'яднаных пад вядомым «геаграфічным брэндам», доўгі час не быў праведзены газ. Абыходзіліся электрычнасцю альбо мазутам. Дзіўны факт, калі ўлічваць вялікую цікаўнасць да Раўбіч.

Спалучэнне прыгожых краявідаў і невялікай адлегласці ад сталіцы і нараджае папулярнасць. Так, дарэчы, было і з маскоўскай Рублёўкай. Ганчароў у Венгрыі разам са знаёмым займаўся экскурсійным турызмам — яны «вярсталі» індывідуальныя туры для гасцей. Адноўчы прымалі дзве сям'і, якія прыехалі адпачываць у Будапешт. Разгаварыліся і аказалася, што турысты займаюцца нерухомасцю ў Маскве. Яны набылі два ўчасткі на Рублёўскай шашы за 7 тысяч долараў, а праз пэўны час прадалі іх за 15 тыс. «зялёных». Частку прыбытку вырашылі выдаткаваць на адпачынак. Эдуард узгадвае гэты выпадак і заўважае, што цяпер 20 сотак на Рублёўцы «важаць» па 1,5—1,8 мільёна долараў. Так нечакана і ўзнікае прэстыжнасць таго ці іншага месца.

Але не ўсе даволі выгадныя ў размяшчэнні месцы, на думку Ганчарова, могуць лічыцца ўдалымі. Непадалёк ёсць адзін з населеных пунктаў (вёскай яго назваць, напэўна, ужо будзе няправільна), які знаходзіцца побач з даволі ажыўленай трасай. Адпаведна, каларыт загараднага жыцця ў такім разе губляецца. З такім жа поспехам можна жыць і ў мегаполісе, навошта тады арыентавацца на ўласны катэдж? Некалькі пунктаў з раўбіцкага «анклава» вабяць іншым — узгоркамі, лесам і вадаёмам. Прыгожае месца, што і казаць. З найбольш высокіх пунктаў відаць усё навакольле. Месцічы заўважаюць, што Дубровіцкае вадасховішча (якое цягнецца больш чым на 8 кіламетраў) чыстае і ў пацвярджэнне прыводзяць наступны аргумент: нават у самыя складаныя па эпідэмічных паказчыках гады санстанцыя яго не забараняе для наведвання. Ёсць тут і рыба, асабліва шмат збіраецца аматараў падлёднай лоўлі. Разам з суседзямі Ганчароў абуладкаваў на ўзбярэжжы добры пляж. Пры жаданні можна наведаць і Вячу — вядомае возера непадалёк.

Асаблівасці тутэйшай архітэктуры.

Эдуард увесь час марыў паказаць любімыя месцы гасцям, зрабіць Раўбічы прывабным пунктам на турыстычных маршрутах. А чаму б і не? Паводле яго слоў, нашматлікіх гасцей вельмі разгалінаваная і дагледжаная, у яе ўдасканаленне інвестуюцца значныя сродкі. У Беларусі вялікі патэнцыял агратурызму, які здольны стаць стымулам для развіцця тэрытарый, забяспечыць альтэрнатыўную занятасць, прадставіць новыя працоўныя месцы. Вельмі важна і тое, што да гэтай перспектыўнай справы гатовыя актыўна падключыцца (і падключаюцца ўжо) прыватнікі.

Ганчароў рыхтуецца да прыёму турыстаў, завяршае ўладкаванне сядзібы. Сам будынак плануе зрабіць адной з сапраўдных «фішак» адпачынку, абсталяваць у лепшых сярэдневяковых традыцыях. Высокія столі ў пакоях, вялікая, прасторная гасцёўня, прыгожыя балкончыкі, мэбля ў стылі рэтра — адным словам, гасцям будзе забяспечаны самы камфортны адпачынак. Плануецца арганізаваць дастаўку, а таксама прапанаваць розныя прысмакі. Варыянтаў для таго, каб з карысцю бавіць вольны час, будзе шмат. Ганчароў мяркуе цесна супрацоўнічаць са спарткомплексам: такім чынам можна арганізаваць тыя паслугі, якія я ў прынцыпе арганізаваць не магу, паколькі ў межах адной сядзібы зрабіць усё ў прынцыпе немагчыма». Так што ў бліжэйшай перспектыве зусім непадалёк ад мегаполіса з'явіцца яшчэ адзін маршрут, які я для сябе назваў «нечаканыя Раўбічы». Няўжо не заінтрыгуе?

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
Мінскі раён.

ПАВАЖАНЫЯ ПАДПІСЧЫКІ «ЗВЯЗДЫ»!

Як і раней, газета будзе праводзіць розыгрыш прызоў сярод тых, хто застаецца верным адзінаму штодзённаму, старэйшаму беларускамоўнаму выданню. Купон удзельніка гульні і яе ўмовы будуць надрукаваны ў самы бліжэйшы час, адразу пасля рэгістрацыі ўмоў гульні ў Міністэрстве гандлю Беларусі. Усяго мы маем намер разыграць сярод тых, хто падпісаўся на першае паўгоддзе ці 2-і квартал 2008 года, звыш 50 прызоў. Сярод іх — халадзільнік «Атлант», каляровы тэлевізар «Віцязь», мікрахвалевая печ «Гарызонт», а таксама шэраг больш дробных прызоў.

Заставайцеся з намі!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | лі-тар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | Колькасць камплектаў

пераад-расоўкі _____ руб.

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Пыталіся — адказваем

Крэм без кансервантаў — рай для мікробаў

Я вельмі ахвотна карыстаюся парфумерна-касметычнымі сродкамі беларускіх вытворцаў. Аднак калі пачынаю чытаць этыкеткі, то становіцца неяк не па сабе: эмульгатары, кансерванты, эмаленты... Проста нейкая хімічная лабараторыя. А ў якасці біялагічна актыўных дабавак нярэдка выкарыстоўваюцца зусім экзатычныя для беларусаў расліны, напрыклад, экстракт гінкго білоба ці алей макадаміі. Я нават не ведаю, што гэта за расліны...

Таццяна ВІТКОЎСКАЯ, *Лясніжскі раён.*

Вытворчасць касметычных сродкаў і сапраўды настолькі складаная, што разабрацца ў ёй непрафесіяналам вельмі праблематычна. Таму паведамляем, што эмульгатары з'яўляюцца абавязковым кампанентам касметычных крэмаў эмульсійнага тыпу і ў значнай ступені вызначаюць іх кансістэнцыю і аднастайнасць структуры. Справа ў тым, што пры змешванні вады і алею (а алей выкарыстоўваецца ў якасці асновы касметычных сродкаў) утвараецца вельмі нестабільнае асяроддзе. Дзякуючы асаблівасцям сваёй пабудовы, эмульгатар размяшчаецца на мяжы алейнай і воднай фаз, утвараючы тонкую праслойку паміж фазамі і перашкаджаючы тым самым зліццю ўзважаных кропляў. Эмульгатары стабілізуюць эмульсію і папярэджваюць яе расслаенне. Да таго ж у алейную фазу касметычных сродкаў абавязкова ўключаюцца эмаленты. Эмаленты — гэта ліпафільныя рэчывы, якія валодаюць уласцівасцю фіксавацца ў рагавым слоі эпідэрміса, надаючы скуры гладкасць і аксамітнасць. У якасці эмалентаў могуць выкарыстоўвацца тлустыя спірты, воскі, складаныя эфіры, ланалін, натуральныя тлушчы і алей, а таксама сіліконавыя спалучэнні. Дарэчы, добра вядомыя нам пчаліны воск і рыцына таксама з'яўляюцца эмалентамі.

На жаль, але крэмы з натуральнымі тлушчамі маюць невялікі тэрмін захоўвання, у той час як крэмы з сінтэтычнымі заменнікамі «жывуць» значна больш. Таму многія вытворцы аддаюць перавагу апошнім. Але ні першыя, ні другія не могуць абысціся без выкарыстання кансервантаў, якія папярэджваюць размнажэнне ў пажыўным асяроддзі крэмаў розных мікраарганізмаў. Трэба ўлічваць, што большасць метадаў стэрылізацыі, якія выкарыстоўваюцца ў харчовай вытворчасці, непрыдатныя для касметычнай вытворчасці, паколькі тыя ж крэмы выкарыстоўваюцца не некалькі дзён, а на працягу некалькіх месяцаў з парушэннем усіх правілаў стэрыльнасці. Кансерванты ўключаюцца ў касметычныя сродкі ў мінімальнай канцэнтрацыі, пры якой яны захоўваюць эфектыўнасць супраць мікробаў, але нетаксічныя для скуры. Да натуральных кансервантаў адносяцца пропаліс, экстракты эўкаліпту, чаромхі і бярозы.

Цяпер аб экзатычных раслінах. Экстракт гінкго білоба атрымліваюць з лісця трапічнага дрэва, якое расце ў Паўднёвай Амерыцы. Яно валодае антырадыкальным і імунастымулюючым дзеяннем, таму часта выкарыстоўваецца ў сродках, прызначаных для амаладжэння скуры. Алей жа макадаміі забяспечвае скуру поліненасычанымі кіслотамі і ліпідамі, неабходнымі для гарманізацыі дыхання, абмену, аховы і аднаўлення энергетычнага рэзерву скуры.

Інфармацыю для спажыўцоў цяпер убачыць кожны

З пачатку кастрычніка ў Беларусі ўступіла ў дзеянне новая рэдакцыя стандарта «Харчовыя прадукты. Інфармацыя для спажыўцоў. Агульныя патрабаванні».

Гэты стандарт распрацоўваўся з улікам сучасных патрабаванняў, новых тэхналогій, новай сыравіны і матэрыялаў, а таксама пажаданняў спажыўцоў і юрыдычных асобаў. Сярод асноўных новаўвядзенняў варта адзначыць забарону наносіць на харчовыя прадукты надпіс «экалагічна чысты» па прычыне адсутнасці крытэрыяў ацэнкі і метадаў кантролю. Не дапускаецца таксама прыпісваць прадукту асаблівыя ўласцівасці, у тым ліку лячэбныя, якімі ён не валодае. Найменне прадукту, у тым ліку інфармацыя аб спецыяльнай апрацоўцы прадукту, павінны выкладацца шрыфтам велічынёй не менш як 2 мм, а тэкст не павен размяшчацца на некантрастным фоне, каб спажывец мог яго прачытаць. Галоўнае, да чаго імкнуліся аўтары новаўвядзення, гэта каб вытворцы больш не ўводзілі пакупнікоў у зман. І калі спажывец купляе раслінна-сметанковае ці сметанкова-раслінае масла, то слова «раслінае» не павінна знікаць з упакоўкі. Абодва словы (і «сметанковае», і «раслінае») павінны наносіцца на маркіроўку шрыфтам аднолькавага памеру і аднолькава добра чытацца. У дапрацаваным стандарце з'явіліся таксама новыя тэрміны: «біялагічна актыўная дабаўка», «генетычна мадыфікаваны харчовы прадукт», «фасаваны харчовы прадукт» і некаторыя іншыя. Акрамя таго, на ўпакоўцы абавязкова павінны ўказвацца дата вырабу і тэрмін годнасці (захоўвання) прадукцыі.

З 1 кастрычніка гэтага года ўведзены таксама стандарт на маркіроўку аўдыё- і відэапрадукцыі і прадуктаў праграмнага забеспячэння. Такі дакумент прыняты ўпершыню і скіраваны на прадастаўленне спажыўцу максімальна поўнай інфармацыі аб тавары і на забеспячэнне аўтарскіх правоў. Таксама з 1 кастрычніка ў краіне ўведзены стандарт па маркіроўцы піктаграмамі і сімваламі матэрыялаў верху, падкладкі і падэшвы абутку. Справа ў тым, што з-за вялікай разнастайнасці матэрыялаў апошнім часам стала складана візуальна вызначыць састаў матэрыялаў, што прымяняюцца пры пашыве абутку.

Сёння актыўнымі тэмпамі ў краіне фарміруецца нарматыўная база, якая дазволіць развіваць працэс экалагічнай сертыфікацыі канкрэтных відаў прадукцыі. Па яе выніках на прадукцыю будзе наносіцца знак адпаведнасці, які пацвярджае, што дадзеная прадукцыя на працягу свайго жыццёвага цыкла адпавядае экалагічным крытэрыям і аказвае найменшае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Першая «ластаўка» — гэта стандарт, які ўстанаўлівае экалагічныя крытэрыі да сінтэтычных мыйных сродкаў. Ён быў уведзены 1 жніўня гэтага года, а з кастрычніка пачаў дзейнічаць таксама стандарт, які ўстанаўлівае экалагічныя крытэрыі да халадзільнага абсталявання. У лістападзе ўступіць у дзеянне стандарт, які ўстанаўлівае экалагічныя крытэрыі да шпалераў. Ужо распрацаваны праект аналагічнага стандарта і на тэлевізары.

Згодна з комплекснай праграмай стандартызацыі харчовай прадукцыі на 2007—2010 гады да канца 2010 года ў Беларусі ў галіне вытворчасці харчовай прадукцыі павінны быць распрацаваныя 188 стандартаў, у тым ліку 118 новых і 70 — узамен састарэлых, што дазволіць адмяніць больш як 350 дзеючых на дадзены момант тэхнічных умоў. З 1 кастрычніка ўведзены ў дзеянне стандарты на малако і прадукты перапрацоўкі малака, прадукты масларобства і сыраробства. Адзіныя тэрміны і патрабаванні да класіфікацыі таксама плануецца ўстанавіць да сокавай прадукцыі, мясных прадуктаў, жывёльнага масла і спрэдаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 16 (28)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У кандытараў — навагодні настрой

Рыхтаваць свае навагоднія калекцыі айчынныя кандытарскія прадпрыемствы «Спартак» і «Камунарка» распачынаюць яшчэ задоўга да таго, як у пераважнай большасці беларусаў абудзіцца навагодні настрой — усё ж такі камплектацыя баўльчыкаў адбываецца ўручную і патрабуе карпатлівай работы і сур'ёзнай увагі. Не сакрэт, што менавіта навагоднія святы для кандытараў самыя «ўраджайныя», таму трэба паклапаціцца загадзя і пра арыгінальны дызайн, і пра размяшчэнне заказаў на святочную ўпакоўку, і пра абнаўленне асартыменту.

Сталічная «Камунарка» плануе падрыхтаваць сёлета 1,1 млн салодкіх навагодніх падарункаў больш як 20 найменняў і вагой ад 300 грамаў да 2,5 кілаграма. Улічваючы, што наступны год па Усходнім календары — гэта год Мышы або Пацука, то частка навагодніх падарункаў выраблена ў выглядзе мяккіх цацак: «Вясёлае мышаня» (2 кг), «Мышкін сыр» (1,5 кг), «Мышка-модніца» (1 кг).

Ужо ў лістападзе ў продажпачалі паступаць наборы шакаладных цукерак у святочным афармленні: «Навагодняя ноч», «Навагодні танец», «Зімовая казка», «З калядамі», «Калядная тайна» і «Навагоднее прызнанне».

Святочная калекцыя «Спартака» таксама налічвае больш за два дзесяткі найменняў. Што датычыцца ўпакоўкі, то гэта не толькі маляўнічыя кардонныя хаткі, замкі, сундучкі, кніжкі, але і бляшанка з акенцам, мяккая сумка ў выглядзе парасяці, рукзачок у выглядзе мышы, а таксама мяккія цацкі з футра «Мышка Машанька» (1,5 кг) і «Мышаня Макс» (1 кг).

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАРОЛЬ ГРЫБОЎ — УНІВЕРСАЛ ЗДАРОЎЯ

Ш — шы... Адразу і не вымавіш назву незвычайнага грыба. Шыітаке. Існуе цэлая навука пра лячэнне каштоўнымі грыбамі. Яна мае назву фунгатэрапія. Невядомы многім грыб — шыітаке лічыцца «кладоўкай» карысных для здароўя рэчываў. Гэтыя японскія драўняныя грыбы вырошчваюць на продаж і ў нашай краіне. У прыватнасці, у Гродзенскай, Гомельскай абласцях, ды і ў Віцебскай ёсць некалькі вытворцаў гэтага грыба. Можна яго вырошчваць, пасадзіўшы на цуркі дубу. Праз некалькі месяцаў атрымаеш добры ўраджай.

Грыб можа паніжаць артэрыяльны ціск, ёсць даследаванні пра тое, што ён нават пазбавіў чалавека ад алергіі. Упершыню пра гэты грыб я даведаўся ад дырэктара адной з піцерскіх спецыялізаваных фірмаў Ірыны Філіпавай, якая прысутнічала на віцебскім форуме з удзелам спецыялістаў па лячэнні нетрадыцыйнымі метадамі. Паводле яе слоў, многія зоркі на Захадзе ўжо даўно п'юць гарбату з шыітаке, бо ў ліку іншага грыб пазбаўляе ад стомленасці, дае вялікі зарад энергіі. Мае знаёмыя народныя лекары таксама частуюць кліентаў карысным грыбам. А адзін дачнік на прысядзібным участку паспяхова вырошчвае. Лячыцца прыходзяць да яго не толькі суседзі.

На працягу тысячагоддзяў у Кітаі і Японіі шыітаке вядомы як універсальны лячэбны сродак. У гэтых краінах яго называюць каралём грыбоў. А на выгляд ён нагадвае сыраежку.

Калі проста націраць скуру нарэзаным грыбам, жанчыны змогуць адчуць «другую маладосць». Ды і мужчынам карысна, бо скура будзе «лягчэй дыхаць», бадзёрасць усяму целу гарантавана.

Што датычыцца дыябету, шыітаке можа паніжаць цукар у крыві. Карысны пры захворванні печані, ішэмічнай хваробе, пры павышаным утрыманні халестэрыну і г.д. Наогул, сардэчнікам падыдзе гэты вельмі карысны грыб.

Традыцыйнае пытанне чытачоў: а як вырошчваць, дзе ўзяць? Можна набыць заражаныя міцэліем грыба цуркі, на якіх без праблем на працягу гадоў 5 вы атрымаеце добры ўраджай. Астравецкі лясгас у Гродзенскай вобласці ў свой час аб'явіў пра пачатак дзейнасці ў гэтай сферы. А лепш за ўсё знайдзіце клубы, што аб'ядноўваюць садаводаў, дачнікаў, яны ўжо, напэўна, дапамогуць знайсці тое, што вас цікавіць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Сімвалы догляду адзення

- — выраб можна прасаваць
- — выраб трэба прасаваць слаба нагрэтым прасам (тэмпература 90—120 градусаў)
- — выраб трэба прасаваць прасам, нагрэтым да тэмпературы 100—130 градусаў
- — выраб можна прасаваць моцна нагрэтым прасам (да тэмпературы 160—200 градусаў)
- — выраб прасаваць нельга
- CI — дапускаецца прымяненне хлоразмяшчальных адбельвальнікаў
- — дапускаецца прымяненне хлоразмяшчальных адбельвальнікаў (той жа сэнс)
- — не дапускаецца прымяненне хлоразмяшчальных адбельвальнікаў
- — выраб можна сушыць у пральнай машыне з цэнтрыфугай
- — забараняецца сушыць у пральнай машыне з цэнтрыфугай
- — выраб можна сушыць у падвешаным стане на вяроўцы
- — выраб можна сушыць у падвешаным стане, выкручваць нельга
- — выраб можна сушыць, расправіўшы на роўнай паверхні
- P — дапускаецца чыстка ў перхлорэтане і ўайт-спірыце
- A — дапускаецца чыстка ва ўсіх растваральнікаў
- F — дапускаецца чыстка ва ўайт-спірыце
- — хімічная чыстка вырабу забароненая
- — выраб можна мыць рукамі ці ў пральнай машыне
- — выраб нельга мыць
- — выраб можна мыць рукамі. Карыстацца пральнай машынай забараняецца
- 40° — выраб трэба мыць пры тэмпературы вады, пазначанай на сімвале. Калі ўказана тэмпература 95 градусаў, гэта азначае, што выраб можна кіпяціць
- — выраб нельга выкручваць
- — дапускаецца сухая чыстка вырабу.

Грашовы рэсурс

«ААБ БЕЛАРУСБАНК»

АТРЫМАЎ ВЫГАДНЫ ЗАМЕЖНЫ КРЭДЫТ

Старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Надзея Ермакова абмеркавала з прадстаўнікамі банкаў-арганізатараў сіндыкаванага крэдыту вынікі паспяховага завяршэння здзелкі.

Яшчэ ў верасні ў Лондане адбылося падпісанне пагаднення аб прыцягненні сіндыкаванага крэдыту для ААТ «ААБ Беларусбанк» у памеры 105 мільёнаў долараў. Гаворка ідзе пра другую падобную здзелку ў гэтым годзе (аб'ём першай склаў 38 мільёнаў долараў). Арганізатарамі нядаўняга крэдыту выступілі Banco Finantia (Партугалія), Bayern LB і Commerzbank (Германія), ААТ «ВТБ» (Расія) і VTB Europe plc (Вялікабрытанія). Рэсурсы прадастаўлены на адзін год з магчымасцю працягнення на аналагічны тэрмін. Крэдыт стаў найбольш прывабным для пазычальнікаў і па аб'ёме, і па кошце прыцягнення.

Падчас вышэйпамянёнай сустрэчы Надзея Ермакова выказала спадзяванне аб працягненні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў наступным годзе. Магчыма, нават у новых формах і пашыраным складзе (з удзелам кітайскіх партнёраў, напрыклад).

— Прыцягнутыя ў верасні грошы ўкладзены ў добрыя, надзейныя праекты па развіцці нафтахімічнай, газавай, энергетычнай і іншых галін, — адзначыла Надзея Ермакова. — Эканоміка нашай краіны развіваецца, будуюцца новыя прадпрыемствы, ажыццяўляецца рэканструкцыя і тэхнічнае пераўзбраенне прамысловых прадпрыемстваў, той жа будаўнічай галіны. І гэта патрабуе дадатковых крэдытных рэсурсаў. «ААБ Беларусбанк» працуе на міжнародным фінансавым рынку з 1996 года, і з таго часу аб'ёмы пазык істотна ўзраслі. Няводны з плацяжоў не быў пратэрмінаваны. Што датычыць цяперашняга крэдыту, то мы вернем яго на працягу года і будзем праводзіць работу па прыцягненні новага, на больш працяглы тэрмін і ў аб'ёме, пра які пакуль заўчасна гаварыць. Мяркуецца, што ў наступным годзе нам удасца прыцягнуць сіндыкаваны крэдыт аб'ёмам не менеш за 100 мільёнаў долараў...

Намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Уладзімір Новік зазначыў, што акрамя ўласна ўкладаў насельніцтва банк цяпер атрымлівае рэсурсы і ад замежных фінансавых інстытутаў. Фарміраванне станоўчага іміджу краіны і яго галоўнага банка ў свеце дазваляе Беларусі атрымліваць замежныя крэдыты без гарантый і закладу — на ўзроўні высокага палітычнага і дзелавога даверу. Сёлета такім чынам былі прыцягнуты прыкладна 300 мільёнаў долараў.

Супрацоўніцтва ААТ «ААБ Беларусбанк» з Bayern LB працягваецца крыху больш за два гады. Паводле слоў яго старэйшага віцэ-прэзідэнта Ульрыха Матанена, Bayern LB з'яўляецца адным з лідараў-арганізатараў сіндыкаваных крэдытаў у свеце. «Нас цікавіць найперш доўгатэрміновае супрацоўніцтва, — кажа Ульрых Матанен. — І асабіста я з вялікім аптымізмам гляджу на падобныя перспектывы ў вашай краіне. Што датычыць планаў ужо на наступны год, то пакуль даволі цяжка гаварыць аб чымсьці канкрэтным. Вы бачыце, якая няпростая сітуацыя склалася на міжнародных рынках. Я працую ў банкаўскай галіне звыш 30 гадоў, але ніколі не сутыкаўся з тым раскладам, які існуе зараз. Тым не менш, я схільны глядзець у будучыню з аптымізмам. Мяркую, што да сярэдзіны наступнага года фінансавы рынак стабілізуецца, і мы зможам працаваць у нармальных умовах. Наш банк рады аказаць падтрымку Беларусі, яе вядучаму банку і нават шэрагу яго канкурэнтаў — для здаровай сітуацыі ў галіне грашовых рэсурсаў».

Святлана БАРЫСЕНКА.

Шык-шок

Скажам «не» аголеным пупкам, або Хіты халоднага сезона

Калі імкнуцца ахарактарызаваць модныя тэндэнцыі сезона восень—зіма 2007/2008 адным словам, то слова гэта будзе «стрыманасць». Сезон гэты выглядае строгім, але з глыбакадумным настроем і прыкрытымі сілуэтамі.

Галоўная выснова — адбыўся канчатковы паварот ад мудрагелістых модных тэндэнцый апошніх сезонаў да памяркоўнасці ў кроі і прыглушанасці ў каляровай палітры. Адбылася пераацэнка эстэтычных пераваг — чысты мінімалізм і дакладна вывераны вобраз прыйшлі на зменў праставатаму зачараванню багемы, дзявочым рушам, крыклівай прыцягальнасці аголеных пупкоў і джынсам, якія нізка сядзелі на сцёгнах.

Ключавымі моднымі тэндэнцыямі сезона восень—зіма 2007/2008 з'яўляюцца новы мінімалізм, новы куцюр, новая рамантыка, мужчынскія рысы, васьмідзесятыя. Мінімалізм — хіт гэтага сезона, і тут найперш дамінуе адмова ад дэкора, арнаментаў. Шэра-чорна-белая гама, простыя лініі, прасты і лаканічны сілуэт, адсутнасць дэталяў. Аднак мінімалізм — не асобная тэма, ён магчымы гэтай восенню толькі ў спалучэнні з іншымі тэмамі. Актуальным лічыцца спалучэнне мінімалізму са спартыўнай тэмай ці тэмай космасу, элементы якой ужо зараз актыўна носяць у адзенні і аксесуарах.

У процівагу новаму мінімалізму ў новым сезоне з'явіцца новы куцюр. У адрозненне ад мінімалісцкіх тэндэнцый тут захоўваецца выкарыстанне арнаментыкі, золата, дарагіх тканін з малюнкамі, пераважае белы колер.

Абсалютна заканамерна, што ў эпоху мінімалізму ўвахо-дзіць у моду мужчынскі касцюм, прычым не як фармальная класічная рэч, а менавіта як вострамодная дэталь гардэроба. Сапраўды, што можа быць больш мінімалісцкім і асэксуальным, чым мужчынскі англійскі касцюм?

Тэндэнцыя 80-х будзе актуальнай у маладзёжным сегменце рынку, паколькі няма нічога больш сумнага для моладзі, чым мінімалізм з уласцівым яму стрыманымі колерамі і строгімі сілуэтамі. Асноўная тэма сілуэта — кантраст паміж верхам і нізам. Гэта часцей за ўсё вузкія штаны і мініспадніцы ў спалучэнні з аб'ёмным, як з «чужога пляча» трыкатажам ці жакетам. Каляровая гама яркая, неонавая, да месца нават колеры, якія шакіруюць (фіялетавы, аранжавы, канарэечны), багацце бляску і ўпрыгажэнняў.

Модныя колеры адзення сезона восень—зіма 2007/2008

Для адзення лепш выкарыстоўваць спакойныя нейтральныя тоны з прымессю шэрага колеру. Калі вам не падыходзяць пастэльныя адценні, выкарыстоўвайце класічныя шэры, белы ці чорны колеры.

Галоўныя арнаменты сезона восень—зіма 2007/2008 — скуры, кругі і кропкі, тлустыя палосы, манахромныя набіўкі, драпежнае футра.

Модныя колеры аксесуараў сезона восень—зіма 2007/2008

Паколькі адзенне дастаткова стрыманае, то аксесуары павінны быць больш яркімі і нават агрэсіўнымі. Для аксесуараў ці акцэнтаў у адзенні выкарыстоўвайце пурпурна-вінныя адценні ці сіне-фіялетавую гаму. Актуальныя таксама яркі травяны і нябесна-блакітны колеры. З металічных адценняў выбірайце срэбра і бронзу.

Абутак сезона восень—зіма 2007/2008

Абутак гэтага сезона вельмі аскетычны і напоўнены класічным падыходам да прыгажосці. Прастата ліній, мінімалізм і вытрыманасць каляровай гамы — гэта менавіта тое, што давядзецца нам прымераць у новым сезоне. Зараз у модзе прастата і ніякай легкадумнасці, хутчэй, нават строгасць і сур'ёзнасць. Вобразы класічнай лэдзі, строгай дзелавой жанчыны і каварнай жанчыны-вамп былі прадэманстраваныя на подыумах вядучых мадэльераў. Усе гэтыя тэндэнцыі датычаць і абутку, як неад'емнай і важнай часткі нашага гардэроба.

Паўбоцікі на піку папулярнасці. Яны могуць быць як на абцасе, так і зусім без яго. Перавага аддаецца чорнаму колеру і яго адценням. Часта прысутнічае незвычайная фурнітура. Магчымыя варыянты з глянцавай скурай і замшай, застаецца выбраць тое, што вам па душы.

Боцікі — неад'емная частка асенне-зімовага сезона. У моду ўвайшлі боцікі-батфорты, скура можа быць бліскучай, глянцавай, а можа быць грубай і неапрацаванай. Боцікі з круглым носам і мінімумам упрыгажэнняў з футра і скуры, замшы ці тканіны таксама актуальныя. Простыя чорныя боцікі, вельмі падобныя на армейскія, на маленькім абцасе ці без яго таксама ў модзе. Прысутнічае масіўная грубая фурнітура: рамяні, заклёпкі, спражкі. Вельмі цікавы трэнд — боцікі з вязаным верхам, амаатары паэксперыментаваць гэта абавязкова ацэняць.

Аксесуары, якія дапоўняць наш абутак, вельмі разнастайныя. Шчыльныя матавыя калготкі — надзвычай папулярны трэнд гэтай восенню. Таксама вітаюцца разнастайныя гольфы, легінсы і шчыльныя шкарпэткі. Адценні пераважна чорныя і шэрыя.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

Аддзелачныя будаўнічыя работы будуць сертыфікавацца

Па 11 лістапада ў Беларусі праходзіць Еўрапейскі тыдзень якасці.

Як падкрэсліваюць у Дзяржстандарце Рэспублікі Беларусь, пытанні якасці сёння маюць значэнне не толькі для сферы прамысловасці і гандлю, не менш актуальныя яны і для сферы паслуг, якая развіваецца надзвычай актыўнымі тэмпамі. Галоўны інструмент — сертыфікацыя. Абавязковая сертыфікацыя ахоплівае ў нашай краіне паслугі аўтамотасэрвісу, цырульніцкія паслугі, паслугі па тэхнічным абслугоўванні і рамонце касавых падсумоўваючых апаратаў і спецыяльных камп'ютарных сістэм, турыстычныя паслугі, паслугі па падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, паслугі хімчыстак і паслугі па энергетычным абследаванні арганізацый.

З 1 лістапада гэты пералік дапоўнілі паслугі па вырабе мэблі па індывідуальных заказах (па эскізах і чарцяжах заказчыка) і паслугі пральняў. З 1 снежня абавязковай сертыфікацыі будуць падлягаць паслугі па рамонце і тэхнічным абслугоўванні бытавой радыёэлектроннай апаратуры, электрабытавых машын і прыбораў (суб'ектам гаспадарання ўжо выдадзена больш як 250 сертыфікатаў), а таксама паслугі па рамонце аканечных абаненцкіх устройстваў.

А з 1 студзеня 2008 года ў Беларусі будзе ўведзена абавязковая сертыфікацыя некаторых будаўнічых работ (аддзелачных, шкляных, устройства падлог, дарожных пакрыццяў пешаходных зон з тратуарных пліт, запаўненне аконных і дзвярных праёмаў) і паслуг па рамонце сродкаў вымярэння...

Акцызныя маркі — супраць нелегальнага ўвозу тавараў

З 1 лістапада пералік тавараў, якія абавязаны маркіравацца кантрольнымі знакамі, дапоўнілі тэлевізары, за выключэннем тых, што былі ў спажыванні, пітная і мінеральная вада ў спажывецкай тары, а таксама вадкія мыйныя і пастападобныя сродкі. Кантрольныя маркі, тлумачаць спецыялісты, гэта эфектыўная мера, якая дазваляе кантраляваць аб'ёмы ўвезеных на тэрыторыю нашай краіны тавараў і абараняе айчынных вытворцаў ад нядобрасумленных пастаўшчыкоў, якія не хочуць канкурыраваць на беларускім рынку на законных падставах. Паводле інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах, доля маркіраваных тавараў перавышае 1 працэнт ад ВУП. З 1 сакавіка 2008 года пералік тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы кантрольнымі знакамі, дапоўняць таксама гадзіннікі, харчовы воцат і яго заменнікі ў спажывецкай тары.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ I ПАЎГОДДЗЯ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАШЫМ ЧАРНОБЫЛЮ
Наши калоритные асеродки

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫКАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

СВАЯ СПРАВА
БІЗНЕС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ

ЖЫВАНДОЛЯ

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

КУПІ ЛЕПШАЕ!
ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8800 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 52800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8300 рублёў на месяц 24900 рублёў на квартал 49800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	14000 рублёў на месяц 42000 рублёў на квартал 84000 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12800 рублёў на месяц 38400 рублёў на квартал 76800 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7460 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 44760 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	6990 рублёў на месяц 20970 рублёў на квартал 41940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	9938 рублёў на месяц 29814 рублёў на квартал 59628 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	9431 рубель на месяц 28293 рублі на квартал 56586 рублёў на паўгоддзе

Уважаемые акционеры
ОАО «Борисовбытспецсервис»

27 ноября 2007 года состоится общее собрание акционеров ОАО «Борисовбытспецсервис»

Собрание пройдет по адресу:
г. Борисов, ул. Братьев Вайнрубов, 9.

Повестка дня собрания:

1. ***О внесении изменений в Устав Общества, утвержденный решением общего собрания акционеров 29.03.2007 г.***
2. ***О доизбрании членов наблюдательного совета ОАО «Борисовбытспецсервис».***

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Борисов, ул. Братьев Вайнрубов, 7 (бухгалтерия) с 16 ноября 2007 г. (10.00—16.00) либо 27 ноября по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 16.30 до 16.50 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 27 ноября 2007 года в 17.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!

АБЛІГАЦЫІ «ПРІОРБАНК»: ДРУГІ ВЫХАД НА БІРЖУ

Другі выпуск аблігацый «Пріорбанк» ААТ дапушчаны да размяшчэння на Беларускай валютна-фондавай біржы ў рэжыме «просты аўкцыён».

Тэрмін размяшчэння — па 17 сакавіка 2008-га. Код выпуску аблігацый — BY5200200471, нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі выпуску каштоўных папер — 5-200-02-0090 ад 13.09.2007, намінальны кошт — 100 тысяч рублёў, колькасць — 200 тысяч штук. Аблігацыі 2-га выпуску «Пріорбанк» ААТ дапушчаны да звароту на біржы з уключэннем у каціровачны ліст «А» першага ўзроўню.

Як адзначае дырэктар казначэйства «Пріорбанк» ААТ Святлана ГУЛЬКОВІЧ, біржа лічыцца эфектыўным каналам распаўсюджвання як уласна аблігацый, так і інфармацыі для інвестараў аб рэальных намерах эмітэнта. «Наш інтарэс — у свабодным гандлі аблігацыямі на рынкавых умовах, — кажа яна».

Святлана БАРЫСЕНКА.

Наш культурны асяродак
Жыpандоля
Выпуск № 14 (19).

«EYE»:

вока, якое бачыць усё

Ёсць у нашай краіне чалавек з цікавым і крыху таямнічым імем — Лунет Чарльз Эксанор. Сучаснай моладзі ён добра вядомы, бо менавіта гэты малады чалавек з'яўляецца рэжысёрам і ідэйным лідарам незвычайнага тэатра «EYE». Сапраўднае імя Лунэта Чарльза ведаюць нямногія. Але для нас зроблена выключэнне. Малады, таленавіты і харызматычны Дзмітрый МАСЦЯНІЦА расказвае пра сябе, эксперыментальны тэатр «EYE» і ролю тэатра ў жыцці кожнага з нас.

«Вока» расплюшчылася...

Талент і рэжысёрскія здольнасці Дзмітрыя знайшлі сваю рэалізацыю: стварэнню тэатра «EYE» папярэднічала цэлая гісторыя. «Шчыра кажучы, ідэя стварыць тэатр з'явілася ў мяне яшчэ да паступлення ва ўніверсітэт культуры. Да таго я яшчэ вучыўся ў медыцынскім універсітэце. Праўда, медінстытут я пакінуў на другім курсе... Дык вось, калі я яшчэ быў студэнтам, мы разам з сябрам стварылі свой музычны гурт. І вырашылі суправаджаць свае выступленні перфомансамі. Потым мне стала «цесна» ў межах гэтага праекта. Адтуль і ідэя заняцца тэатрам», — прызнаецца Дзмітрый. Цяпер жа ён працягвае сваё навучанне на завочным аддзяленні Акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці «Рэжысура драмы».

На свет тэатр з'явіўся амаль шэсць гадоў таму. Але гучна заявіў пра сябе некалькі пазней — 13 сакавіка 2004-га. Якраз тады быў пастаўлены першы спектакль — «Insomnia». Спектакль атрымаўся на славу. Пра тэатр загаварылі. Аднак потым было больш за тры гады зацішша...

Года паўтара таму ў клубе «Графіці» акцёры «EYE» зрабілі пастаноўку «Сон Таркvемады» — крыху «перакруцілі» гісторыю пра вядомага іспанскага інквізітара. Распавялі гісторыю пра яго барацьбу з ведзьмамі, хоць насамрэч гэты чалавек забіваў яўрэяў. А потым з'явілася ідэя перанесці тую мініяцюру на вялікую сцэну. Дзмітрый прадумаў сюжэт, паслядоўнасць сцэн. Аўтарам музыкі стаў той самы сябра з медуніверсітэта — Андрэй Прушак, больш вядомы пад імем ND. Дарэчы, ён зараз працуе анестэзіёлагам. Музыка пісалася спецыяльна для новага спектакля. І вясною гэтага года на сцэне маладзёжнага тэатра эстрады публіцы быў прадстаўлены другі спектакль тэатра — «ЗВЕРЬ». Пра тэатр зноў загаварылі: пастаноўка атрымалася сапраўды ўдалая.

За той час, што прайшоў паміж першым і другім спектаклямі, састаў тэатра істотна змяніўся. Многія акцёры перайшлі ў знакаміты тэатр пластыкі «ІнЖэст». Але Дзмітрый да гэтага ставіцца з разуменнем. «Усё гэта толькі яшчэ раз сведчыць пра моцную школу і ўзровень падрыхтоўкі акцёраў у тэатры «EYE». Тым больш, што «ІнЖэсту» — 26 гадоў, а нам — толькі шэсць. І хто ведае, можа, праз 10 гадоў акцёры будуць пераходзіць з іншых калектываў да нас! Таму гэта абсалютна нармальны працэс!» — весела разважае Дзмітрый.

Дарэчы, спачатку назва тэатра пісалася як «І» («ай», англ. «я»), а цяпер — «EYE» («ай», англ. «вока»). «Гісторыя назвы патрабуе нейкай «легенды», але такой легенды ў нас няма, таму і тлумачыць асабліва

няма чаго, — кажа Дзмітрый. — Проста засталася сугучнасць, але змянілася напісанне. Але ўсё ж такі не назва нарадзілася ад ідэі, а якраз ідэя ўзяла свой пачатак ад назвы. Для нас тэатр — гэта спроба паказаць гледачу наш погляд на свет. Прычым не дыктаваць штосьці, а проста разгорнута паказаць карціну».

У 2003 годзе Дзмітрый Масцяніца і Андрэй Прушак ездзілі ў Аўстрыю і прадставілі тэатр «EYE» монаперфомансам. І ў жніўні гэтага года тэатр зноў апыныўся ў Аўстрыі, дзе ўзяў удзел у двух міжнародных фестывалях.

«Вока» эксперыментатараў

Чаму тэатр менавіта «эксперыментальны»? «Насамрэч мы проста імкнёмся працаваць з рознымі методыкамі. Не ў сэнсе, што бяром адну, працуем з ёю, кідаем яе... А ў сэнсе, што мы імкнёмся знайсці для кожнай сцэнічнай формы лепшы метад работы і рэалізацыі», — кажа Дзмітрый.

Падчас працы над спектаклямі і перфомансамі выкарыстаўваюцца элементы танца бута, «сістэма ўсіх сістэм» Станіслаўскага («... і не трэба крычаць, што зараз па Станіслаўскаму немагчыма працаваць. Можна, але патрэбна ведаць, як гэта рабіць!» — каментуе Дзмітрый), некаторыя элементы бяруцца ў Меерхольда (у прыватнасці, біямеханіка, гратэск і празмерная знешняя выразнасць). Часта выкарыстоўваецца методыка форум-тэатра — калі бярэцца звычайная жыццёвая сітуацыя, разыгрываецца перад гледачамі на сцэне, а тыя ў любы момант могуць спыніць акцёраў, дапамагчы ім (дакладней — іх персанажам) і такім чынам вырашыць камплект! Між тым, цікавая і вельмі папулярная на Захадзе методыка. Заслугоўвае ўвагі палунінскі «тэатр без тэатра» — некалькі інсцэніровак, звязаных паміж сабой не сюжэтам, а агульнай атмасферай. Але гэта ўжо бліжэй да перфомансаў. Цікавы метад «рэпетыцый без рэпетыцый»: акцёры збіраюцца на сцэне, нешта спрабуюць рабіць, а потым з гэтага нараджаецца ідэя мініяцюры, ці нават цэлага спектакля! На жаль, многія надтэатральныя методыкі ў Беларусі пакуль што «праходзяць» не так проста...

Акрамя тэатральных пастановак, «EYE» часта ставіць перфомансы і пластычныя мініяцюры. На ліку тэатра такіх прац калі 50. «Праўда, асабіста я не люблю слова перфоманс, бо пад гэта азначэнне можна падвесці ледзь не што заўгодна. Для мяне перфоманс — гэта калі няма дасканалага сюжэту і да тэатра дачынення асаблівага няма, — разважае Дзмітрый. — Свае мініяцюры мы ставім у Мінску і не толькі. Часта нас запрашаюць на вялікія мерапрыемствы. Тады я абавязкова пытаюся, ці ёсць магчымасць «паэкстрэмаліць»: стварыць штосьці незапланаванае і неардынарнае. Так, у Наваполацку мы аднойчы ладзілі «Перфоманс-сквер» — цэлы дзень паміж асноўнай плошчай і стадыёнам артысты весялілі людзей спантаннай творчасцю».

На кубе, на хадулях на сцэне...

Тэатр тэатрам, мастацтва мастацтвам, але ж не ўсім даспадобы творчасць некаторых тэатральных калектываў... «Хіба ж гэта тэатр?!» — абураюцца некаторыя гледачы. «На жаль, такое здараецца. Шкада, безумоўна... Але калі мы жывём у краіне, дзе некаторыя людзі не могуць зразумець і ўспрыняць некаторыя віды мастацтва, то з гэтым даводзіцца лічыцца. Таму асабіста мы імкнёмся злучыць патрабаванні заказчыка са сваімі ўяўленнямі. Тады ад працы атрымліваеш задавальненне, ды і праблем менш...» — выказвае меркаванне Дзмітрый Масцяніца. Дарэчы, пра праблемы Дзмітрый не проста так успомніў: аднойчы неразумненне гледача каштавала аднаму вядомаму тэатру сцэны...

Патрабаванні да артыстаў тэатра ў Дзмітрыя нескладаныя: харэаграфічная падрыхтоўка пажадана, але не абавязкова. Галоўнае, каб у чалавека было жаданне сябе ўдасканальваць. А гэта добра бачна нават на першых занятках. «Калі чалавек прыходзіць да нас і займаецца справай, не губляе ўвагу — гэта «наш чалавек». І яшчэ, прыйсці ў «EYE» — значыць прыйсці ў тэатр. Не на сцэну, а якраз у тэатр, з усімі яго дэкарацыямі, касцюмамі і шматлікімі рэпетыцыямі», — дзеліцца думкамі Дзмітрый.

Да слова, наконт дэкарацый — тэатр «EYE» імкнецца да мінімалізму. Усе неабходныя дэкарацыі да апошняга спектакля лёгка могуць змясціцца ў адным куце: два кубы, балка, падстаўка, прыступкі. Да таго ж, каб мець шмат складаных дэкарацый, патрэбна мець моцны фінансавы базіс. А «EYE» абароты толькі набірае!

Кідаю вокам у кут: сярод іншага тэатральнага «інвентару» тут і хадулі: «А на спектаклі «З ВЕРЬ» здаецца, іх не было...» «Разумееш, проста мы не ставім сваёй мэтай дэманстраваць абсалютна ўсё, што мы ўмеем! Я вось, напрыклад, жанглюваць умею... Наогул, я ўпэўнены, што хадулі — гэта для плошчы, а не для тэатра. Ды і не на кожнай сцэне ёсць магчымасць на іх хадзіць...» — пераконвае мяне Дзмітрый. Дарэчы, навучыцца хадзіць на хадулях не так ужо і складана: у некаторых «навічкоў» тэатра страху перад імі зусім няма, а некаторыя «змагаюцца» з сабою месяц... Усё індывідуальна. Але ад акцёра залежыць многае.

Напрыклад, перад прэм'ерай спектакля «ЗВЕРЬ» артысты займаліся каля 8 месяцаў. Менавіта столькі часу прайшло з моманту прыходу маладых людзей у тэатр да прэм'ернай пастаноўкі. Гэта проста фенаменальны вынік! І гэта — заслуга саміх артыстаў! Хоць, вядома ж, колькі ні займайся, усё роўна будзе мала. Бо тэатр — гэта якраз той від дзейнасці, дзе няма «столі». Удасканальваць спектакль можна заўсёды...

«Лятучая штука»

«Тэатр, перфоманс... яны, як дзеці — усе добрыя, але кожны добры па-рознаму! — упэўнена сцвярджае Дзмітрый, які паспрабаваў сябе і ў тэатральных пастаноўках, і ў перфомансах. — З перфомансам з'яўляецца магчымасць «паэкстрэмаліць». У той жа час тэатр дае магчымасць данесці дакладную ідэю вялікай колькасці гледачоў. Спектакль — гэта вялікая сур'ёзная праца, якая адбірае шмат сілаў. Але я проста ўпэўнены, што тэатр застанецца, нягледзячы ні на што. Чым можна замяніць тэатр? Кіно? Але ў кіно ўсё «за шклом», туды не патрапіш. А добры тэатр дае магчымасць убачыць і перажыць імгненныя пачуцці. Дарэчы, якраз з-за гэтай «імгненнасці» акцёраў тэатра горш запамінаюць. Тэатр — гэта імгненне. Тэатр — гэта тое, што больш не паўторыцца ніколі. Проста такая лятучая штука...»

Алена БАРЫСЕВІЧ.

Адценні і фарбы манахромнай фатаграфіі

У музеі-галерэі «Свет фота» экспануецца не зусім звычайная па сённяшнім часе выстава манахромнай фатаграфіі. Удзельнікі яе, як вядомыя майстры светапісу, ветэраны народнага фатаклуба «Мінск», работы якіх бывалі на выставах самых прэстыжных салонаў свету, — Яўген Казюля, Юрый Васільеў, Сяргей Качаргін, Аркадзь Булва, Віктар Бутра, Валерый Сібрыкаў, так і таленавітыя маладыя аўтары, — Надзея Дзегцярова, Алена Арахоўская і іншыя.

Сучасны глядач прывучаны сёння да яркіх, каляровых сюжэтаў. Але ж менавіта чорна-белы здымак, на думку супрацоўніка музея-галерэі Юрыя Васільева, з большай выразнасцю і эмацыянальнасцю здольны перадаць настрой і змест зафіксаванага моманту. Колер не будзе адцягваць увагу ад асноўнай ідэі здымка.



Сяргей Качаргін. «Нясвіж».

Надзея Дзегцярова. «Без назвы».

Выстава працягнецца да 16 лістапада.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.

Унікальны архіў

ГАЛАСЫ КУПАЛЫ І КОЛАСА — У ІНТЭРНЭЦЕ

Юбілейны год, прысвечаны Янку Купалу і Якубу Коласу, у нашай краіне ўжо адзначаны вялікай колькасцю самых розных святочных мерапрыемстваў, літаратурных гасцёўняў і цікавых экспазіцый. Але на гэтым сюрпрызы не закончыліся. Яшчэ адзін арыгінальны падарунак аматарам творчасці класікаў айчыннай літаратуры зрабіла Дзяржаўная архіўная служба Беларусі — нядаўна ў сетцы Інтэрнэт былі размешчаны рэдкія матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю славутых песняроў.

Праект «Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас. Да 125-годдзя з дня нараджэння» з'яўляецца спецыяльнай юбілейнай рубрыкай Інтэрнэт-рэсурсу архіўнай галіны нашай краіны — сайта «Архівы Беларусі», які размяшчаецца па адрасе http://archives.gov.by. Стваральнікі гэтай віртуальнай экспазіцыі зрабілі, бадай, самую маштабную падборку разнастайных і сапраўды ўнікальных матэрыялаў. Такім чынам спецыялісты імкнуліся адзначыць вялікі ўклад Купалы і Коласа ў развіццё сусветнай культуры і нацыянальнае адраджэнне Беларусі, нагадаць аб іх творчасці і падзеях жыцця, прыцягнуць як мага большую колькасць людзей да знаёмства са спадчынай заснавальнікаў новай беларускай літаратуры.

Вызначальнай рысай праекта з'яўляецца тое, што ён заснаваны ў першую чаргу на дакументальных першакрыніцах.

Віртуальная экспазіцыя дазволіла сабраць разам матэрыялы, якія знаходзяцца ў сховішчах васьмі дзяржаўных архіваў краіны, а таксама ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы і ў Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.

Праект складаецца з двух вялікіх раздзелаў, кожны з якіх, натуральна, прысвечаны асобна Купалу і Коласу. Кожны з іх адкрывае даведку аб асобе і творчасці аўтара. Потым наведвальнік рэсурсу можа трапіць на старонку, дзе сабрана багатая інфармацыя аб першых выданнях твораў аўтара, якія знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. На выставе архіўных дакументаў сабраны рэдкія крыніцы аб жыцці і дзейнасці пісьменнікаў, якія знаходзяцца ў беларускіх і нават замежных архівах. Электронныя копіі зроблены з тэкстаў, фатаздымкаў, гуказапісаў, малюнкаў, чарцяжоў і эскізаў, так што па спецыяльных спасылках можна прагледзець матэрыялы ў поўнамаштабным выглядзе.

Вельмі цікавым спецыялісты лічаць раздзел з аўтографамі, таму што тут многае прадстаўлена для шырокага агляду ўпершыню. Што яшчэ можа надзвычай зацікавіць наведвальнікаў сайта — гэта галасы саміх песняроў: усе ахвотнікі маюць магчымасць паслухаць, як Купала і Колас чыталі некаторыя ўласныя творы.

Дарэчы, вялікая частка дакументаў пададзена не толькі на беларускай, але таксама на рускай, польскай і нават лацінскай мовах.

Марына ПЫРКОВА.

ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

ГАМБАЛЕЎСКІ І ПЕКЛА

Вуха забалела ў Віктора Гамбалеўскага, і так яно заторкала й так затахкала, хоць ты вазьмі ды ўсю галаву адарві ды выкінь. Віктор напаліў лазню, тры разы ў парылцы прасядзеў да знямогі, а потым прабегся па снезе на рэчку і даў нырца ў палонку. Думаў — дапаможа. Дзе там. Млосна зрабілася Гамбалеўскаму. Залез ён на гарачую печ, скруціўся ў абаранак, заціх і стаў паміраць. Ён бы так і сканаў, каб сусед у хату выпадкова не зайшоў. Убачыў ён скурчанага сябрука, раскатурхаў яго і ў бальніцу завёз. Аперацыю давялося рабіць неадкладна, усе зубы ў Віктора павымалі, дзірку ў чэрапе прабілі, але ўратавалі байца. «Холад, голад і спакой — такія сябры павінны быць у чалавека, а ў пекла мы яшчэ паспеем апусціцца!» — так сказаў доктар, калі Віктор Гамбалеўскі з лякарні сыходзіў. І нічога вартага да гэткай парады не дадасі.

МУРЛАЦІК І САМАСТОЙНАСЦЬ

Як толькі пачынаюцца маразы, наш дваровы кот — Мурлацік — пачынае прасіцца ў кватэру. Які ён ласкавы і добры, які муркатлівы і гаваркі, хоць ты яго бяры і да раны прыкладай. Два разы Мурлацік пераседзеў зіму ў суседнім пад'ездзе, у кватэры самотнай жанчыны. А з вясны ён зноўку разгульвае ў дварэ і дэманструе сваю поўную самастойнасць. Гляджу на Мурлаціка і думаю... Ёсць час, калі хатні кот спрабуе ўцячы на вуліцу, а ёсць час, калі вулічны кот просіцца ў хату.

БЕРОЎЗ І UBERMENSCH

Чалавеку цяжка любіць адначасова дзве істоты. Таму, калі Вільям С. Бероўз піша «я не ненавіджу сабак», паверыць яму немагчыма. І ўдакладненне — «я ненавіджу тое, што чалавек зрабіў са свайго найлепшага сябра» не выратуе сітуацыю. Відавочна, Бероўз сабак не любіць. Ён іх ненавідзіць з такой жа сілаю, як і нямецкі нацызм, пра які распавядае наступнае: «Цырымонія пасвячэння нацыстаў у вышэйшыя слаі СС: вырваць вока ў хатняй коткі пасля таго, як ты карміў і даглядаў яе цэлы месяц. Гэтае практыкаванне было прыдумана, каб знішчыць усялякі след слюнцяйства і сфармаваць ідэальнага Ubermensch (звышчалавека)». Вырываць вочы коткам — учынак найпаскуднейшы. Хто спрачаецца? Але і любіць катоў за кошт сабак — не выйсце. Бероўз пра тое цудоўна ведае, ён нават згодны прызнаць, што «сабакі — адзіныя жывёлы, акром чалавека, якія валодаюць пачуццём дабра і зла». Але тут жа ж пра сабаку такое: «...Глядзіць з гаўнаеднай усмешкаю і качаецца каля падлы». Змагаючыся са звышчалавекам, Бероўз не заўважыў, як распачаў вайну з чалавекам простым. Вялікая частка майго дзяцінства прайшла сярод простых людзей у вёсцы Варакомшчына і мястэчку Койданава. Ніякай вайны паміж коткамі і сабакамі там не было. У кожным доме, у кожнай хаце жылі і каты, і сабакі. Ніхто не аддаваў ніякай перавагі адной з жывёлінаў. Іх любілі па-рознаму, але іх любілі адначасова. Каб нацыст вырываў вока ў сабакі а не ў ката, ён бы лепшым ад гэтага не стаў. Чалавеку, каб жыць чалавекам, неабходна любіць шмат рэчаў, і ката з сабакам яму трэба любіць адначасова.

ВАЛОДЗЯ І ВЫБУХ

Калі твой знаёмы адчыняе сваю машыну, і спрацоўвае выбуховая прылада, ты пачынаеш інакш бачыць свет. Уладкаванасць і спарадкаванасць жыцця разлятаецца на дробныя аскепкі. Запускаецца новы адлік часу, бо працэс, распачаты выбухам, незваротны. Ты ўсведамляеш, што ніякага міру нідзе і ніколі не было, вайна ішла заўсёды, а тое, што яна не закранала вас, проста шчаслівая выпадковасць. Твая вера ў дабро хутка развейваецца, як той дым над абгарэлай машынаю. І ты думаеш, што дзіва не адбудзецца, і памыляешся. Твой знаёмы Валодзя выжывае. Так, ён затрымаўся на адно імгненне, ён нават і ўспомніць не змог, што яго затрымала перад машынаю, ён адчыніў дзверцы і застаўся стаяць на хадніку. Каб ён сеў... Але ж Валодзя Вашкевіч не сеў, а застаўся стаяць, а таму і жыць застаўся. І цяпер трэба падумаць, нам усім трэба падумаць, як жыць ва ўзарваным свеце.

БІРС І ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

Амерыканскі байкапісец Амброз Бірс любіў апісваць фантастычныя здарэнні. Адна з такіх гісторый пра выратавальнікаў гучыць так: «Смелая Каманда са станцыі выратавання на вадзе толькі была намерылася выправіцца на лодцы ўздоўж берага, як раптам пабачыла ў моры перакулены карабель, па кіль якога чапляліся людзі. «Якое шчасце, — сказала Смелая Каманда, — што мы своечасова іх заўважылі, бо нас гэтаксама мог бы напаткаць падобны лёс». Каманда зацягнула лодку пад павець і захавала сябе дзеля далейшай службы на карысць Радзімы». Шмат разоў я перачытваў і перачытваў фантастычную байку Амброза Бірса, і кожнага разу бачыў сваіх былых паплечнікаў, якія паўцякалі з Радзімы, пазаселі на розных станцыях ды берагах і захоўваюць сябе «дзеля далейшай службы на карысць» Бацькаўшчыны. Асабліва саркастычны смех у мяне выклікаюць іх няўклюдныя забаўкі з выратавальнай лодкаю, бо яны яшчэ спрабуюць прадаваць на яе квіткі. Цяпер факты... Праваадстойнік Лапа злупіў з мастака Мары грошы за начоўку ў віленскім праваабарончым цэнтры. Факт нікчэмны, і пісаць пра яго — паветра калаціць. Але быў у мяне знак! Заходжу ў метро, а тамака сутыкаюся з Аленаю — жонкаю сквапнага Лапы. Так і так, кажу, хацеў пра твайго дробнага мужчынку напісаць, ды перадумаў. Жанчына зацікавілася маімі намерамі, давялося пра грошы, злупленыя з мастака, распавесці. — Ён і з мяне грошы дзярэ! — Тут я і зразумеў пра знак. Ёсць сучАснікі і сУчаснікі, а ёсць яшчэ Лапа, які кінуў жонку з двума малымі дзецьмі, хворага старога бацьку кінуў разам з усёй бацькаўшчынай, жыве з каханкаю ў віленскім праваабарончым цэнтры, а яшчэ з жонкі ды сваіх малагадовых дзяцей грошы лупіць... Фантастыка!

ЮРА І ГАРЭЛКА

«Гарэлкі хочацца», — сказаў Юра. Быў прахалодны летні вечар, мы размаўлялі, стоячы ў сваім двары, пад вялікім каштанам. Абмяркоўваліся кнігі. І раптам ён з гэтым — гарэлкі хочацца. Пайшлі ў краму набылі дзве бутэлькі, ён сабе, а я сабе, і разышліся ў розныя бакі. Што такога? А тое: я зразумеў, што акрамя гарэлкі мне ў жыцці нічога і не хочацца. Праўдзіва хочацца толькі гарэлкі. І зранку, і ўдзень, і надвячоркам карціць глынуць жывой, пякучай, саракаградуснай вады. Астатняе — другаснае, неістотнае і неабавязковае. Маляванне, грошы, сэкс, літаратура мяне цікавілі меней чым гарэлка. Я піў гарэлку і закусваў яе вадою. Гарэлачнае жыццё мяне задавальняла цалкам. І магу плюнуць таму ў твар, хто скажа, што гарэлачнае жыццё хрэновае. Яно нармальнае, адно што кароткае, бо арганізм доўга не вытрымлівае такога рытму, калі штодня выпіваецца бутэлька гарэлкі. Цела надломліваецца, крышыцца, сыплецца і парахнее. Цела патрабуе адмаўлення ад гарэлкі і пераходу на слабейшыя напоі. А вось іх мне ніколі не хацелася. Усё, што слабейшае за сорак градусаў, фігня. І піць я кінуў. Але ў прахалодны летні вечар, стоячы ў дварэ пад разгалістым каштанам, я згадаў Юру, згадаў ягонае «гарэлкі хочацца», і мне зрабілася цёпла ад гэтых успамінаў.

Адам ГЛОБУС.

Алена Валошына: НЕ ХАЧУ БЫЦЬ «ЯШЧЭ АДНОЙ БЛАНДЗІНКАЙ»!

Гасцёўня

Пару гадоў таму гэту маладую спявачку ведалі, шчыра кажучы, нямногія. І гэта можна зразумець: ці мала іх, маладых амбіцыйных выканаўцаў, якія збіраюцца пакарыць вяршыні эстраднага алімпу, гучна абвяшчаюць аб сабе, а потым завісаюць у няпэўным статусе «пачаткоўцаў» і ўрэшце ціха знікаюць, так і не запаліўшы сваю зорку. Алена, заўважым, ні гучна абвяшчаць, ні ціхенька знікаць не пажадала. Спачатку як быццам прымервалася — ці яе гэта справа, музыка. Вырашыўшы, што яе, узяла старт.

У 2003 годзе дзяўчына ўпершыню ўдзельнічае ў вялікім конкурсе маладых выканаўцаў і атрымлівае трэцюю прэмію. Потым два гады запар даходзіла да фіналу музычнага Міжнароднага руху краін СНД і Балтыі. У 2005-м — уваходзіць у фінальную трыццатку тэлевізійнага праекта «Зорны дыліжанс», тады ж запісвае сваю першую сольную кампазіцыю «Matrix», з якой упэўнена ўваходзіць у розныя хіт-парады. Праз год імя Лены — дакладней, LENA, пад такім сцэнічным псеўданімам выступае маладая артыстка — значыцца не абы-дзе, а сярод 15 паўфіналістаў нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне».

Дарэчы, гэтая незавершанасць як быццам пераследуе спявачку. Сёлета ў маі яна дайшла гэтаксама роўна да паўфіналу адбору на міжнародны конкурс вакалістаў «Новая хваля» — і не далей. У жніўні трапіла на конкурс «Песні мора» ў Севастопалі, адкуль прывезла трэцюю прэмію. На пачатку кастрычніка — чарговы міжнародны фестываль «Саюз маладых» (ён праходзіў як частка праграмы Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі) у Растове-на-Доне — зноў-такі, трэцяя прэмія. Як быццам зачараванае кола. Зрэшты, Лена Валошына — так, зноў проста Лена, без усякіх модных англіцызмаў — гэтым не засмучаецца. Бо ведае, што ў свае 18 гадоў яна не чараўніца, а толькі вучыцца. І вучыцца, трэба сказаць, заўзята, мэтанакіравана і даволі паспяхова.

— Ад Беларусі нас было 10 чалавек, а ўсяго ў дэлегацыі, здаецца, 100. Паўтара сутак у цёплай сяброўскай кампаніі на адным цягніку, потым яшчэ тыдзень фестывалю — уяўляеце, якімі роднымі мы сталі адзін аднаму, — прыгадвае Алена паездку ў Растоў-на-Доне. — Праўда, нас «абламалі» перад самым конкурсам, сказаўшы, што на англійскай мове спяваць нельга — толькі на рускай і нацыянальнай. І літаральна за ноч амаль усім беларускім артыстам давялося падбіраць другую кампазіцыю... Журы прымала вельмі добра, тым больш, у яго таксама ўваходзілі беларускія артысты — Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, Ірына Дарафеева, Пётр Елфімаў. У прыватнасці, Дарафеева мяне вельмі хваліла ў першы конкурсны дзень, я нават здзівілася. Прыемна было — як прымаць пахвалы, так і выслухоўваць заўвагі ад прафесіяналаў. У выніку трэцяе месца з 24 — я лічу, вельмі няблага.

— Але калі дзяўчынка з Мінска саступае хлопчыку з Бабруйска...

— Шчыра кажучы, я паловы выступленняў сапернікаў не чула, і за трэцяе месца мне абсалютна не крыўдна. Яно ў мяне ўвогуле як закон — будзе стымул падняцца вышэй.

— Можа, паспрабуеш зрабіць гэта зараз? Шырока вядомай ты ўсё ж стала пасля леташняга «ЕўраФэсту», калі выконвала песню, прысвечаную трагічным падзеям 11 верасня. Сёлета збіраешся паўдзельнічаць у адборы?

— Так, мяркую. Ёсць у перспектыве добрая песня, якую мы робім з кампазітарам Леанідам Шырыным і паэтам Андрэем Касцюговым — калі паспеем дарабіць, выставім яе на конкурсны адбор.

— Летась ты шчыльна працавала з прафесійнымі музыкантамі брэсцкага гурта «Spasenie», а потым і сама абвяшчала набор музыкантаў. Удалося сабраць каманду?

— У мяне гэта даўняя мара — працаваць з «жывым» калектывам. Але гэта ўжо зусім іншы ўзровень. Вельмі хочацца самім сачыняць і выконваць песні, але гэта павінна рабіць сапраўды каманда, калектыў аднадумцаў і сяброў, а не проста нанятыя на шэраг канцэртаў музыканты. Спадзяюся, з цягам часу гэта пытанне вырашыцца так ці інакш.

— Табе ўвогуле прасцей выконваць песні на англійскай, на рускай ці якой-небудзь іншай мове?

— Калі толькі пачынала, спявала на англійскай. Увогуле лічыцца, што на ёй лягчэй працуе маўленчы апарат. Але потым перайшла на рускую — гэта і мне больш цікава, і публіка лепш разумее, аб чым песня. На Захад, на Амерыку мне пакуль што рана арыентавацца — хіба што для фармату «Еўрабачання» буду выстаўляць кампазіцыю адразу на англійскай, а так у рэпертуары зараз у асноўным рускамоўныя творы.

— У той час як многія нашы выканаўцы прыдумляюць сабе загадкавыя англамоўныя псеўданімы, ты, наадварот, вярнулася да ўласнага імя — Лена Валошына. У чым прычына?

— Проста было вельмі многа пытанняў, чаму менавіта LENA — незразумела, якая Лена, што за яна. На «Новай хвалі» таксама паглядзела, колькі на адборы ўсякіх Лен і Нат, у іх мноцтве можна лёгка згубіцца і нічым не запомніцца публіцы. Калі б гэта быў праект або гурт, накшталт Глюкозы, можа, і мела б сэнс пакінуць адно толькі імя. А паколькі я ніякі не праект, сама па сабе, не маю зарэгістраванага брэнда, то пакінула імя і прозвішча, якія найбольш поўна і канкрэтна мяне прадстаўляюць. Да таго ж тата пастаянна падкрэсліваў — з прозвішчам Валошына лепей, яно дастаткова гучнае і прыгожае.

— Ты кажаш, што не з'яўляешся прадзюсарскім праектам, але на пачатку кар'еры табой займаўся Сяргей Ждановіч, потым дапамагаў Аляксей Хлястоў...

— Ну, Лёша мной наўмысна не займаўся, ён проста дапамагаў мне парадамі і вакальнай падрыхтоўкай, як чалавек, які быў ужо на «Новай хвалі» і мае ўяўленне, што да чаго. З Сяргеем Ждановічам я працавала як з музычным прадзюсарам — ён пісаў мне песні. А каб нехта рабіў кантракты, падбіраў у што мне апранацца, што спяваць і як размаўляць — такога няма і ніколі не было. Зараз я ў пошуку талковага чалавека, які зможа дапамагчы з «раскруткай», але пакуль яго няма, раблю тое, што падабаецца самой, і спраўляюся збольшага ўласнымі сіламі.

— Адукацыя, якую ты атрымліваеш, звязана з шоў-бізнэсам і будзе дапамагаць табе ў кар'еры?

— Магчыма. Я вучуся на культуролага-менеджара, са спецыялізацыяй «прадзюсар». Верагодна, будзе прасцей разбірацца ў законах шоў-бізнэсу.

— Зараз назіраецца такая дзіўная мода — маладыя беларускія выканаўцы ірвуцца паспрабаваць сілы ў замежных тэлепраектах — не ў «Фабрыцы зорак», дык у «Сакрэце поспеху» ці яшчэ дзе-небудзь, дзе заўгодна. Можна спытаць, чаму ты не там?

— Калі толькі пачынала «Фабрыка зорак», я сядзела перад тэлевізарам і марыла туды трапіць. Гэта здавалася крута і клёва. Але ўжо сёмы запар праект не выклікае ніякай цікавасці, бо надакучыла. Хоць, у прынцыпе, я разумею, што трапіць на падобны праект і пратрымацца да фіналу — гэта добры шанц. Але толькі калі пратрымацца да фіналу і быць накіраваным на перамогу. Проста прыйсці паўдзельнічаць і адразу вылецець — які сэнс? І тое можа быць — трапляеш у фіналісты, «сядаеш» на кантракт, а развіцця ніякага. Для сябе я нават не вырашыла, ці патрэбныя падобныя праекты. Станеш яшчэ прадзюсарскім праектам, новай «BIA ГРА» ў лепшым выпадку — а гэтага, шчыра кажучы, не хочацца. Скажуць: вось, яшчэ адна бландзінка на сцэне, нічым ад іншых не адрозніваецца.

— Не ведаю, як наконт «BIA ГРА», а вось са спявачкай Аўрыл Лавін цябе параўноўвалі даволі часта...

— І зараз параўноўваюць! Мне яе творчасць падабаецца, гэткі сапраўдны маладзёжны накірунак, не проста «тупа папсовы», а напалову рок, напалову панк. У маім новым рэпертуары, думаю, ёсць нешта падобнае. Хоць Аўрыл Лавін — яна ўсё ж бунтарка, дзяўчына-панк, а я, мяркую, больш стрыманая і інтэлігентная.

— Ад каго ты атрымлівала самыя каштоўныя парады наконт творчасці?

— Калі я пачала працаваць з гуртом «Spasenie», цесна кантактавала з гітарыстам. І скардзілася яму, што часам думаеш: вось, у мяне няма песні, хто б напісаў, ды яшчэ каб табе спадабалася... Ён спытаўся: «Ты ж пішаш вершы? Тады працягвай гэта рабіць, спрабуй прыдумляць музыку, выслухоўвай крытыку і развівайся далей — табе ж не трэба спяшацца з тым, каб атрымаць хіт вокамгненна, адразу. А калі будзеш працаваць сама, потым не будзеш залежаць ад паэтаў і кампазітараў». Мне гэтая парада вельмі дапамагла — сапраўды, ствараю сабе нешта пакрысе, развіваюся. Гэтаксама Аляксандр Ціхановіч летась, праслухаўшы мяне на адборы на «Еўрабачанне», параіў не сядзець на месцы ні ў якім выпадку, рухацца, спрабаваць сілы на конкурсах... Напэўна, найбліжэйшым будзе якраз «ЕўраФэст».

...Руковая мара любога артыста-пачаткоўца — дэбютны альбом. Адны запісваюць яго як мага хутчэй, другія доўга і карпатліва збіраюць матэрыял, пакуль не адчуюць поўную баявую гатоўнасць. Лена Валошына падзеі не прыспешвае — кажа, у планах пакуль што сінгл, які дапаможа раскруціць новае-старое імя і прадставіць рэпертуар. А калі з'явіцца добры шэраг хітоў, якія на сто працэнтаў задаволяць маладую спявачку, можна задумацца пра альбом. Пакуль жа — яна не чараўніца, яна толькі вучыцца. Разумее па-свойму, што такое фармат, фільтруючы музыку на «танны шлак» і «якасць першага гатунку», незалежна ад музычнага стылю. Слухае пераважна хрысціянскі рок і заходніх выканаўцаў, добрая палова з якіх мала вядомая яе аднагодкам. Ну і жадае, як практычна кожны малады артыст, калі-небудзь стаць «зоркай»:

— Кім бачу сябе я? Наўрад ці клубнай выканаўцай і не чыстай «папсой». Хочацца несці пэўную ідэю, сваю ўласную «фішку», і яшчэ каб гэта было запатрабавана — у сваёй краіне ці за яе межамі, каб у цябе была магчымасць не толькі зарабляць, але яшчэ і развівацца.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Краіна здароўя

Выпуск № 33 (46)

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) будуць:

12 лістапада — галоўны ўрач 3-й ЦКП г. Мінска Дзмітрый Ігаравіч СТРАЗДЗІН.

13 лістапада — галоўны ўрач 2-й сталічнай клінічнай бальніцы Вікенцій Часлававіч ПРЫСТУПА.

14 лістапада — галоўны ўрач 16-й сталічнай дзіцячай паліклінікі Алена Іванаўна КУЛЬБЕДА.

15 лістапада — галоўны ўрач 4-й сталічнай клінічнай бальніцы Аляксандр Анатольевіч ТРАЯНАЎ.

У графіку магчымыя змяненні.

СМЯРОТНАСЦЬ У СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ ЗНІЖАЕЦЦА

Паводле інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, за 9 месяцаў гэтага года ў Беларусі нарадзілася на 8,4 працэнта дзяцей больш, чым за адпаведны перыяд мінулага года, а колькасць памерлых знізілася за гэты ж адрэзак часу на 3,7 працэнта. Пры гэтым нараджальнасць павялічылася ва ўсіх абласцях як сярод гарадскога (10,2 працэнта), так і сярод сельскага насельніцтва (6,2 працэнта). У Мінску ўпершыню за апошнія 15 гадоў нараджальнасць перавысіла смяротнасць насельніцтва.

Зніжэнне ўзроўню смяротнасці, як адзначаюць у галоўным медыцынскім ведамстве краіны, адбылося па ўсіх асноўных класах захворванняў. У сельскай мясцовасці колькасць памерлых зменшылася сёлета на 6,8 працэнта.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Кампетэнтна

БЯСПЛОДНАСЦЬ З-ЗА... ПАЛАЧКІ КОХА?

«Спрабуючы адшукаць прычыну хранічнага аднэксіту, мая гінеколаг прапанавала абследавацца на туберкулёз матачных труб. Раскажыце, калі ласка, ці ёсць сувязь паміж гэтымі двума захворваннямі і якім чынам можна захварэць на туберкулёз матачных труб?»

Лідзія Мікалаеўна, *г. Мінск.*

Як вядома, самым распаўсюджаным і шырокавядомым з'яўляецца туберкулёз лёгкіх. Пазалёгачныя туберкулёзныя формы складаюць усяго 6 працэнтаў ад агульнай колькасці выпадкаў. Палачка Коха трапляе ў наш арганізм выключна паветрана-кропельным шляхам, праз органы дыхання. Далей інфекцыя разносіцца крывёю па ўсім арганізме і «наносіць удар» па адным з багатых на дробныя сасуды органе — лёгкіх, палавой сістэме (у жанчын — па матачных трубах, вельмі рэдка можа быць туберкулёз маткі), нырках, вачах, касцях і суставах.

Паводле слоў урача-фтызіягінеколага 1-й кваліфікацыйнай катэгорыі Мінскага гарадскога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Іны ПРАТКО, туберкулёз жаночых палавых органаў выклікаецца ў 10,5 працэнта жанчын групы рызыкі (згодна з сусветнымі данымі — у 20 працэнтаў). Так, з 168 абследаваных летась у дыспансэры жанчын дыягназ туберкулёзу матачных труб быў пастаўлены дзевятнаццаці. У групе рызыкі знаходзяцца жанчыны з парушэннем менструальнага цыкла, хранічнымі запаленчымі захворваннямі прыдаткаў, бясплоднасцю. Інакш кажучы, усе гэтыя жанчыны павінны атрымліваць кансультацыю фтызіягінеколага. Што датычыць аднэксіту — запалення матачных труб і яечнікаў, то бяруцца пад увагу толькі тыя выпадкі, якія не паддаюцца працягламу, не спецыфічнаму лячэнню.

— Жанчыны групы рызыкі накіроўваюцца гінекалогам па месцы жыхарства ў наш амбулаторны кабінет, дзе ўрач-фтызіягінеколаг збірае анамнез, робіцца рэакцыя манту, якая дапаможа выявіць характар імунной рэакцыі на палачку Коха, — тлумачыць Іна Васільеўна. — На падставе гэтых звестак прымаецца рашэнне аб неабходнасці больш дэталёвага абследавання жанчыны ў стацыянары. Калі такая патрэба ёсць, пацыентка чакае сваёй чаргі 3—4 месяцы. Такі тэрмін тлумачыцца абмежаванай колькасцю ложка-месцаў і іх вялікай запатрабаванасцю. Да таго ж, у наш дыспансэр накіроўваюцца хворыя з усёй рэспублікі. У стацыянары робіцца туберкулінадыягностыка — больш складаны спосаб правядзення рэакцыі манту, выконваецца рэнтгеналагічнае, гісталагічнае і бактэрыялагічнае даследаванні эндаметрыя. З мінулага тыдня мы пачалі выкарыстоўваць яшчэ два метады дыягностыкі — імуналагічны і з дапамогай полімеразна-ланцуговай рэакцыі.

Варта мець на ўвазе, што туберкулёз матачных труб найчасцей праяўляецца ў маладых жанчын з пачаткам палавога жыцця. А ў арганізм палачка Коха трапляе, галоўным чынам, праз органы дыхання, радзей — праз плацэнту ад маці дзіцяці і зусім рэдка — праз пашкоджаныя ўчасткі слізістай і скуры, у тым ліку палавым шляхам праз пашкоджаную слізістую. Для ўзнікнення захворвання аднаго факта пранікнення мікроба недастаткова. Важна, наколькі гэты мікроб моцны, а імунітэт — слабы.

Што датычыць лячэння туберкулёзу матачных труб, то з моманту яго выяўлення яно працягваецца 8—12 месяцаў, першыя два з якіх неабходна правесці ў стацыянары. Поспех лячэння залежыць ад своечасовасці яго пачатку, працягласці і рэгулярнасці антыбактэрыяльнай тэрапіі. На дыспансэрным уліку чалавек знаходзіцца 6—8 гадоў. Вяртанне захворвання адбываецца ў тых выпадках, калі мела месца зніжэнне імунітэту, пераахалоджванне, невыкананне ўрачэбных рэкамендацый.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фіталячэнне

«Біянорыка» давярае сіле прыроды

Прыкладна 20 тысяч лекавых раслін ва ўсім свеце могуць выкарыстоўвацца для медыкаментаў. Аднак пакуль даследавана прыкладна сотня раслін, якія валодаюць якасцямі фітанірынгу. Фітанірынг азначае расшыфроўку механізмаў дзеяння раслін з выкарыстаннем найноўшых тэхналогій і сучасных навуковых метадаў. Прыкладам выкарыстання гэтай унікальнай канцэпцыі з'яўляецца нямецкая кампанія «Біянорыка». На сусветным рынку яна працуе ўжо звыш 70 гадоў, у Беларусі пакуль толькі пяць.

Кіраўнік кампаніі «Біянорыка», прафесар Міхаэль Поп адзначае, што ўсё больш пацыентаў, урачоў і фармацэўтаў у Беларусі даверяюць лекавай сіле прыроды і навукова даказаным паказчыкам якасці і дзеяння раслінных прэпаратаў. Вядома, што па сваёй эфектыўнасці сучасныя фітапрэпараты не саступаюць хіміка-сінтэтычным медыкаментам і дэманструюць пры гэтым больш высокую бяспеку.

Зараз ва ўсе аптэкі краіны «Біянорыка» пастаўляе дзесяць сваіх прэпаратаў — для дыхальных шляхоў і імуннай сістэмы (сінупрэт, бранхіпрэт, танзіпрэт, танзілгон/імупрэт, іберагаст), для гінекалогіі — цыкладынон, мастадынон, клімадынон, для ўралогіі — канефрон, антыдэпрэсант геларыум. У наступным годзе, паводле планаў, павінен з'явіцца аэразоль ад сінусіту, у 2009-м — супрацьалергічны сродак, а ў 2011 і анкалагічны прэпарат. Акрамя таго, «Біянорыка» выдае спецыяльныя метадычныя рэкамендацыі для ўрачоў і плануе праводзіць школы здароўя пры жаночых кансультацыях дзеля прафілактыкі раку малочнай залозы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Пытальнік

Ці спыніць «жывая» вакцына грып?

Падкажыце, калі ласка, чым «жывая» грыпозная вакцына адрозніваецца ад інактываванай? У паліклініцы мне паведамілі, што ў гэтым годзе ўсіх дарослых будуць прышчапляць менавіта «жывой» вакцынай. І якая з вакцын больш эфектыўная ў дачыненні да грыпу?

А.Г., *г. Мінск*

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў аддзяленні імунапрафілактыкі і эпіднагляду за паветрана-кропельнымі інфекцыямі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, дзеці ва ўзросце да трох гадоў будуць прышчапляцца сёлета расійскай інактываванай вакцынай «Грыпол», якая не ўтрымлівае жывых вірусаў і ўводзіцца ў арганізм з дапамогай ін'екцыі. Астатняя частка кантынгенту з так званай групы рызыкі будзе прышчапляцца расійскай жывой грыпознай вакцынай — яе вытворца выйграў аб'яўлены Міністэрствам аховы здароўя тэндар.

Жывая вакцына, патлумачылі нам, рыхтуецца з вакцынных штамаў, рэкамендаваных Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя на будучы эпідсезон, таксама як і інактываваная вакцына. Але жывая грыпозная вакцына (ЖГВ) ўводзіцца шляхам распылення ў насавыя хады, што дазваляе сфарміраваць мясцовы імунітэт на слізістай носа — уваходных дзвярах для рэспіраторных вірусных інфекцый. Да таго ж для дзяцей увядзенне вакцыны шляхам распылення ў насавых праходах менш траўматычнае, чым увядзенне вакцыны з дапамогай уколу. Да 2003 года Расія была адзінай краінай у свеце, дзе выпускалася жывая грыпозная вакцына. А з лютага 2003 года жывая вакцына была дазволена для вытворчасці і прымянення ў ЗША.

У выніку клінічных даследаванняў жывых грыпозных вакцын, праведзеных у Расіі і за мяжой, было даказана, што пасля вакцынацыі гэтымі прэпаратамі ў прышчэпленых фарміраваўся як мясцовы, так і клетачны імунітэт (г.зн. фарміравалася імунная памяць). Прафілактычная эфектыўнасць ЖГВ (па выніках даследаванняў Інстытута эксперыментальнай медыцыны Паўночна-Заходняга аддзялення Расійскай акадэміі медыцынскіх навук) складае 94,4 працэнта: захваральнасць на грып у групе прышчэпленых ЖГВ — толькі 5,3 працэнта, а ў непрышчэпленых даходзіць да 94,7 працэнта.

Пры даследаваннях, праведзеных у Калінінградзе, пацвердзілася таксама навуковая гіпотэза аб тым, што жывая вакцына зніжае колькасць ускладненняў ад грыпу (маюцца на ўвазе пнеўманія, бранхіт, атыт і г.д.). Так, у прышчэпленых колькасць пнеўманій была ў пяць разоў меншай, чым у непрышчэпленых. Пры вывучэнні захваральнасці ў школах Ноўгарада высветлілася, што жывая вакцына фарміруе калектыўны імунітэт і папярэджвае распаўсюджванне вірусу ў калектыве. Там, дзе большасць вучняў у класе былі прышчэпленыя ЖГВ, вакцына адначасова абараняла і іх непрышчэпленых аднакласнікаў, а таксама педагогаў. Восенню 2005 года Інстытут грыпу Расійскай акадэміі медыцынскіх навук правёў параўнальныя клінічныя выпрабаванні ЖГВ і інактываванай вакцыны «Грыпол». Высветлілася, што ЖГВ валодае імунагеннасцю на ўзроўні вакцыны «Грыпол». Ахоўны эфект вакцыны канчаткова фарміруецца праз 3 тыдні пасля імунізацыі і захоўваецца на працягу 10—12 месяцаў. Трэба таксама заўважыць, што за 30 гадоў прымянення ў Расіі ЖГВ не было апісана выпадкаў анафілактычных рэакцый пасля вакцынацыі гэтым прэпаратам. Проціпаказаннем да гэтай прышчэпкі з'яўляецца адчувальнасць да курынага бялка, імунадэфіцытны стан (першасны), злаякасныя ўтварэнні, рыніт і цяжарнасць. А часовыя проціпаказанні — вострыя інфекцыйныя захворванні, а таксама хранічныя захворванні ў стадыі абвастрэння.

Як змагацца з бародаўкамі?

Дапамажыце, калі ласка, парадай. Мой сын пакутуе ад бародавак. Змагаемся з імі рознымі сіламі пры дапамозе соку чыстацелу. Але бародаўкі ў адным месцы знікаюць, а праз нейкі час з'яўляюцца ўжо ў іншым. Ці магчыма ад іх пазбавіцца канчаткова?

Марыя Біцай, *Дзяржынскі раён.*

Бародаўкі, папіломы і востраканечныя кандыломы — гэта вірусныя захворванне, якое выклікаецца вірусам папіломы чалавека (ВПЧ). Носьбітамі ВПЧ з'яўляецца большасць з нас, але людзей з высокім узроўнем імунітэту бародаўкі могуць да пэўнага часу і не турбаваць. Аднак як толькі імунітэт у чалавека слабее (з-за хваробы, недахопу вітамінаў, хранічных стрэсаў і г.д.), ВПЧ пачынае праяўляць сваю прысутнасць у арганізме ў форме з'яўлення на скуры не вельмі эстэтычных дабраякасных утварэнняў: яны могуць «вырастаць» на руках, нагах, шыі, у падмышачный вобласці і нават на твары. Усяго налічваецца каля 60 відаў папіломавірусаў чалавека. У прынцыпе ад ВПЧ церпяць людзі ўсіх узростаў, але самая ўразлівая катэгорыя — гэта ўсё ж такі дзеці. Простыя бародаўкі, якія выглядаюць як невялікія выпукласці з няроўнай светла-шэрай ці чорна-жоўтай паверхняй, сустракаюцца ў кожнага пятага школьніка. Вірус жыве ў нервовых тканках чалавека, і з'яўленне бародавак на тулаве напрамую звязана са станам нервовай сістэмы. Таму першы спосаб папярэдзіць з'яўленне непрыемных утварэнняў — гэта паклапаціцца пра душэўны спакой і раўнавагу, паколькі нервовы чалавек становіцца лёгкай ахвярай віруса папіломы.

Касметолагі выдаляюць сёння бародаўкі з дапамогай вадкага азоту ці хірургічнага лазера. Але фізічнае выдаленне бародавак зусім не азначае, што і арганізм ачысціўся ад віруса. Шчыра кажучы, медыкі пакуль дакладна не ведаюць, як процістаяць вірусу папіломы чалавека. Цалкам пазбавіцца ад яго немагчыма, але можна зменшыць яго канцэнтрацыю, каб ён зноў нічым сябе не праяўляў, а для гэтага трэба ўмацоўваць імунную сістэму. У харчаванні абавязкова павінны прысутнічаць прадукты, багатыя на вітаміны А, С і Е. Курс лячэння з прымяненнем імунамадулятараў павінен прызначыць урач, але толькі пасля таго, як былі выдалены ўсе ўтварэнні на скуры.

Інфарм-укол

ВОРАГІ І СЯБРЫ ЗУБНОЙ ЭМАЛІ

Эмаль абараняе ўнутраную частку зуба ад уздзеяння знешніх фактараў, таму вельмі важна як мага даўжэй захоўваць яе моцнай і трывалай.

Асноўнымі прычынамі разбурэння зубной эмалі з'яўляюцца гарачая і халодная вада (гэта спрыяе ўтварэнню трэшчын), цукар (асабліва шкодныя цукеркі, ірыс, карамель, якія досыць доўга знаходзяцца ў ротавай поласці) і цытрусавыя (іх сок раз'ядае эмаль, як і газаваныя напоі).

Вядома, што нашым зубам патрэбны фтор і кальцый. Шмат кальцыю ўтрымліваюць малочныя прадукты, сухафрукты, пятрушка, рыба і мора-прадукты. Карыснае ўздзеянне аказваюць морква, буракі, агуркі, яблыкі, грушы, паколькі цвёрдыя кавалачкі такіх прадуктаў дзейнічаюць накшталт зубной шчоткі. Іх карысна ўжываць пасля асноўнага прыёму ежы. А вось пасля ўжывання бананаў ці цытрусавых варта апласнуць рот вадой. Зубная эмаль паважае сыр, які таксама можа замяніць чыстку зубоў пасля прыёму ежы. Жуйка карысная толькі на працягу 5—10 хвілін пасля ежы. Ва ўсіх астатніх выпадках яна нават шкодная для здароўя.

СТРАЎНІК І КІШЭЧНІК ВЫБІРАЮЦЬ АЎСЯНКУ

Для карэкцыі і падтрымання вагі ўрачы-дыетолагі рэкамендуюць уключаць у рацыён аўсяныя прадукты.

Авёс складаецца з бялкоў — 17 працэнтаў, тлушчаў — 7 працэнтаў, вугляводаў — 58 працэнтаў, крухмалу — 36 працэнтаў. У бялках аўса ўтрымліваецца павышаная колькасць такой амінакіслаты, як лізін. Акрамя таго, зерне аўса багатае на шматлікія мінеральныя рэчывы: медзь, цынк, кобальт, марганец, ёд, фтор, фосфар, калій, натрый, магній, хлор і г.д. Аднак асаблівую каштоўнасць для карэкцыі фігуры ўяўляе сабой клятчатка — бэта-глюкан. Наогул клятчатка запавольвае працэс усмоктвання тых жа тлушчаў і вугляводаў, скарачае сакрэцыю інсуліну, спрыяе ачышчэнню арганізма і вывядзенню шлакаў. Яна стымулюе маторыку кішэчніка, паляпшае функцыянальны стан ўсяго страўнікава-кішачнага тракта, працэс ператраўлівання, не паддаецца разлажэнню бактэрыямі тоўстага кішэчніка, не дадае лішніх калорый.

Добрая порцыя аўсянкі на сняданак забяспечвае пачуццё сытасці працяглы час. Вугляводы аўсянай клятчаткі не разлагаюцца ў верхняй частцы стрававальнага тракта, дзякуючы чаму яна і не дадае лішніх калорый. Для ачышчэння арганізма і зніжэння вагі дыетолагі рэкамендуюць піць аўсяны адвар. Тры шклянкі аўса прамыць і заліць трыма літрамі вады. Гатаваць на слабым агні на працягу 20 хвілін, зняць з агню і пакінуць на суткі захутаным ці ў тэрмасе. Пасля працадзіць адвар, дадаць 100 г мёду, закрыць накрыўкай і даць закіпець. Астудзіць і паставіць у халадзільнік. Перад ужываннем дадаць свежаадціснуты сок лімона. Піць адвар па 100 мл у дзень, за паўгадзіны да яды. Курс праводзіць тройчы на год: вясной, летам і зімой.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прамая лінія

НЯМА АЛЕРГЕНА — НЯМА АЛЕРГІІ

На пытанні адказвае галоўны алерголаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Людміла МАСЛАВА.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 3 і 9 лістапада).

☎— Мінск, завуць мяне Настасся, а спытаць хачу пра сучасныя метады лячэння нейрадэрміту. Дзе ў нас можна атрымаць спецыялізаваную дапамогу?

— Пры нейрадэрміце, які яшчэ называюць атапічным дэрматытам, паказана гіпаалергенная дыета і быт. Вам нельга ўжываць пэўныя прадукты і неабходна выдаліць з кватэры збіральнікі пылу — пасцельныя прыналежнасці з пер'ем, ватныя коўдры, дываны і г.д. Абавязкова прымаць антыгістамінныя прэпараты — зіртэк, эрыўс, тылфаст або фенкарол, тавігіл. Пры абвастрэннях — плюс гарманальныя мазі. Прайдзіце абследаванне — зрабіце скурнае тэставанне, фібрагастраскапію, ультрагукавое даследаванне, здайце аналіз на гельмінты. Не ўсе формы дэрматыту звязаны з алергіяй. Калі ў вас менавіта той выпадак, можна будзе паспрабаваць лячыцца самімі алергенамі. Але ў вас можа быць, напрыклад, і ферментатыўная недастатковасць, калі трэба займацца страўнікавымі праблемамі.

☎— Вера Уладзіміраўна, горад Узда. Унуку — 5 гадоў. Год таму паставілі дыягназ — бранхіяльная астма. Лечымся, але імпартныя прэпараты вельмі дарагія. Як нам быць? Ці нельга атрымліваць што-небудзь бясплатна? Ці можна атрымаць санаторнае лячэнне?

— Сапраўды, прэпараты для лячэння бранхіяльнай астмы — дарагія, але затое і эфектыўныя. Льготы, як вы ведаеце, адменены, і нельга сказаць, што з іх дапамогай можна было атрымліваць сапраўды эфектыўнае лячэнне. А лячыцца трэба, паколькі ў процілеглым выпадку хвароба будзе прагрэсаваць, вы страціце каштоўны час і потым выправіць сітуацыю будзе і складаней, і яшчэ даражэй. Адносна санаторнага лячэння магу заўважыць, што пытанне — не зусім па адрасе. Магчыма, варта звяртацца з ім у прафсаюз.

☎— Звоніць Людміла Іванаўна з Мінска. Дзіцяці — 11 гадоў. Тры гады таму пасля перанесенай пнеўманіі з'явіўся паліноз, харчовая алергія, алергія на пер'е. Зараз алергія моцна праяўляецца: свярбяць вочы, закладвае вушы. Мы разлічвалі, што яе шпіталізуюць у 4-ю гарадскую клінічную бальніцу і зробяць там маштабнае даследаванне на алергены. Але наша педыятр сказала, што шпіталізацыі не будзе, таму што аддзяленне зачыняецца. Дзе ж нам зрабіць дэсэнсабілізацыю, абследавацца як належыць?

— Вам трэба абследавацца ў дзіцячага алерголага, якога можна знайсці ў Дзіцячым дыягнастычным цэнтры на вуліцы Навабеленскай. Зрабіць скурныя спробы, тую ж дэсэнсабілізацыю, можна і амбулаторна. Вядома ж, калі спецыялісты цэнтра вырашаць, што ёсць неабходнасць у шпіталізацыі, значыць, яны гэта прапануюць. Што датычыць алергалагічнага аддзялення 4-й бальніцы, то яно працуе і зачыняцца, наколькі я ведаю, не збіраецца.

☎— Кацярына, 28 гадоў. Тэлефаную з Мінска. У мяне пасля ўжывання цытрусавых, віна-граду, чырвонага віна ацякае твар. У такіх выпадках п'ю супрацьалергенныя прэпараты. Як мне быць? Дзе можна зрабіць расшыраны аналіз і растлумачце, калі ласка, што такое ацёк Квінке.

— Ацёк Квінке не заўсёды мае дачыненне да алергіі. У вас, хутчэй за ўсё, не харчовая алергія. Цытрусавыя, вінаград і многія іншыя прадукты выклікаюць так званую псеўдаалергію. Ацёк жа твару — вельмі небяспечны, паколькі можа «апускацца» на вобласць гартані і правакаваць удушша. Аднойчы можна нават не паспець прыняць антыгістамінны прэпарат. Хоць трымаць іх заўсёды пад рукой такім пацыентам варта абавязкова. Вядзіце харчовы дзённік, адсочвайце ўсе прадукты, якія выклікаюць падобную рэакцыю і не ўжывайце іх. Калі ацёк здараецца пры ўжыванні канкрэтнага прадукту, піце прэпарат «да» ці «пасля». Калі ж ён бывае наогул па незразумелых для вас прычынах, то піць антыгістамінныя прэпараты неабходна пастаянна. Крапіўніца і ацёк з'яўляюцца прычынай велізарнай колькасці праблем. Таму раю вам абследавацца страўнікава-кішачны тракт, зрабіць аналіз на гельмінты.

☎— Я званю з горада Шуміліна. Скажыце, калі ласка. як вы ставіцеся да біялагічна-актыўных дабавак? Ці могуць яны выклікаць алергію? Я адной скарыстаўся і адчуў сябе дрэнна.

— БАДы не лечаць. Ужо з назвы вынікае, што гэта ўсяго толькі дабаўкі. Ці могуць яны выклікаць алергію? Могуць, і не толькі яе, але ж і іншыя непажаданыя рэакцыі. Таму са скаргамі на здароўе вам трэба звярнуцца да тэрапеўта, а яшчэ лепш — да алерголага.

☎— Турбуе Таццяна Пятроўна з Рэчыцкага раёна. У мяне пытанне такое: ад чаго ўзнікае алергічны кан'юнктывіт і як з ім справіцца?

— Часцей за ўсё алергічны кан'юнктывіт выклікае пылок дрэў, траў. Для гэтай паталогіі характэрная пэўная сезоннасць. Інакш кажучы, праблемы з вачамі ўзнікаюць толькі вясной або ў летнія месяцы. Акрамя таго, прычынай алергічнага кан'юнктывіту могуць быць так званыя бытавыя алергены ва ўмовах сваёй кватэры. Сутыкнуцца з імі можна падчас правядзення ўборкі, навядзенне парадку ў шафе, працуючы з пыласосам або старымі паперамі. Пры пазбяганні кантакту з алергенамі праблемы знікаюць. Але калі ў вас ёсць такія праявы, трэба звярнуцца да ўрача, лепш, каб гэта быў алерголаг. Пацвердзіць прыроду такога кан'юнктывіту дапаможа скурнае алергатэсціраванне. Праз 20 хвілін па выніках скурных проб спецыяліст можа зрабіць выснову, ці алергічнай прыроды кан'юнктывіт. Калі гэта так, да дапамагаюць такія супрацьалергічныя гістамінныя прэпараты, як дымедрол, супрасцін. Магчымае і правядзенне алергенаспецыфічнай імунатэрапіі. Пры ёй кан'юнктывіт лечыцца алергенамі. І, безумоўна, пацыентам з гэтай паталогіяй рэкамендавана максімальна пазбягаць кантактаў з алергенамі. Калі ў вас алергія на пылок, пажадана менш бываць на прыродзе, асабліва ў цёплы сухі дзень. Трэба ўлічыць, што больш за ўсё пылку знаходзіцца ў паветры ў першай палове сутак.

— Скажыце, калі ласка, ці можа астма ў дзіцяці знікнуць сама па сабе?

— Дыягназ «астма» даволі сур'ёзны. Гэта хранічная хвароба, якая, на жаль, сама па сабе не пройдзе. Але калі правільна яе кантраляваць, то рэмісіі могуць быць вельмі працяглымі і хвароба можа асабліва не парушаць якасці жыцця. Для гэтага трэба, каб дзіця назіралася ва ўрача-алерголага, бо, як правіла, у дзяцей астма бывае алергічнай прыроды. Пры выяўленні прычыннага значнага алергена трэба максімальна пазбегнуць кантакту з ім. Магчыма, спатрэбіцца і фармакатэрапія або варыянт правядзення алергенаспецыфічнай імунатэрапіі. Гэта дазволіць працякаць хваробе больш спрыяльна, каб дзіця не турбаваў ні кашаль, ні прыступы ўдушша. На сёння гэта хвароба добра кантралюецца.

☎— Мяне завуць Святлана. Званю з Магілёва. У мяне алергія на холад. У халодны час цела пакрываецца пухірамі, нос дрэнна дыхае на вуліцы. Параліі прымаць рузан, але прэпарату нідзе не знайсці. Як ратавацца?

— Сапраўды, існуе так званая халадовая алергія, якая праяўляецца тым, што ў халоднае надвор'е адкрытыя ўчасткі цела адказваюць на кантакт з халадам з'яўленнем чырвані, ацёчнасці, можа быць скурны сверб. Хачу сказаць, што рузан не вырашыць вашу праблему. У халодны час года вам трэба прымаць антыгістамінныя прэпараты. Зараз ёсць даволі эфектыўныя і бяспечныя лекі — такія, як эрыус, зіртэк, філфаст. Іх можна прымаць раз на суткі, і яны не выклікаюць прывыкання. Калі вы са свайго ранейшага вопыту ведаеце, пры якой мінусавай тэмпературы ў вас пачынаюцца непрыемныя сімптомы, то можаце пачаць прымаць прэпараты рэгулярна. З улікам таго, што дрэнна дыхае нос, трэба падключыць лячэнне рыніту. Самымі эфектыўнымі прэпаратамі для гэтага на сёння з'яўляюцца інгаляцыйныя глюкакафістонды для мясцовага прымянення, напрыклад, назанекс. Ён аказвае супрацьзапаленчае дзеянне. Безумоўна, гэта не хуткая дапамога, прэпарат пачынае дзейнічаць праз некалькі дзён, але эфект ад яго трывалы, і вы будзеце абсалютна нармальна дыхаць.

☎— Тэлефануе Ала Іванаўна з Асіповіч. Праблема такая. У майго 16-гадовага сына бранхіяльная астма, атапічны дэрматыт, харчовая алергія, алергія на пыл, алергічны рыніт, алергія на многія бытавыя прадметы. Добра ён сябе адчувае толькі ў бальнічных стэрыльных умовах. Дома пастаянны сверб, удушша. Ці можна прыстасаваць сына да хатніх умоў?

— Калі прыступы ўдушша турбуюць вельмі часта, то паказана штодзённае лячэнне супрацьзапаленчымі прэпаратамі. Гэта мясцовыя інгаляцыйныя глюкакартыкоідныя прэпараты тыпу будасаніду, бекладжэту, серэтыду. Аснова хваробы, якой бы яна ні была — алергічнай або змешанай, усё роўна мае запаленчы працэс. Значыць, неабходны супрацьзапаленчыя лекі. Дозы прэпаратаў падбіраюцца ў залежнасці ад таго, як дыхае ваш сын. Пажадана праводзіць яшчэ кантроль дыхання з дапамогай такога прыборчыка, як пікфлоўметр. Ён кантралюе выдых, а менавіта: выдых церпіць пры бранхіяльнай астме. З харчавання трэба выключыць усе прадукты, якія правакуюць абвастрэнне. Неабходна таксама прымаць антыгістамінныя прэпараты, пажадана, каб яны былі другога пакалення: зіртэк, эрыус. Да іх не развіваецца прывыканне, яны больш эфектыўныя і бяспечныя. У перыяд рэмісіі нядрэнна было б вызначыцца, наколькі выражана бытавая алергія. Тады можна вырашыць пытанне аб мэтазгоднасці лячэння алергенамі.

☎— Добры дзень, Людміла Вячаславаўна, з Лельчыц Кацярына Іванаўна турбуе. У майго пяцігадовага ўнука вось ужо на працягу месяца на жываце з'яўляюцца плямы, пухіры, якія свярбяць. Лячыліся ў бальніцы, выпісаліся, і ўсё пачалося зноў, дадалася ацёчнасць твару.

— Гэта падобна на крапіўніцу. Трэба быць вельмі ўважлівымі да тых прадуктаў, якімі харчуецца хлопчык. Выключыць усё салодкае, салёнае, вэнджанае — гэ.зн. усе прадукты крайніх смакавых адчуванняў. Акрамя таго, кожны дзень трэба прымаць супрацьалергічныя антыгістамінныя прэпараты. Гэта можа быць ларатадзін, эрыус, зіртэк. Прымаць іх трэба на працягу некалькіх тыдняў. Калі гэтых лекаў будзе недастаткова і ўсё роўна будуць з'яўляцца высыпкі, то неабходна падключыць гарманальныя прэпараты, напрыклад, таблеткі мідролу, паколькі ацёк твару — гэта жыццёва небяспечны стан, ацёк можа апусціцца нават на гартань. І, безумоўна, неабходна абследавацца ў дзіцяці. Часцей за ўсё крапіўніца і ацёк Квінке маюць неалергічнае паходжанне. Праблемы могуць быць звязаны са страўнікава-кішачным трактам, нярэдка ў дзяцей крапіўніца можа з'яўляцца на фоне глістных інвазій. Трэба здаць аналіз калу на яйкагельмінтаў, зрабіць УГД органаў брушной поласці, фібрагастраскапію, агульны аналіз крыві з лейкацыфарнай формулай.

— Ці можа ён наведваць дзіцячы садок?

— Калі крапіўніца не моцна выражана — калі ласка. Гэта не заразна.

☎— Ганна Сцяпанаўна са Слуцкага раёна тэлефануе. У мяне ўжо гадоў пяць бранхіт. Начамі вельмі дрэнна сплю: кашаль, макрота ў глотцы. Прымаю кетакс раз у дзень, сіропы. Але дапамагае дрэнна. Чым лячыцца?

— Па тым, што вы расказваеце, гэта зусім верагодна, што бранхіяльная астма. Але ўсё ж трэба разабрацца, можа, гэта і хранічны бранхіт. Абавязкова трэба звярнуцца да тэрапеўта або алерголага. Каб правільна лячыць хваробу, трэба правільна паставіць дыягназ. А пакуль магу сказаць, што кетакс гэта не той прэпарат, які вам трэба прымаць. Па-першае, ён прымаецца не раз на дзень, а двойчы на суткі, раніцай і вечарам. Па-другое, ад гэтага прэпарату ў вас дрэнна адыходзіць макрота. Абавязкова трэба абследавацца. Магчыма, вам патрэбны інгалятары, бо лепш, калі лекі дастаўляюцца адразу ў бронхі. Лекавыя сродкі на сёння ёсць і для бранхіту, і для астмы. Лячэнне можна падабраць.

☎— На провадзе Жодзіна. У маёй малодшай дачкі, якой 10 месяцаў, дыятэз. Скура дрэнна рэагуе на некаторыя прадукты. Як быць? Можа, ёсць прэпараты, якія нам дапамогуць?

— За харчаваннем трэба абавязкова сачыць. Паспрабуйце выключыць тыя прадукты, якія «падтрымліваюць» дрэнную скуру і па магчымасці выключыць іх з рацыёну. Неабходна весці харчовы дзённік, каб фіксаваць усё, чым вы корміце дачку, і ўбачыць, ад якіх прадуктаў ёй становіцца горш. У перыяд абвастрэння для мясцовага лячэння рэкамендуюцца гарманальныя мазі, нават маленькім дзецям.

— А ці не адаб'ецца гэта на далейшым здароўі дзяўчынкі?

— У першую чаргу трэба спыніць хваробу. Акрамя таго, гэтымі мазямі нельга злоўжываць. Мазаць трэба 5—7 дзён танюткім слоем. Калі гэтага будзе недастаткова, магчыма, варта папрымаць унутр антыгістамінныя прэпараты.

— А ці можна, каб у нас дома былі кветкі?

— Я думаю, што кветкі не ўплываюць на цячэнне гэтай скурнай праблемы.

☎— Тэлефаную са Шклова. У маёй дачкі алергія на пыл, на грыбы. З'яўляецца ацёчнасць на павеках, пачырванене. Як гэта лячыць?

— Павінны дапамагаць супрацьалергічныя антыгістамінныя прэпараты. Калі ж маюцца станоўчыя пробы на хатні пыл, ёсць чханне, рыніт, то магчымае лячэнне алергенамі хатняга пылу. З гэтым справіцца можна.

☎— Турбуе Навагрудак. Маёй дачцэ паставілі дыягназ «ларынгаспазм». У яе кашаль, хрыпы. Ноччу дрэнна дыхае, прыступы ўдушша. Даю тавегіл — не дапамагае. Як быць?

— Справа ў тым, што часцей за ўсё так працякаюць алергічныя хваробы. І тое, што сімптомы ўзнікаюць у сваёй кватэры, гаворыць аб тым, што іх выклікаюць бытавыя алергены: пыл, пяро, падушкі. Вы ўбралі з дому пасцельныя рэчы з пер'я, ваты, дываны з поўсці, мяккія цацкі?

— Не.

— Гэта трэба абавязкова зрабіць. Таксама неабходна рэгулярна праводзіць вільготную ўборку, усе кнігі захоўваць за шклом. У пакоі, дзе дзіця праводзіць больш за ўсё часу, павінны знаходзіцца толькі самыя неабходныя рэчы. Калі вы гэта зробіце, то ўбачыце, што ўжо будзе лепш. Калі ж начныя прыступы ўдушша будуць заставацца, значыць, патрэбна лячэнне. Як правіла, пры дапамозе гарманальных інгалятараў тыпу бікладжэту, бікатыду, флексатыду. Гэтыя прэпараты аказваюць супрацьзапаленчае лячэбнае дзеянне. І абавязкова дома трэба мець сродкі хуткай дапамогі для зняцця прыступаў удушша. Лепш, каб гэта былі лекі ў выглядзе інгалятараў, каб прэпарат адразу трапляў у бронхі: сальбутамол або біратэк.

☎— Мяне завуць Ганна Максімаўна. Званю са Стоўбцаў. Унуку 7 гадоў, у яго алергія. Спецыялісты рэкамендуюць спецыяльную дыету, пры якой поўнасцю выключаецца садавіна і гародніна — і чорная, і чырвоная. Фактычна хлопчык не ўжывае вітамінаў. А як жа яму харчавацца, бо дзіця павінна развівацца, і вітаміны тут адыгрываюць не апошнюю ролю. І яшчэ на апельсіны ва ўнука ёсць алергія, а на мандарыны такой рэакцыі няма. Чаму так?

— Выключыць усю садавіну і гародніну з рацыёну, вядома ж, нельга, інакш з'явяцца іншыя праблемы. Каб больш канкрэтна вызначыцца з тымі прад

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (№ 31)

Па гарызанталі: Медуза. Абраннік. Батат. Латы. Опій. Марс. Кіт. Фара. Мяжа. Пух. Парог. Камбала. Вал. Кола. Ганак. Бал. Спрут. Амега. Драгун. Скат. Гана. Рана. Атара. Квазар. Бяда. Арк. Каломба. Бар. Рэтра. Эгаіст.

Па вертыкалі: Факір. Баку. Трум. Рама. Лета. Пава. Танкер. Акула. Сага. Амба. Халоп. Арбалет. Атос. Ная. Тып. Дамба. Імя. Арба. Ратай. Док. Карэ. Лапа. Кашара. Кардон. Газ. Лагуна. Грак. Нарысіст.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ШАЛЯЎ наведае творчы ўздым, а КАЗЯРОГІ атрымаюць станоўчыя эмоцыі

ВАЕН. Прыслухайцеся да таго, што гавораць іншыя. Не адкладвайце выкарыстанне шанца, які вельмі дарэчы падвярнуўся, далей, чым да серады, інакш ён сплыве ў іншыя рукі. У чацвер вас могуць уцягнуць у абсалютна бессэнсоўную спрэчку — пастарайцеся дастойна выйсці з гэтай сітуацыі. У выхадныя дні атрымаеце масу карыснай інфармацыі дзякуючы тэлефону.

ЦЯЛЕЦ. У панядзелак лепш адкласці заключэнне здзелак і дагавораў, падпісанне важных дакументаў, уладжванне юрыдычных пытанняў. У гэты дзень трымайцеся падалей ад усялякіх інтрыг і закуліснай валтузні. У аўторак настае добры час для збору інфармацыі: больш чытайце і будзьце больш уважлівымі да навінаў і нават плётак. У пятніцу пастарайцеся не ўступаць у новыя канфлікты, адмоўцеся, па магчымасці, нават ад звычайнага абмену думкамі з навакольнымі.

БЛІЗНЯТЫ. Могуць ажыццявіцца праекты, якія былі даўно адкладзены. Праявіце ініцыятыву і актыўнасць. Пры гэтым памятайце, што партнёры здольныя вас падтрымаць, але вам за гэта давядзецца ўдзельнічаць у вырашэнні чужых праблем. Чацвер — спрыяльны дзень для рэалізацыі доўгатэрміновых праектаў. Зараз вам па сіле самыя складаныя задачы. Аднак верагодны праблемы ў асабістым жыцці. У суботу будзе цяжка схавацца ад непрыемнасцяў. Магчымыя канфлікты ў сям'і, разрыў партнёрскіх адносінаў. Пастарайцеся не адчайвацца.

РАК. Падумайце пра будучыню. Не лішнім будзе прыслухацца да парад сяброў і калег, якім вы давяраеце. А грошы ў сумесны бізнэс зараз укладаць непажадана — не самы лепшы момант. Пачынаючы з сярэдзіны тыдня графік работы можа стаць вельмі напружаным — пастарайцеся не вельмі стаміцца да гэтага часу. Займайцеся творчасцю, часцей сустракайцеся з сябрамі — вам неабходна здымаць нервовыя перагрузкі.

ЛЕЎ. Неабходна засяродзіцца — лепш на малой, няхай не на самай галоўнай з задач. Для поспеху вельмі важны ўдалы старт. Вашу душэўную раўнавагу можа парушыць адчуванне, што згублены нейкі бліскучы шанц. Нічога падобнага! Насупраць, варта падзякаваць лёсу за тое, што вы шчасліва пазбеглі праблем, з гэтым шанцам звязаных. У аўторак не спяшайцеся з ініцыятывай — пастарайцеся спакойна выконваць свае паўсядзённыя абавязкі.

ДЗЕВА. Лепш за стыльнае адзенне і мадэльную прычоску вас упрыгожаць такія якасці, як дыпламатычнасць і цярпенне. Не забывайцеся пра свой дом, пажадана больш часу прысвяціць навядзенню парадку, пазбаўцеся ад непатрэбнага хламу і старых рэчаў. У сераду, вырашаючы пытанне з набыццём, парайцеся з блізкімі людзьмі. Пастарайцеся захоўваць спакой і разважлівасць. Не дазваляйце сабе затрымлівацца ў палоне ілюзій.

ШАЛІ. Вас можа чакаць творчы ўздым і, як вынік, нечаканая ўдалыя вырашэнні праблемных задач, якія патрабуюць узгадненняў з начальствам. У аўторак і сераду лепшым вашым упрыгажэннем будзе сціпласць — менавіта яна дазволіць пазбегнуць промахаў і недалікаў у рабоце. У другой палове тыдня лепш заняць пазіцыю чакання і рыхтавацца да кампрамісаў, якія дазволяць вырвацца наперад. Давядзецца даказваць ваш высокі прафесіяналізм.

СКАРПІЁН. Захочацца, каб усё ішло паводле плана, але для гэтага яго давядзецца не толькі скласці, але і ўпарадкаваць. Акрэпне ваша воля, стане лягчэй настойваць на сваім. Лішнія справы рашуча адмяціце — гэта спатрэбіцца вам і ў асабістым жыцці, і на рабоце. У аўторак будзьце больш уважлівыя да інфармацыі, якую атрымліваеце — тады вы апыняцеся ў патрэбным месцы ў патрэбны час. У чацвер магчымыя невялікія непрыемнасці ў сямейных справах. Адасоблены лад жыцця ў выхадныя дні толькі пойдзе вам на карысць.

СТРАЛЕЦ. Прадуманасць у дзеяннях пойдзе толькі на карысць вашай кар'еры. Нетрадыцыйны падыход дапаможа пры рэалізацыі творчых ідэй, задумаў і планаў. У панядзелак прывесці ў парадак справы будзе нялёгка, але неабходна. У аўторак лепш не разглядаць дзелавыя прапановы, бо вас можа падвесці недастатковая інфармацыя. Пачынаючы з чацвярга магчымыя кароткія паездкі. Заплануйце на выхадныя дні што-небудзь незвычайнае і арыгінальнае.

КАЗЯРОГ. Лепш за ўсё зайняцца паступовым асваеннем новай прасторы. Гэты перыяд прынясе зносіны з цікавымі людзьмі. У пачатку тыдня вас могуць азадачыць камандзіроўкай, з якой вы паспяхова справіцеся — чым заслужыце адабрэнне начальства. У сераду могуць абвастрыцца адносіны з калегамі: не варта даводзіць справу да канфліктнай сітуацыі. У пятніцу, перш чым прыняць адказнае рашэнне, ацаніце сітуацыю з розных бакоў і, пажадана, парайцеся з кім-небудзь. У нядзелю вас будуць акружаць камфортная абстаноўка і станоўчыя эмоцыі.

ВАДАЛЕЙ. Пастарайцеся не чапляцца за мінулае, якім бы бліскучым яно ні падавалася. З'явіцца магчымасць дабіцца поспеху адразу ў двух дыяметральна супрацьлеглых накірунках: добра адпачыць і істотна прасунуцца ў справах. У панядзелак да вас можа трапіць інфармацыя наконт новай работы. Перш чым згаджацца, неабходна ўсё прадумаць. У сераду не варта засмучацца па пусцяках. У суботу лепш не перамяшчацца на вялікія адлегласці.

РЫБЫ. Зможаце бліснуць вострым розумам, у вас ёсць усе шанцы стаць незаменным у кампаніі. Адпачывайце і весяліцеся ад душы. У сярэдзіне тыдня давядзецца крыху папрацаваць — аднак, як ні дзіўна, вы ўспрымеце гэта з лёгкасцю, калі не з задавальненнем. Прадэманструйце калегам вашы якасці лідара. Найбольш спрыяльныя дні на гэтым тыдні — чацвер і пятніца, неспрыяльны — аўторак.

Спорт-тайм

БУЛЫГА ЕДЗЕ Ў ЗБОРНУЮ

Збор беларускіх футбалістаў, якія рыхтуюцца да матчаў з Албаніяй (17 лістапада ў гасцях) і Галандыяй (21 лістапада дома), пачнецца ў Мінску 11 лістапада.

Ужо на наступны дзень падначаленыя Бернда Штанге адправяцца ў нямецкі Руйт, дзе адбудзецца падрыхтоўка да гульняў. Галоўны трэнер, які ўзяў было курс на амаладжэнне і шмат эксперыментаваў на полі, усё ж такі вырашыў вярнуць у склад дружыны вопытных ігракоў — нападаючага расійскай «Тамі» Віталя Булыгу, паўабаронцу «Тамі» Аляксандра Кульчыя і форварда італьянскай «Пізы» Віталя Кутузава.

САМБІСТЫ НЕ ПАДВЯДУЦЬ

«Ураджай» беларусаў на сёлетнім чэмпіянаце свету па самба ў Чэхіі будзе большым чым мінулы, калі нашы спартсмены заваявалі 3 чэмпіёнскія званні.

Ужо ў першы дзень спаборніцтваў беларускія самбісты здабылі 4 «золаты», 1 «срэбра» і 2 «бронзы». У спаборніцтвах жанчын чэмпіёнкамі сталі Настасся Ляшкова (вага да 64 кг) і Юлія Барысік (звыш 80 кг), сярод мужчын першынствавалі Андрэй Казусёнак (90 кг) і Юрый Рыбак (звыш 100 кг).

ПРЫЧЫНА СТАЦЬ ДОБРЫМ

Кожны чалавек жадае шчасця свайму дзіцяці. Але кожны ўкладае ў гэтае паняцце сваё: адны лічаць, што шчасце — гэта багацце, другія — здароўе, трэція — сям'я, чацвёртыя — вядомасць і г.д. Адпаведна людзі імкнуцца выхаваць сваіх дзяцей: навучаюць іх замежным мовам, аддаюць у музычныя школы альбо матэматычныя класы, секцыі, гурткі... З нядаўніх пор узнікла яшчэ адна навізна: у дзіцячых садках адкрыліся групы з праваслаўным выхаваннем. Яны сталі з'яўляцца пасля пагаднення, якое заключылі паміж сабой Беларуская праваслаўная царква і дзяржава. Але што гэта за групы, навошта яны патрэбныя, дзеля якога шчасця аддаюць туды бацькі сваіх дзяцей? Аляксандр БРОЙКА, дырэктар грамадскага аб'яднання «Цэнтр праваслаўнай асветы прападобнай Ефрасінні Полацкай» адказаў на пытанні «Звязды».

— Аляксандр Васільевіч, чаму неабходна было ствараць групы ў садках і факультатыўныя заняткі ў школе з праваслаўным выхаваннем?

— Сёння ў нашай краіне налічваецца больш за сто тысяч сем'яў царкоўна- і свяшчэннаслужыцеляў, а таксама прыхаджан, якія жадаюць рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права выхоўваць дзяцей у адпаведнасці са сваім сямейным ладам і праваслаўнымі традыцыямі беларускага народа. Цэнтр узяў на сябе задачу распрацаваць праграму для такіх дзяцей у садках.

Яшчэ ў пачатку 90-х гадоў неруйнадушныя педагогі з Расіі і Беларусі ўбачылі, што сістэма адукацыі, якая існавала ў той час, сябе вычарпала ў пытаннях духоўна-маральнага выхавання. Відавочна было, што трэба нешта радыкальна змяніць. Савецкія ідэалы рухнулі і было незразумела, куды далей рухацца. Беларуская і расійская групы педагогаў сустрэліся на Першых Праваслаўных Калядных чытаннях у Маскве. Мы здзівіліся, што ўсе тыя пытанні, якія турбавалі нас, беларускіх педагогаў, даўно адкрытыя, і ўжо былі спробы стварэння праваслаўных груп, класаў, праграм, і нават праваслаўных дысцыплін у расійскіх школах.

Мы, натхнёныя гэтай сустрэчай, вярнуліся ў Мінск і адкрылі «Цэнтр праваслаўнай асветы прападобнай Ефрасінні Полацкай». З таго часу сталі з'яўляцца асобныя праваслаўныя групы, гурткі ў Мінску, Жодзіне, Барысаве і Віцебску. Наш Цэнтр разам з Міністэрствам адукацыі і Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка распрацавалі юрыдычную і навукова-метадычную базу, а таксама спецыяльную праграму для груп з праваслаўным выхаваннем. На сёння ўжо 19 устаноў адукацыі ўкараняюць гэтую праграму. Яшчэ каля 30 дзіцячых садкоў самі выказалі жаданне ўзяцца за гэтую справу.

— Што мае на ўвазе праваслаўная праграма?

— Больш правільна казаць не «праваслаўная праграма», а праграма духоўна-маральнага выхавання на праваслаўных традыцыях беларускага народа. У такіх групах навучанне вядзецца па агульнаадукацыйнай дзяржаўнай праграме, і як дадатак да яе — духоўна-маральнае праваслаўнае выхаванне. Неафіцыйна мы таксама называем такія групы групамі для дзетак з праваслаўных сем'яў, бо менавіта па жаданню бацькоў магчыма арганізаваць падобную групу ў садку. Аднак былі выпадкі, калі дзяцей туды аддавалі бацькі-католікі і бацькі-мусульмане. Першым было важна, што выхаванне будуецца перш за ўсё на хрысціянскіх каштоўнасцях. А другія кіраваліся тым, што, жывучы ў праваслаўнай краіне, трэба ведаць яе культуру.

— Праваслаўныя групы, колькі я заўважыла, звычайна — рознаўроставыя. Так было задумана?

— Стварэнне праваслаўнай групы, як правіла, цікавіць чалавека, для якога храм — гэта больш чым месца, дзе можна проста паставіць свечку. Такіх людзей нават сярод тых, хто лічыць сябе праваслаўным, няшмат. Таму, калі мы пачыналі, то збіралі дзяцей з розных груп. Нам арганізацыйна лягчэй было стварыць менавіта розналетаставую групу. Але гэта не супярэчыла і традыцыйнаму выхаванню: у вялікіх сем'ях заўсёды старэйшыя клапоцяцца пра малодшых, малодшыя ставяцца да старэйшых з павагай. Гэта аказалася вельмі цікава і з педагагічнага пункту гледжання. Таму мы і сёння не адмаўляемся ад такіх груп. Хоць арганізацыйная патрэба ў гэтым адпала і ў некаторых садках ёсць групы па ўзростах. Сёння ўжо існуюць чэргі ў групы з духоўна-маральным выхаваннем.

Мы ўжо гаворым аб стварэнні пераемнасці паміж садком і школай. У некаторых пачатковых школах мы маем усю вертыкаль: першы, другі, трэці і чацвёрты класы, у якіх праходзяць факультатыўныя заняткі па нашай праграме. Першая група дзяцей, якая прайшла выхаваўчы працэс з яе ўлікам, перайшла ўжо ў пяты клас. Сёння мы распрацоўваем праграму для шостага класа. Нашы праграмы растуць разам з дзецьмі.

— Цікава, як на практыцы праводзяцца агульнаадукацыйныя заняткі для дзетак розных узростаў. Для трохгадовага і пяцігадовага заданні зусім розныя і па форме, і па змесце...

— Для вопытнага педагога гэта не праблема. З аднымі дзецьмі ён выбірае адну форму працы, з іншымі — іншую. Дзеткі ў працэсе такіх заняткаў вучацца ўзаемадзеянню. На пачатку года я бачыў такую карціну. Прыйшлі новенькія, маленькія дзеткі ў групу, старэйшыя ўзялі іх за ручкі і павялі ў пакойчык, дзе праходзяць заняткі, і пакуль выхавальніца займалася дакументамі, яны паказвалі рэпрадукцыі і расказвалі, што на іх намалявана. Старэйшыя дзеткі апякаюць малых.

— Вы кажаце: група з духоўна-маральным выхаваннем, але ж і ў звычайных садаўскіх групах дрэннаму не вучаць...

— Так. Але дзіця ў садку знаходзіцца да 12 гадзін у суткі і многім праваслаўным бацькам вельмі важна, каб іх дзіця выхоўваў чалавек веруючы, праваслаўны. Каб не было занадта вялікай розніцы паміж атмасферай у сям'і і ў садку, каб дзіцяці і там і там казалі пра адны і тыя ж каштоўнасці: што важна, напрыклад, дараваць і самому прасіць прабачэння, што дзяўчынкі павінны паводзіць сябе як дзяўчынкі, а хлопчыкі — як хлопчыкі... У праваслаўных групах больш увагі надаецца выхаванню міласэрнасці, цярплівасці і працавітасці. Там у прынцыпе галоўная мэта — выхаваць чалавека, які здольны арыентавацца, дзе дабро і дзе зло.

— Ці не занадта адарваныя вашы дзеці ад навакольнага свету? Я хачу сказаць: ці не ўзнікае ў іх праблем у зносінах з аднагодкамі, якія не наведваюць праваслаўныя групы?

— Такога могуць баяцца толькі тыя, хто ніколі не бачыў нашых выхаванцаў. Я растлумачу чаму. Усе гэтыя гады наша праца праходзіла ў цесным узаемадзеянні з Міністэрствам адукацыі. Вядзецца навуковая і метадычная праца, у якой удзельнічае вялікая колькасць вучоных, вядучых метадыстаў, педагогаў. Напрыклад, сярод іншых праграму распрацоўвала намеснік дэкана дашкольнага факультэта педагагічнага ўніверсітэта імя Танка Таццяна Паздзеева. Навуковым кіраўніком была дэкан факультэта псіхалогіі гэтай жа ўстановы Людміла Фінкевіч. Калі мы ўводзілі праграму ў садок, то наша праца праходзіла пад наглядам вучоных і метадыстаў. У пачатку эксперыменту праводзіўся псіхалагічны зрэз дзетак нашай групы і дзетак у звычайнай групе па трох методыках. Потым, у канцы года, параўналі вынікі. Малыя сталі заўважна больш вясёлыя, дружалюбныя, сумленныя, цярплівыя, міралюбівыя і чулыя. Мне здаецца, што менавіта такія дзеці лягчэй знаходзяць сабе сяброў.

Не трэба думаць, што нашы дзеці толькі і робяць, што моляцца з выхавальнікамі. Гэта звычайныя групы са звычайнымі дзецьмі, якія сварацца, мірацца, гуляюць. Проста дзякуючы таму, што ім дае дадаткова выхавальнік, яны ідуць у школу больш багатымі духоўна, больш развітымі. Сёння даказана, што ў школе, менавіта ў тых класах, дзе рэалізуецца наша факультатыўная праграма, мы здымаем шмат псіхалагічных праблем ва ўзаемаадносінах паміж дзецьмі і ў адносінах паміж бацькамі і дзецьмі. І гэта вельмі добра.

— Калі такія дзеці вырастуць, ці не будуць яны «белымі варонамі» ў любым калектыве, сярод людзей, далёкіх ад царквы?

— Калі чалавек не крадзе, не маніць, не п'е, не курыць — няўжо гэта ўскладняе яго жыццё да невыноснасці? Памыляецца той, хто так думае. Наадварот, дзіця, якое атрымлівае ў дзяцінстве маральны стрыжань і маральны арыенцір, вырастае ўнутрана больш моцным і больш шчаслівым. Пра гэта сведчыць уся гісторыя чалавецтва. Чаму моцным? Напрыклад, у сталінскіх «гулагах» і фашысцкіх канцлагерах, у любых цяжкіх жыццёвых абставінах верніку лягчэй вытрымаць і захаваць сваю годнасць — яго ратуе вера ў Бога!

Чаму шчаслівым? Таму, што будзе паступаць з іншымі так, як хоча, каб паступалі з ім. Многія лічаць, што гэтаму можна навучыць і па-за праваслаўнай культурай, але атэістычны перыяд жыцця нашай краіны паказаў, наколькі гэта цяжка. Справа ў тым, што тыя механізмы ў выхаванні, якія мы імкнёмся прымяняць, былі выпрацаваны і выпрабаваныя на працягу тысячагоддзяў. Чалавек за ўсю сваю гісторыю так і не змог прыдумаць нічога лепшага, чым тое, што даў Хрыстос. Першае, чаму мы вучым дзяцей — цаніць кожны дзень як дар. А гэта ўжо важная ўмова для таго, каб дзіця вырасла шчаслівым.

Таксама мы не назіралі ніякіх праблем у адаптацыі нашых дзетак у звычайнай школе. Я кажу пра тых, якія трапляюць у звычайныя класы. Класаў з праваслаўным факультатывам пакуль няшмат. Больш за тое, нашы дзеці з задавальненнем прыходзяць са сваімі новымі сябрамі ў групу да сваіх выхавальнікаў на праваслаўныя святы. Унутры іх жыве нібыта нейкая цеплыня да месца, у якім прайшло некалькі гадоў іх дзяцінства. Псіхолагі адзначылі, што яны больш камунікабельныя, яны знаходзяць агульную мову з любымі дзецьмі. Безумоўна, мы не можам гарантаваць, што абсалютна ва ўсіх нашых дзяцей жыццё будзе беззаганным... Прымаць рашэнне, як жыць, будуць яны самі, проста ў іх будзе больш прычын стаць добрым чалавекам.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Забытае? Новае? Вечнае!

Ці трэба кідаць ручнікі (вяроўкі) у магілу?

Зінаіда Іванаўна з Мінска расказвае пра незвычайныя паводзіны людзей, з якімі яна сутыкнулася падчас пахавання сваяка на сталічных могілках. Пры гэтым праводзіць параўнанне з абрадам, які існаваў некалі ў іх вёсцы ў Кіраўскім раёне. *«Труну з нябожчыкам у магілу даўней апускалі на ручніках, а пазней на вяроўках або лейцах, якія нельга было кідаць у магілу, бо «за імі ішло ўсё жывое». Маці не раз расказвала, што ў тых сем'ях, у якіх вяроўкі кідалі ў магілу, адзін за адным паміралі сваякі. Калі ж я ўбачыла, як на гарадскіх могілках вяроўкі кінулі ў магілу, то прымусіла мужчыну дастаць іх назад. Але сваякі пачалі гаварыць: «Калі табе шкада гэтых ручнікоў, мы табе новыя купім!» Як жа правільна паступіць у такім выпадку?»*

У гісторыі славянскіх народаў існавала тры варыянты стаўлення да ручнікоў, на якіх труну з нябожчыкам апускалі ў магілу, і кожны з іх абапіраўся на сваю сістэму светапоглядных уяўленняў, якая пераважала ў той ці іншай мясцовасці. Пры гэтым аналізуемае рытуальнае дзеянне лагічна ўпісвалася ў больш шырокія абрадавыя кантэксты, не ўзгадаўшы якія мы проста не зразумеем сэнс рытуалу і месца розных атрыбутаў у ім.

Давайце ўзгадаем некаторыя з іх, каб убачыць тэндэнцыю і зразумець матывы паводзінаў людзей. На Масленіцу вясковая моладзь рабіла пудзіла Зімы і спальвала яго на самым высокім месцы. У некаторых мясцінах ***чучала разрывалі***, і ***кожны*** прысутны ***браў*** *сабе* ***шматок*** саломы, каб затым аднесці на свой прысядзібны ўчастак і ўтаптаць у снег, тым самым перадаць спарыну мінулагодняга ўраджаю новаму. Госці, якія бралі ўдзел у святкаванні хрэсьбін, выкупляліся ***бабіну кашу***, пасля чаго гаршчок з ёю разбівалі аб стол («колькі чарапочкаў, столькі сыночкаў») і ***дзялілі паміж удзельнікамі застолля.*** На Вялікдзень перад тым, як распачаць святочную трапезу, старэйшы член сям'і браў асвечанае ў царкве ***яйка*** і ***дзяліў*** яго ***на столькі кавалачкаў, колькі чалавек сядзела за сталом***. Тое ж самае рабілі і з яблыкам, які асвячалі на Яблычны Спас. А ў які шыкоўны і непаўторны спектакль ператвараўся заключны рытуал беларускага вяселля — дзяльба каравая! Прадстаўнікі кожнай сям'і з боку жаніха і нявесты адорвалі маладых розными падарункамі, а за гэта ***атрымлівалі кавалак свяшчэннага хлеба,*** які разразалі на столькі частак, колькі гасцей было на вяселлі. Усе пералічаныя кантэксты абрадавых падзей сведчаць пра тое, што адной з самых старажытных светапоглядных установак славян было ўсеагульнае далучэнне ўдзельнікаў абраду да прадуцыравальнай моцы атрыбута-абярэга, які прайшоў асвячэнне ў ходзе святочных падзей. Таму адным з найбольш ранніх па часе існавання быў той варыянт абраду, калі ***пахавальны ручнік разрывалі і раздавалі ўсім удзельнікам пахавання.*** Чалавек падыходзіў да краю магілкі, кідаў тры жменькі пяску і адыходзіў убок, а мужчыны, якія капалі дол, адрывалі палоску ад ручніка і аддавалі яму. (Гэтую палоску затым выкарыстоўвалі для лячэння суставаў і іншых захворванняў.)

Існаваў другі варыянт стаўлення да асноўных атрыбутаў святочных падзей. Напрыклад, грамнічныя свечкі, галінкі асвячонай вярбы, спасаўскі мак і многае іншае прыносілі дадому і захоўвалі ў якасці абярэгу хаты і яе дамачадцаў. У рэдкіх выпадках пахавальны ручнік таксама прыносілі дадому і захоўвалі як важны сродак народнай медыцыны. З яго дапамогай лячылі падчуюю хваробу ў дзяцей і дарослых. Аднак радзіні гэта толькі вопытныя знаўцы таямніц народнай медыцыны. Пры гэтым неабходна заўважыць, што **такі ручнік не дазвалялася ўносіць у жыллёвае памяшканне, яго захоўвалі ў каморы, кладоўцы, у сенцах, у сучаснай гарадской кватэры — не далей прыхожай.**

Трэці варыянт стаўлення да пахавальнага ручніка пашыраны практычна на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Пасля таго як над магілай паставяць крыж, ручнік павязвалі на яго перакладзіне, звяртаючы ўвагу на вельмі важную акалічнасць. Калі хавалі жанчыну, то вузел павязвалі на левы бок, калі ж мужчыну, то на правы бок. Як і ўсе астатнія прадметы пахавальнага абраду, захоўваўся пахавальны ручнік на працягу года, пасля чаго на Радаўніцу новыя ручнікі павяжуць толькі на тыя надмагільныя крыжы, якія будуць узвышацца над магіламі, дзе пахаваны мужчыны.

Таму як гэта ні парадаксальна гучыць, але замест таго, каб сварыцца на аўтарку нашага ліста, сваякі яе павінны схіліць перад ёй галаву і падзякаваць за праяўленую настойлівасць. Зінаідзе Іванаўне шкада стала (і зусім абгрунтавана!) не ручнікоў, а блізкіх людзей, якія маглі ад непаразумення справаваць яшчэ большую бяду.

Аднойчы мы бачылі, як у Смалявіцкім раёне кідалі ў магілу купленую ў краме посцілку (ёй накрывалі труну). Так, сапраўды, некалі — у сівой даўніне — нябожчыка загортвалі ў белы саван, але ж тады не было такой труны, як зараз. Хоць водгук далёкай традыцыі захаваўся ў тым, што і сёння нябожчыка ў труне ад ног і да пояса мы закрываем тканінай белага колеру. У такім разе яшчэ адзін покрыў нікому не патрэбен. А вось уявіце сабе, што гэтым мануфактурным вырабам маглі карыстацца жывыя, а затым яго кінулі ў дол. Ці не нашкодзіць падобнае адвольнае прачытанне абрадавых падзей стану здароўя іх былых уладальнікаў?..

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

БЛІЦ-36

У якасці яго заданняў, як звычайна, падаём кампазіцыі нашых чытачоў, створаныя імі або самастойна, або ў сааўтарстве:



№ 1 (Пётр Шклудаў, Наваполацк). БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, e5, e7, f6, g5, h6 (8).ЧОРНЫЯ: a5, c3, d4, e3, f2, f4, g3, h2, h4 (9).

№ 2 (Дзмітрый Камчыцкі, Магілёў). БЕЛЫЯ: d2, дамка e7 (2). ЧОРНЫЯ: b2, g3, дамка a1 (3). Нічыя.



№ 3 (Васіль Грабенка, Мінск). БЕЛЫЯ: b4, d6, e3 (3). ЧОРНЫЯ: a7, g3, h8 (3).

Праблема і эцюды складзены на падставе заданняў вядучага рубрыкі, якія ім даваліся ў папярэдніх конкурсах.

№ 4 (Пётр Кажаноўскі, Пінск). БЕЛЫЯ: дамкі h2, h8 (2). ЧОРНЫЯ: b4, e3, дамка a1 (3).

№ 5 (Міхаіл Стэфановіч, Гродна). БЕЛЫЯ: b6, c5, d4, d6, e3, e5, f4, g1, h2 (9). ЧОРНЫЯ: a3, a7, b8, f2, f8, g3, h2, h8 (8).

У заданнях №№ 1, 3, 4 і 5 выйгрыш белых.

Пераможцу чакае сюрпрыз ад ветэрана працы Анатоля Антонавіча Пярхальскага (Глыбокае) — яго Зборнік звяздоўскай шашачнай рубрыкі за 2005 год. Такія Зборнікі ён падрыхтаваў і за 2004 і 2006 гады, якія, як і сам конкурс, прысвячае 90-годдзю газеты «Звязда».

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

РАШАЕМ, СКЛАДАЕМ САМІ

Праверце, калі ласка, рашэнні заданняў класіфікацыйнага конкурсу (М. Грушэўскі):

№ 1 (сааўтар У. Сапяжынскі). 1. cd8 2. da5 3. a:e7 4. h:g1#;

№ 2 (сааўтары В. Грабенка і П. Шклудаў). 1. cd8 2. db6 3. bd8 4. d8:e1:e7 5. h:g1#. П. Шклудаў ускладніў ідэю (гл. заданне № 1 бліц-конкурсу-36);

№ 3. 1. gf6 2. ed4 3. a:e7 4. h:a7x;

№ 4. B8 (h2) f2 (b2) e3 (c1A) a7, d4=. A(h4-g3) d4 (a1) be5 (f2) h8, g1=;

№ 5 (у натацыі). 1. fg7 2. de7 3. cb8 4. b:e1x;

№ 6 (у натацыі). E7 (h4A) f8 (c1) h6=. A (c1) d8, h4=. Астатнія варыянты не кампазіцыйныя, у эцюдах яны не ўлічваюцца і таму не прыводзяцца.

Рашылі: В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), А. Пярхальскі (Глыбокае), В. Краўчук і С. Нячаеў (Баранавічы), У. Барысёнак, А. і Ю. Мікулічы і У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Кіслы (Узда), І. Мацкевіч (Жодзіна), А. і І. Ашыхміны і У. Ціханаў (п/а Рудаўка Нясвіжскага раёна), І. Астроўскі (Мінск), І. Буяк (п/а Канвелішкі Воранаўскага раёна), А. Т. Янчук і яго вучні Дзяніс Семянюк, Таццяна Трацюк і Дзіяна Шаўчук (Камянец), В. Гаўрыш (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна), А. Агіевіч (Кобрын), В. Жукоўскі (г. Барань), А. Пераўзнікаў (Рагачоў) і інш.

А вось у заданні № 4 наступныя рашальнікі знайшлі прыватную пабочную развязку 2. ba7= і зарабілі прэміяльныя ачкі: У. Сапяжынскі (Рагачоў), У. Аўласенка (Гродна), І. Працук (Паставы), С. Гурынавіч (Мінск), Аляксандра Камінская (Вілейка), К. Козел (в. Лассона Гродзенскага раёна), А. Белы, В. і Р. Мурашкі і М. Падбярэзскі (Наваполацк), В. Грабенка, Д. Камчыцкі і П. Шклудаў. Д. Камчыцкі некалькі перарабіў гэты эцюд (гл. заданне № 2 бліцконкурсу-36).

БРАЗІЛЬСКІЯ ШАШКІ (М. Грушэўскі): 1. hg3 2. gf4 gh4 3. f:d2 hg3 4. de3 gh2 5. ef4 hg1 6. bc3 gh2? 7. ab6! h:b2/a1 (біць большасць фігур абавязкова) 8. b:d8. Тэарэтычная нічыя. Але ж 6. ... gf2/ c5/b6/a7 7. fg5 d4x. Указалі І. Астроўскі і В. Грабенка. Апошні пераставіў c1 на a1 і таксама паказаў перамогу за чорных: 1. ab6 c:c3! (у бразільскіх шашках нельга 1. ...c:a7) 2. b:b6 gf4! 3. ba7 ed2! 4. ab2A de1 5. bc3 l e:a5 6. ab8 ae1x. l 5. ... b4? 6. hg3 7. ab8 dc5 8. e5=. A4. hg3 5. ab8 dc1x. Калі змяніць колер шашак, атрымліваецца эцюд (гл. заданне № 3 бліцконкурсу-36).

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПРЫРОДНАЯ АПТЭКА

Падарункі сціплай вольхі

Здавалася б, што яшчэ можна нарыхтаваць для лячэння позняй восенню, калі і лісця на дрэвах амаль не засталося? Аднак прыродная кладоўка не вычэрпваецца ніколі. Паглядзіце на вольху. Толькі цяпер паспелі яе шышкі, таму лістапад — самы час іх збіраць, сушыць і гатаваць настойку. Нямногія лякарствы могуць параўнацца з імі па сіле.

ХАТНЯЯ «ХУТКАЯ ДАПАМОГА»

Раней альховыя шышкі трымалі ў кожным доме. Чым жа яны карысныя? Па-першае, гэта выдатны сродак хуткай дапамогі пры любых расстройствах страўніка, бо ў іх змяшчаецца шмат дубільных рэчываў, асабліва таніну, дзякуючы якому яны валодаюць моцнымі вяжучымі ўласцівасцямі. Па-другое, у альховых шышках выяўлены і розныя кіслоты, таму яны і добры прыродны процізапаленчы і кроваспыняльны сродак. Настойкі з шышак дапамагаюць пры крывацёках з носа ў дзяцей. А людзі сталага ўзросту цэняць альховыя шышкі за тое, што яны ратуюць ад рэўматызму і падагры, умацоўваюць дзясны, пазбаўляюць ад прастуды. Па-трэцяе, дасведчаныя людзі раяць трымаць іх пад рукою на выпадак жаночых хвароб (у прыватнасці фібраміёмы маткі). Гатуюць настойку так: *бяруць 1 частку шышак на 3 часткі гарэлкі. Настойваюць у цёмным месцы 7 дзён, працэджваюць, п'юць па 10 кропель 6 разоў на дзень перад ядой паміж прыёмамі ежы.*

ПАРАТУНАК ДЛЯ СТРАЎНІКА І КІШЭЧНІКА

Суплоддзі вольхі можна набыць і ў аптэцы. Яны ўваходзяць у склад лекавых зборай і дапамагаюць прывесці ў парадак страўнік і кішэчнік не горш, а нават лепш за многія хімічныя прэпараты. Пры гэтым яны не выклікаюць пабочных дзеянняў. Настой з шышак прызначаюць для барацьбы з дысбактэрыёзам і нармалізацыі кішэчнай флоры пасля лячэння антыбіётыкамі.

Заліце шклянкай кіпеню 2 ст. лыжкі альховых шышак, настойвайце 40 хвілін, прымайце па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень да яды і паміж прыёмамі лекаў.

Альховыя шышкі назначаюць нават пры вострых і хранічных энтэракалітах і дызентэрыі. Яны ўстараняюць брадзільныя і гніласныя працэсы, спыняюць дыярэю ўжо на другі дзень прыёму.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.27	16.19	8.52
Віцебск —	7.21	16.05	8.44
Магілёў —	7.17	16.10	8.53
Гомель —	7.08	16.12	9.04
Гродна —	7.41	16.36	8.55
Брэст —	7.36	16.42	9.06

Месяц

Апошняя квадра

Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Неанілы, Праскоўі, Арсенія, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Несцера, Сцяпана;*

К. *Наталлі, Нэлі, Андрэя, Любаміра, Льва, Лявона, Сцяпана.*

НАДВОР'Е на заўтра



▫ — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 сак.	5 сак.	8 сак.	11 сак.	14 сак.	17 сак.	20 сак.	23 сак.

...у суседзяў

ВАРШАВА	0..+2°С	**КІЕЎ**	-1..+1°С	**РЫГА**	+1..+3°С
ВІЛЬНЮС	0..+2°С	**МАСКВА**	-2..0°С	**С.-ПЕЦЯРБУРГ**	-1..+1°С

Дзве даты

10 лістапада

1632 год — 375 гадоў таму каралём Польшчы і вялікім князем Вялікага княства Літоўскага абраны Уладзіслаў Ваза (сын Жыгімонта III Вазы). Кіраваў да 1648 года.

1917 год — Памесны сабор Рускай праваслаўнай царквы прыняў гістарычнае рашэнне аб аднаўленні Патрыяршаства, якое было скасавана Пятром I. На Свяшчэнным саборы ў храме Хрыста Збавіцеля Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі абраны мітрапаліт маскоўскі Ціхан.

Цытата дня:

«Ідзі сваёй дарогай, і хай людзі гавораць, што хочуць».

Дантэ Аліг'еры (1265—1321), італьянскі паэт.

УСМІХНЁМСЯ!

Археолагам да заўвагі. Самыя цікавыя знаходкі — пад адсунутай канапай.

☺

Гаспадыня спявае ў гасцінай. Раптам яна спыняецца і крычыць пакаёўцы:

— Марыя, не дазваляйце сабаку выць, калі я спяваю!

— Мадам, гэта не сабака, гэта ваш муж!

☺

— Барыс, гэта праўда, што цябе ўчора збілі на вакзале?

— Мяне?! На вакзале?! Які там вакзал — паўстанак!

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже в Пуховичском районе обращенного в доход государства имущества:

- здание конторы общей пл. 258,5 кв.м, д. Пуховичи, ул. Садовая, д. 22. Начальная цена — 62 138 777 бел. рублей;
- здание свинарника № 1 общей пл. 556,5 кв.м, д. Габриелевка. Начальная цена — 75 475 443 бел. рублей;
- линий ЛГТВ 90-250 591985 ПС и ЛГП, г.п. Руденск, ул. Октябрьская, д. 11. Начальная цена соответственно 1 233 738 бел. рублей и 930 585 бел. рублей;
- прессов ПГ-69 (15 лотов), г.п. Руденск, ул. Октябрьская, д. 11. Начальная цена лота от 830 156 бел. рублей до 1 106 875 бел. рублей. Начальные цены снижены на 10 %.

Подробные извещения опубликованы в газетах «Звязда» от 21.04.2007 г, 05.06.2007 г. и 08.08.2007 г. Аукцион состоится 27.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 26.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

Выстаўка жывапісных палотнаў, аб'яднаных у творчым праекце «Літва і Усходнія суседзі: дыялог у выяўленчым мастацтве» адкрылася ў памяшканні Літоўскай амбасады ў Мінску і прымеркавана да 15-годдзя дыпламатычных адносінаў паміж Літвою і Беларуссю. У выстаўцы ўдзельнічаюць прызнаныя майстры пэндзля трох краін — Беларусі, Украіны і Літвы.

Змест выстаўкі — геральдычныя матывы і гістарычныя персанажы, якія ў філасофскім разуменні ствараюць прастору часоў некалі агульнай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

На здымку: каля карціны вядомага літоўскага мастака Раймондаса Савіцкаса.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательный совет Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»
11 октября 2007 года
протокол № 20

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

ЗАВЕРЯЮ
Начальник управления по ценным бумагам Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по г. Минску
_____В.Н. Омельянович
25 октября 2007 года

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций тридцать второго и тридцать третьего выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

1. Наименование эмитента

- на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);

- на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

2. Банк зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 27.10.1995. Регистрационный номер 56.

3. Место нахождения эмитента, телефон, электронный адрес

Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32. Телефон – (017) 218 84 08, телефон/ факс – (017) 222 26 26. E-mail - info@belarusbank.by.

4. Основные виды и срок деятельности эмитента

В соответствии с законодательством Республики Беларусь и на основании специального разрешения (лицензии) Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности Банк осуществляет следующие банковские операции:

- привлечение денежных средств физических и юридических лиц во вклады (депозиты);
- размещение привлеченных денежных средств от своего имени и за свой счет на условиях возвратности, платности и срочности;
- открытие и ведение банковских счетов физических и юридических лиц;
- открытие и ведение счетов в драгоценных металлах;
- осуществление расчетного и кассового обслуживания физических и юридических лиц, в том числе банков-корреспондентов;
- валютно-обменные операции;
- купля-продажа драгоценных металлов в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь;
- привлечение и размещение драгоценных металлов во вклады (депозиты);
- выдача банковских гарантий;
- доверительное управление денежными средствами по договору доверительного управления денежными средствами;
- инкассация наличных денежных средств, платежных инструкций, драгоценных металлов и иных ценностей;
- выпуск в обращение банковских пластиковых карточек;
- выдача ценных бумаг, подтверждающих привлечение денежных средств во вклады (депозиты) и размещение их на счета;
- финансирование под уступку денежного требования (факторинг);
- предоставление физическим и юридическим лицам специальных помещений или находящихся в них сейфов для банковского хранения документов и ценностей (денежных средств, ценных бумаг, драгоценных металлов и драгоценных камней и др.);
- перевозка наличных денежных средств, платежных инструкций, драгоценных металлов и драгоценных камней и иных ценностей между банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями, их обособленными и структурными подразделениями, а также доставка таких ценностей клиентам банков и небанковских кредитно-финансовых организаций.

Помимо банковских операций Банк вправе осуществлять в соответствии с законодательством Республики Беларусь:

- поручительство за третьих лиц, предусматривающее исполнение обязательств в денежной форме;
- доверительное управление драгоценными металлами и (или) драгоценными камнями;
- операции (сделки) с драгоценными металлами и (или) драгоценными камнями;
- лизинговую деятельность;
- консультационные и информационные услуги;
- выпуск (эмиссию), продажу, покупку ценных бумаг и иные операции с ценными бумагами;
- продажу лотерейных билетов;
- иную деятельность, предусмотренную законодательством Республики Беларусь.

Банк может осуществлять отдельные виды деятельности, перечень которых определяется законодательными актами Республики Беларусь, только на основании специального разрешения (лицензии).

Банк вправе осуществлять производственную и (или) торговую деятельность для собственных нужд, а также в случаях, предусмотренных законодательными актами Республики Беларусь.

Банк осуществляет следующие виды деятельности в соответствии с Общегосударственным классификатором видов экономической деятельности Республики Беларусь:

- страховое посредничество (деятельность страхового агента);
- сдача внаем собственного недвижимого имущества.

Срок деятельности Банка не ограничен.

5. Основные показатели финансово-хозяйственной деятельности Банка

Показатели	*2006 год*	*на 01.10.2007*
Прибыль, млн руб.	122 126,3	119 134,7
Рентабельность, %	10,1	11,4

6. Объем эмиссии, количество и вид облигаций

32-й выпуск:

объем эмиссии – **3 500 000** (Три миллиона пятьсот тысяч) долларов США;

количество – **7 000** (Семь тысяч) облигаций. Серия **«БВ»**, номера «000001–007000»;

вид – процентные, на предъявителя, документарные (в виде отпечатанных на бумаге бланков).

33-й выпуск:

объем эмиссии – **1 500 000** (Один миллион пятьсот тысяч) долларов США;

количество – **15 000** (Пятнадцать тысяч) облигаций. Серия **«БГ»**, номера «000001–015000».

вид – процентные, на предъявителя, документарные (в виде отпечатанных на бумаге бланков).

7. Номинальная стоимость облигаций

32-й выпуск:

номинальная стоимость облигации – **500** (Пятьсот) долларов США. В течение всего срока открытой продажи облигации продаются первому их собственнику по номинальной стоимости – **500** (Пятьсот) долларов США;

33-й выпуск:

номинальная стоимость облигации – **100** (Сто) долларов США. В течение всего срока открытой продажи облигации продаются первому их собственнику по номинальной стоимости – **100** (Сто) долларов США.

8. Начальный срок открытой продажи облигаций

Начальный срок открытой продажи облигаций: **10.12.2007.**

9. Место и время проведения открытой продажи облигаций

После опубликования краткой информации об открытой продаже облигаций Банка 32 и 33 выпусков (далее – облигации), заверенной в Управлении по ценным бумагам Главного управления по г. Минску Министерства финансов Республики Беларусь, фиксации обременения предмета залога, обеспечивающего исполнение обязательств по облигациям, и представления в регистрирующий орган копий документов, подтверждающих фиксацию обременения предмета залога, открытая продажа облигаций производится на внебиржевом рынке **с 10.12.2007 по 09.12.2008**, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

Открытую продажу облигаций осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего подразделения Банка.

Владельцами облигаций Банка могут быть физические лица – резиденты и нерезиденты, приобретающие их не в целях предпринимательской деятельности (далее – физические лица), РУП «Белорусские лотереи», РУП «Национальные спортивные лотереи» и Банк.

Физические лица, изъявившие желание приобрести облигации не в целях предпринимательской деятельности, обязаны внести наличными либо перечислить в Банк в безналичном порядке денежные средства в оплату облигаций.

РУП «Белорусские лотереи» и РУП «Национальные спортивные лотереи» для приобретения облигаций обязаны перечислить в Банк в безналичном порядке денежные средства в оплату облигаций.

Денежные средства от продажи облигаций будут поступать на соответствующие счета в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка.

10. Срок обращения облигаций

Срок обращения облигаций – **с 10.12.2007 по 31.12.2009**.

11. Условия и размер выплаты дохода по облигациям и порядок его определения

Выплата дохода по облигациям производится владельцам облигаций периодически в виде купонного дохода при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации по истечении определенных купонных периодов в соответствии со следующим графиком.

График выплаты купонного дохода по облигациям

Номер купона (процентного периода)	*Начало периода*	*Конец периода*
32-й выпуск		
1	10.12.2007	31.03.2008
2	01.04.2008	30.06.2008
3	01.07.2008	30.09.2008
4	01.10.2008	31.12.2008
5	01.01.2009	31.03.2009
6	01.04.2009	30.06.2009
7	01.07.2009	30.09.2009
8	01.10.2009	31.12.2009
33-й выпуск		
1	10.12.2007	30.06.2008
2	01.07.2008	31.12.2008
3	01.01.2009	30.06.2009
4	01.07.2009	31.12.2009

Днем начала выплаты соответствующего купонного дохода является первый день после истечения определенного купонного периода.

В случае, если дата начала выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день соответствующего подразделения Банка, выплата купонного дохода данным подразделением осуществляется в первый рабочий день, следующий за названным нерабочим днем. Проценты на сумму купонного дохода по облигации за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Начисление купонного дохода по облигации осуществляется со дня продажи соответствующей облигации по **31.12.2009** включительно.

Со дня истечения срока обращения облигаций купонный доход не начисляется.

Первый купонный доход по соответствующей облигации начисляется со дня ее продажи по день истечения купонного периода, в котором была произведена продажа данной облигации (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).

Второй и последующие купонные доходы по облигации начисляются со дня начала очередного купонного периода по день истечения данного купонного периода (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем). Дата окончания последнего купонного периода – **31.12.2009** (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).

Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, по процентной ставке равной **8 (Восемь)** процентов годовых.

Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = \frac{П * Н * t}{360*100}$$

где: Д – купонный доход;

t – количество дней соответствующей части купонного периода;

П – процентная ставка по купону в размере 8 (Восемь) процентов годовых;

Н – номинальная стоимость облигации.

При расчете купонного дохода по облигации количество дней в месяце условно принимается за 30. В месяцах, имеющих 31 день, 31-е число в расчет не принимается (за исключением случая, если этот день является днем продажи облигации), а в феврале купонный доход, начисленный на последний день февраля, повторяется столько раз, сколько дней не достает до 30.

При выплате купонного дохода по облигации наличной иностранной валютой Банк покупает у владельца облигации часть купонного дохода в размере менее минимального номинала банкноты иностранной валюты по обменному курсу покупки иностранной валюты, установленному в учреждении банка на момент совершения операции выплаты купонного дохода. Расчет купонного дохода производится с округлением в порядке, установленном в Банке при совершении операций по счетам физических лиц, связанных с выдачей наличных денег.

Выплата купонного дохода осуществляется филиалами, центрами банковских услуг Банка, структурными подразделениями Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка, начиная с первого рабочего дня соответствующего подразделения Банка со дня окончания соответствующего купонного периода. Последний купонный доход и иные неполученные владельцем облигации на момент погашения купонные доходы выплачиваются в день погашения данной облигации. Выплата части купонного дохода не производится.

В период погашения (**с 01.01.2010**) уплата неполученных владельцем облигации купонных доходов отдельно от возмещения номинальной стоимости облигации не производится.

12. Срок и порядок погашения (досрочного погашения) облигаций

Облигации Банка погашаются по требованию их владельцев при предъявлении оригинала облигации в Банк. При этом требование о погашении облигации должно быть предъявлено с **01.01.2010** по **30.06.2010**.

Требование о досрочном погашении облигации может быть предъявлено по истечении одного года с даты первичной открытой продажи соответствующей облигации.

Обязательства Банка по погашению облигаций, по которым в срок погашения названных облигаций не было предъявлено требование об их погашении с предъявлением оригиналов погашаемых облигаций, и обязательства по выплате дохода по данным облигациям после истечения вышеуказанного срока погашения прекращаются.

При погашении облигаций, предъявленных к погашению с **01.01.2010** по **30.06.2010**, владельцу возмещается номинальная стоимость облигаций, а также уплачиваются все неполученные владельцем облигаций купонные доходы наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

При досрочном погашении облигаций владельцу возмещается номинальная стоимость облигации, а также уплачиваются все неполученные владельцем облигаций купонные доходы, начисленные только за истекшие на день досрочного погашения купонные периоды, наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. За купонный период, в течение которого облигация предъявлена к досрочному погашению, купонный доход не выплачивается.

13. Условия отказа в продаже облигаций

В продаже облигаций Банка может быть отказано при непредставлении в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, справки налогового органа о представлении декларации об источниках денежных средств, вносимых в счет оплаты приобретаемых облигаций и других необходимых документов.

Операции с облигациями, подлежащие особому контролю в соответствии с законодательством о предотвращении легализации доходов, полученных незаконным путем, осуществляются при условии предъявления физическим лицом, совершающим операцию, документа, удостоверяющего личность, и других необходимых документов.

14. Условия и порядок возврата средств инвесторам при отказе от выпуска облигаций (запрете продажи)

В случае отказа от выпуска облигаций, Банк в срок не позднее 30 дней с момента принятия решения об отказе от выпуска возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по процентной ставке, равной 8 (Восемь) процентов годовых.

15. Место и время ознакомления с проспектом эмиссии облигаций

С проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их операционного времени.

Председатель Правления
ОАО «АСБ Беларусбанк» Н.А. ЕРМАКОВА

Главный бухгалтер
ОАО «АСБ Беларусбанк» И.П. ЛЫСОКОВСКАЯ

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

НОВЫ АЎТОБУСНЫ МАРШРУТ

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў КУП «Мінсктранс», з мэтай паляпшэння транспартнага абслугоўвання сталічнага мікрараёна «Лошыца» з 12 лістапада 2007 года ў Мінску арганізоўваецца работа новага аўтобуснага маршрута № 124 «ДС «Лошыца-2» — станцыя метро «Пушкінская», які будзе рухацца па вуліцах Прушынскіх, Сыракомлі, Шпілеўскага, па Ігуменскім тракце, вуліцах Маякоўскага, Дзянісаўскай, Аэрадромнай, па праспектах Жукава і Пушкіна ў прамым і зваротным накірунках.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АХ, КОНІ МАЕ, КОНІ...

Двое жыхароў в. Русіна, што пад Баранавічамі, укралі ў Лунінецкім раёне пару коней і вярталіся ў прыўзнятым настроі дамоў. Але дарога была далёкай і адзін конь нечакана закульгаў на Ганцаўшчыне. У в. Кукава зладзеі ціха ўзялі з хлява ў аднаго гаспадара здаровага каня, а яму пакінулі кульгавага. Але гэтага канакрадам паказалася мала і вечарам таго ж дня з двара на станцыі Малькавічы яны выкралі і воз.

Праўда, ад'ехаць зладзеям далёка не ўдалося. Міліцыя па гарачых слядах неўзабаве іх дагнала.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Віншуем нашу абаяльную, прыгожую, інтэлектуальную, мілую жанчыну КАРАМАЗАВУ Лідзію Мікалаеўну з нагоды юбілею. Жадаем сямейнага шчасця, здароўя, спакою, дабрабыту.

Родныя, дзеці, сёстры, сябры.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит открытый аукцион по продаже здания казармы 4/1 (общ. пл. 1606,6 кв.м), расположенного: Логойский р-н, г.п. Плещеницы, Военный городок, 4. Площадь зем. уч. 0,1089 га. Начальная цена снижена на 20 % и составляет — 413 100 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.09.2007 г. Аукцион состоится 29.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства объектов: **Лот № 1**: здание компрессорной, об. пл. 51,1 кв.м, 7 200 000 бел. руб; **Лот № 2:** бензосклад с емкостями, в т.ч емкости и колонки, об. пл. 49,1 кв.м, 16 200 000 бел. руб. Объекты расположены по адресу: Солигорский район, г.п. Старобин, ул. Дризгаловича, 1. Начальные цены снижены на 10 %. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.06.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26.11.2007 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **23.11.2007** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Тел: (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит открытый аукцион по продаже здания котельной (общ. пл. 181,5 кв.м), расположенного по адресу: г. Логойск, ул. Советская, 33а. Площадь зем. уч. 0,0921 га. Начальная цена — 54 187 348 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.10.2007 г. Аукцион состоится 29.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32353. Індэкс 63850. Зак. № 6135. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12